Г. У. Малчанава
П. М. Гламбоцкі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

# 10





# ДЗЯРЖАВЫ-ПЕРАМОЖЦЫ Ў ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЕ



Г. У. Малчанава
П. М. Гламбоцкі

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

**Вучэбны дапаможнік для 10 класа першага аддзялення дапаможнай школы з беларускай мовай навучання**

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук прафесара В. А. Фядосіка

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2016

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 94(476)(075.3)
ББК 63.3(4Беи)я72
М20

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра эканамічнай гісторыі Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» (доктар гістарычных навук загадчык кафедры *Ю. М. Бохан*);
настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Дапаможная школа-інтэрнат № 10 г. Мінска» *Ю. В. Шэндлін*

**Умоўныя абазначэнні:**

— заданні перад чытаннем тэксту

— пытанні для паўтарэння і замацавання

* — ускладненыя пытанні

— практычная работа і заданні

— работа з картай

— краязнаўчы пошук

— гістарычныя вандроўкі

— цікава ведаць

*Папярэдняе выданне выйшла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 2009 годзе.*

**ISBN 978-985-553-332-1**

© Малчанава Г. У., Гламбоцкі П. М., 2009
© Малчанава Г. У., Гламбоцкі П. М., 2016, са зьмяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2016

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПРАДМОВА

## Шаноўныя сябры!

Перыяд гісторыі Бацькаўшчыны, з якім вы будзеце знаёміцца ў 10 класе, ахоплівае гады пасля Вялікай Айчыннай вайны па сённяшні час. Вы даведаецеся, як народ здолеў падняць і адбудаваць сваю Беларусь пасля ваеннага ліхалецця. Разнастайныя факты пра гістарычныя падзеі дапамогуць вам зразумець, якім нялёгкім быў шлях нашай краіны. На ім былі значныя крокі наперад і памылкі, якія затрымлівалі развіццё Беларусі. У апошні перыяд адбыліся падзеі, пра якія беларускі народ марыў цягам усяго гістарычнага развіцця, — утварэнне незалежнай Беларускай дзяржавы. Раім вам пашыраць веды пра гісторыю Беларусі праз краязнаўчы пошук.

Спадзяёмся, што вучэбны дапаможнік дасць вам магчымасць яшчэ больш ганарыцца нашай Беларуссю, яе працавітым і таленавітым народам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Паўтарэнне вучэбнага матэрыялу за 9 клас

**1.** У выніку якой гістарычнай падзеі беларускія землі былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі? Выберыце правільны адказ:

а) падзелаў Рэчы Паспалітай;
б) паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.

**2.** Вы ведаеце, што насельніцтва Беларусі ў перыяд знаходжання ў складзе Расійскай дзяржавы дзялілася на прывілеяваныя і падатковыя саслоўі. Размяркуйце па саслоўях прадстаўнікоў дваранства, духавенства, ганаровых грамадзян, купецтва, прыгонных сялян, мяшчан, дзяржаўных сялян.

**3.** Паміж якімі дзяржавамі адбылася вайна 1812 года? Выберыце правільны адказ:

а) Польшча і Расія;
б) Францыя і Расія;
в) Аўстрыя і Францыя.

**4.** Што з'яўлялася прычынамі адмены прыгоннага права? Выберыце правільныя адказы:

а) паўстанне 1863 года;
б) паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі;
в) сялянскія паўстанні супраць памешчыцкага прыгнёту;
г) дрэннае становішча сельскай гаспадаркі.

**5.** Калі было скасавана прыгоннае права? Выберыце правільны адказ:

а) у 1857 годзе;
б) у 1861 годзе;
в) у 1870 годзе.

**6.** Якія станоўчыя і адмоўныя вынікі мела скасаванне прыгону? Адкажыце з дапамогай сказаў, у якія ўстаўце неабходныя словы.

*Адмена прыгоннага права (садзейнічала, перашкаджала) хуткаму развіццю прамысловасці. Колькасць гарадоў і насельніцтва ў іх (павялі-*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*чылася, зменшылася). Сельская гаспадарка пачала развівацца (хутчэй, павольней). Сяляне сталі свабоднымі ад памешчыка. Але яны (атрымалі, не атрымалі) права ўласнасці на зямлю. Сялянства было (задаволена, не задаволена) умовамі адмены прыгоннага права.*

Што належыць да станоўчых вынікаў, а што — да адмоўных?

**7.** Што такое Беларуская сацыялістычная грамада́? Выберыце правільны адказ:

а) назва газеты;

б) першая беларуская палітычная партыя;

в) грамадскае аб'яднанне.

**8.** Калі пачалася Першая сусветная вайна? Выберыце правільны адказ:

а) у 1910 годзе; б) у 1914 годзе; в) у 1941 годзе.

**9.** Суаднясіце словы і іх азначэнні.

| | |
|---|---|
| рэвалюцыя | органы народнай улады, якія выбіраліся насельніцтвам на пэўны час |
| Саветы | палітычная арганізацыя, якая выступала ў абарону інтарэсаў працоўных: рабочых і сялян |
| партыя бальшавікоў | змена дзяржаўнай улады з дапамогай узброенай сілы |

**10.** У выніку якой падзеі быў звергнуты цар? Выберыце правільны адказ:

а) Лютаўскай рэвалюцыі;

б) выбараў;

в) дэманстрацыі.

**11.** Калі ўлада перайшла ў рукі партыі бальшавікоў? Выберыце правільны адказ:

а) люты 1917 года; б) кастрычнік 1917 года.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**12.** У склад якой дзяржавы ўваходзіла Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР)? Выберыце правільны адказ:

а) Расіі;

б) Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

**13.** Калі пачалася Другая сусветная вайна? Выберыце правільны адказ:

а) у 1914 годзе; б) у 1939 годзе; в) у 1941 годзе.

**14.** Якая частка Беларусі ўвайшла ў склад БССР? Выберыце правільны адказ:

а) усходняя;

б) Заходняя Беларусь;

в) цэнтральная.

Якое значэнне мела ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР?

**15.** Суаднясіце падзеі з датамі.

| | |
|---|---|
| Пачатак Вялікай Айчыннай вайны | 3 ліпеня 1944 года |
| Вызваленне Беларусі | 22 чэрвеня 1941 года |
| Вызваленне сталіцы Беларусі | 9 мая 1945 года |
| Завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны | 28 ліпеня 1944 года |

Намалюйце ў сшытку «стужку часу». На ёй адзначце гэтыя падзеі ў той паслядоўнасці, як яны адбываліся.

**16.** Як вы разумееце сэнс выразаў: *нямецкі акупацыйны рэжым у Беларусі; партызанская зона; падпольны рух; бессмяротны подзвіг савецкага народа*?

**17.** У гонар якіх падзей Вялікай Айчыннай вайны ўзведзены наступныя помнікі?

а) Мемарыяльны комплекс «Курган Славы»;

б) мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой»;

в) Манумент Перамогі;



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

г) помнік савецкаму воіну-вызваліцелю ў Трэптаў-парку ў Берліне;
д) мемарыяльны комплекс «Хатынь».

## ВІКТАРЫНА
## «Вядомыя людзі Беларусі і іх дзейнасць»

**1.** Назавіце імя і прозвішча рэвалюцыянера — арганізатара паўстання 1863 года. Ён выступаў за тое, каб усю зямлю аддаць сялянам без выкупу. «Зямлю і волю, — сцвярджаў ён, — можна здабыць толькі са зброяй у руках». Выберыце правільны адказ:

а) Кастусь Каліноўскі;
б) Тадэвуш Касцюшка;
в) Францыск Скарына.

**2.** Якім псеўданімам падпісваўся Кастусь Каліноўскі? Выберыце правільны адказ:

а) Мацей Бурачок;
б) Янка Лучына;
в) Яська — гаспадар з-пад Вільні.

**3.** Першай рэвалюцыйнай газетай у Беларусі, якая выдавалася па-беларуску, была:

а) «Мінскі лісток»;
б) «Газета Гродзенская»;
в) «Мужыцкая праўда».

**4.** Каму са знакамітых людзей выбіты надпіс на валуне: «Памяці Мацея Бурачка»? Выберыце правільны адказ:

а) Якубу Коласу;
б) Францішку Багушэвічу;
в) Валерыю Урублеўскаму.

**5.** Чаму Францішка Багушэвіча называюць песняром сялянскай долі?

**6.** Чым знакаміты браты Тышкевічы? Выберыце правільны адказ. *Яны вядомыя ...*

а) пісьменнікі;
б) даследчыкі роднага краю;
в) мастакі.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**7.** Суаднясіце імёны дзеячаў культуры і сферы іх творчасці.

| | |
|---|---|
| Валенцій Ванькові́ч | мастак |
| Іван Хруцкі | |
| Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч | пісьменнік |
| Напалеон Орда | |
| Ігнат Буйніцкі | кампазітар |
| Змітрок Бядуля | |
| Марк Шагал | паэт |
| Цётка (Алаіза Пашкевіч) | |
| Адам Міцкевіч | акцёр |
| Станіслаў Манюшка | |

**8.** Каго са славутых пісьменнікаў называюць песнярамі зямлі беларускай? Выберыце правільны адказ:

а) Янку Купалу і Якуба Коласа;

б) Адама Міцкевіча;

в) Максіма Багдановіча.

**9.** Каму належыць гэта карціна? Што вы ведаеце пра яе аўтара?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# БЕЛАРУСЬ У ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ (1945—1953)

## 1. Страты Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне

1. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна?
2. Што вы ведаеце пра страты, панесеныя Беларуссю ў гады вайны?
3. Калі завяршылася Вялікая Айчынная вайна?
4. Якія вы чыталі кнігі, глядзелі кінафільмы, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне?

Фашысцкая Германія прынесла беларускаму народу незлічоныя бедствы. Уся Беларусь пасля вайны была ў руінах і папялішчах. Цалкам або часткова разбуранымі аказаліся большасць гарадоў. Гітлераўцы прычынілі велізарныя страты больш чым 200 гарадам і раённым цэнтрам. Амаль знішчана ў тым ліку была і сталіца Беларусі — горад Мінск. Трэцяя частка насельніцтва Беларусі аказалася без прытулку. Людзі засталіся без самага галоўнага: прадуктаў харчавання, вопраткі і жылля.

У выніку вайны прамысловасць Беларусі была ледзь не ўся разбурана. Акупанты вывезлі або знішчылі абсталяванне каля 10 тысяч прамысловых прадпрыемстваў. Са строю былі выведзены амаль усе элек-



Панарама разбуранага Мінска. Ліпень 1944 года



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Жыхары вяртаюцца ў родныя мясціны



Спаленая вёска

трастанцыі. Матэрыяльныя страты склалі звыш паловы **нацыянальнага багацця**[1] Беларусі. У параўнанні з даваенным перыядам у 1945 годзе ўзровень прамысловай вытворчасці ў рэспубліцы быў у 5 разоў ніжэйшы.

У цяжкім становішчы знаходзіўся транспарт. Асабліва моцна пацярпела беларуская чыгунка. Не хапала цягнікоў, пасажырскіх вагонаў. Шашэйныя дарогі патрабавалі рамонту. Была вялікая неабходнасць у аўтамабілях.

Не менш пацярпела і сельская гаспадарка краіны. За гады нямецка-фашысцкай акупацыі было разбурана і спалена каля 9200 беларускіх вёсак. У многіх месцах палі зараслі хмызняком і пустазеллем. На ўгоддзях заставалася вялікая колькасць мін, снарадаў, абгарэлай ваеннай тэхнікі. У сялянскай гаспадарцы не хапала свойскай жывёлы, так неабходнай для выканання сельскагаспадарчай працы і атрымання харчавання. Коней засталося вельмі мала. Таму зямлю аралі, выкарыстоўваючы ўцалелых у час вайны кароў, або перакопвалі рыдлёўкамі. Людзям не хапала самых неабходных прадуктаў харчавання. Таму насельніцтва вёсак недаядала. Існавалі цяжкасці з таварамі народнага спажывання. Не было ў што абуцца і апрануцца. Многія людзі яшчэ некалькі гадоў

[1] **Нацыяна́льнае бага́цце** — матэрыяльныя даброты, якімі валодае краіна. Звычайна вымяраецца колькасцю грошай у дзяржаве.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пасля вайны насілі даматканае адзенне альбо армейскае абмундзіраванне. Шмат сямей засталіся без сваіх дамоў і жылі ў зямлянках.

Аднак самымі цяжкімі былі людскія страты. На фронце, у партызанах, падчас карных аперацый фашыстаў, ад хвароб загінула каля 3 мільёнаў чалавек. Каля 385 тысяч жыхароў рэспублікі было вывезена на работу ў Германію. Многія з іх памерлі ад цяжкай працы і жахлівых умоў жыцця. У выніку за перыяд вайны Беларусь страціла кожнага трэцяга жыхара.

**1.** Якія страты панесла гаспадарка БССР у гады Вялікай Айчыннай вайны?
**2.** Колькі беларускіх гарадоў і вёсак пацярпела падчас фашысцкай акупацыі?
**3.** У якім стане знаходзіўся транспарт Беларусі пасля вайны?
**4.** Раскажыце пра стан сельскай гаспадаркі ў гэты час.
**5.** З якімі цяжкасцямі сутыкнулася насельніцтва Беларусі пасля вайны?
**6*.** Якія прычыны выклікалі вялікія страты насельніцтва на тэрыторыі Беларусі ў час вайны?

**1.** Падлічыце, колькі гадоў працягвалася Вялікая Айчынная вайна.
**2.** Выкарыстоўваючы фотаздымкі на с. 9—10, раскажыце пра наступствы вайны ў БССР.
**3.** Як вы разумееце словазлучэнне «нацыянальнае багацце»? Паразважайце, што ўваходзіць у змест гэтага паняцця.
**4.** З дапамогай табліцы 1 на с. 12 раскажыце пра страты БССР у вайне.

Раскажыце пра лёс вашага горада, раёна, вёскі ў гады вайны. Як пацярпелі ад вайны мірныя жыхары вашага краю? Даведайцеся ў сваіх родных, які след пакінула вайна ў лёсах вашых сваякоў. Як у вашай сям'і захоўваецца памяць пра тых, хто загінуў ці пацярпеў?

Наведайце музеі, дзе ёсць экспазіцыя, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне. Складзіце невялікае паведамленне аб сваёй экскурсіі.

**1.** Пасля вызвалення горад Мінск уяўляў сабой жудасную карціну. Поўнага знішчэння пазбегла невялікая колькасць будынкаў, у тым


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ліку Дом урада, Дом афіцэраў, Тэатр оперы і балета. З прычыны вялікіх разбурэнняў пасля вайны меркавалася перанесці сталіцу рэспублікі ў Магілёў або пабудаваць горад Мінск на іншым месцы.

Аднак мінчане змаглі за кароткі час не толькі адбудаваць горад, але і зрабіць яго адным з найпрыгажэйшых гарадоў Еўропы. Мірнае жыццё паступова наладжвалася.

**2.** Нават сёння зрэдку мы сустракаемся з наступствамі вайны. Здараюцца сітуацыі, калі знаходзяць зброю ці боепрыпасы тых часоў. У такім выпадку паведамляюць аб небяспечнай знаходцы ў органы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Тады спецыяльныя войскі займаюцца знішчэннем узбраення на адмысловай тэрыторыі, дзе не могуць пацярпець людзі.

*Табліца 1*

**Страты Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне**

| Вялікія людскія страты | Вялікія матэрыяльныя страты | | |
|---|---|---|---|
| а) загінуў кожны трэці жыхар БССР;<br>б) вывезены на катаржныя работы каля 385 тысяч жыхароў | а) знішчаны і разбураны 209 з 270 гарадоў і раённых цэнтраў;<br>б) знішчаны і разбураны 9200 вёсак | а) знішчаны ці вывезены ў Германію 10 338 заводаў і фабрык, 90 % абсталявання і машын;<br>б) разбурана 8825 школ, 2187 бальніц і амбулаторый і іншае | а) вялікая колькасць разбітай ваеннай тэхнікі, снарадаў і мін на палях;<br>б) амаль не засталося жывёлы, насення;<br>в) знішчана жыллё і іншае |

## 2. Дзяржавы — пераможцы ў Другой сусветнай вайне

1. Калі пачалася Другая сусветная вайна?
2. Колькі часу яна працягвалася?
3. Параўнайце, якая з войнаў працягвалася даўжэй: Другая сусветная вайна або Вялікая Айчынная.

Другая сусветная вайна, як вы ведаеце, ахапіла вялікую колькасць краін. У ёй узялі ўдзел дзяржавы, якія знаходзіліся на розных кантынентах. Усе яны ў пэўнай ступені дапамагалі разграміць агульнага во-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рага — фашысцкую Германію і тых, хто ёй дапамагаў. Найбольшы ўклад у агульную перамогу ўнёс СССР, а напрыканцы вайны — ЗША і Вялікабрытанія. Кіраўнікоў гэтых краін называлі «Вялікай тройкай», а дзяржавы — саюзніцамі, бо дзейнічалі яны разам. Менавіта яны вырашалі лёс свету ў завяршальны перыяд вайны.

Паміж гэтымі краінамі не было адзінства ў меркаваннях аб пасляваенным развіцці дзяржаў, якія закранула вайна. Савецкае кіраўніцтва марыла пра пашырэнне **сацыялізму**[1] па ўсёй Еўропе. Кіраўнікі ЗША і Вялікабрытаніі лічылі, што перш за ўсё ў вызваленых дзяржавах трэба ўмацаваць **дэмакратыю**[2]. У выніку былыя саюзнікі, якія разграмілі фашысцкую Германію і яе прыхільнікаў, усё больш аддаляліся адзін ад аднаго. Адносіны паміж дзяржавамі пагаршаліся і паступова станавіліся варожымі. ЗША і Вялікабрытанія пачалі распрацоўваць планы магчымай вайны з СССР.

Усё гэта адбівалася і на лёсе Беларусі. Разбураная гаспадарка рэспублікі патрабавала грошай і абсталявання, якія маглі б пастаўляць былыя саюзнікі. Але гэтага не адбылося. Замест дапамогі Савецкі Саюз вымушаны быў вярнуць частку аўтамабіляў і іншай тэхнікі. Яны ў гады вайны пастаўляліся замежнымі дзяржавамі для ўмацавання Чырвонай Арміі.

Пагаршэнне ўзаемаадносін паміж былымі саюзнікамі прывяло да неабходнасці працягваць узбраенне дзяржавы, павялічваць яе ваенную моц. Гэта, у сваю чаргу, патрабавала значных грашовых сродкаў, якія магчыма было б накіраваць на аднаўленне разбуранай гаспадаркі.

Савецкі Саюз як краіна-пераможца таксама імкнуўся да пашырэння свайго ўплыву сярод вызваленых ім краін. Для гэтага ўрад выдаткоўваў вялікія сродкі. Каб умацаваць адносіны з нашай суседкай — Польшчай, СССР у 1945 годзе перадаў ёй частку тэрыторыі БССР, якая знаходзілася ў складзе рэспублікі з 1939 года. Прычынай такога кроку была значная колькасць польскага насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Але ніякага абмеркавання гэтага рашэння з насельніцтвам БССР не праводзілася.

[1] **Сацыялі́зм** — грамадскі лад, пры якім у найбольшай ступені абараняюцца правы працоўных людзей.
[2] **Дэмакра́тыя** — палітычны рэжым, пры якім народ шляхам выбараў фарміруе вышэйшыя органы ўлады.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Тэрыторыя БССР у 1945 годзе

1. Якія дзяржавы ўнеслі галоўны ўклад у агульную перамогу над фашысцкай Германіяй?
2. Каго называлі «Вялікая тройка»?
3. Якія дзяржавы з'яўляліся саюзніцамі?
4. Што стала прычынай пагаршэння ўзаемаадносін паміж былымі саюзнікамі? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
5. Якім бачыла савецкае кіраўніцтва пасляваеннае развіццё вызваленых дзяржаў? Адкажыце, выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка.
6. Што хацелі ўмацаваць саюзнікі ў краінах пасляваеннай Еўропы? Адкажыце словамі тэксту параграфа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

7. Як пагаршэнне міжнародных адносін адбілася на лёсе Беларусі? Адкажыце, выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка.
8. Чаму савецкае кіраўніцтва працягвала павялічваць ваенную моц дзяржавы? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
9. З якой прычыны кіраўніцтва СССР передало Польшчы частку тэрыторыі БССР? Адкажыце з дапамогай тэксту параграфа.
10. Ці прымала ўдзел насельніцтва БССР у абмеркаванні пытання аб передачы часткі тэрыторыі Польшчы? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.

Падбярыце да паняццяў словы з процілеглым значэннем: *пераможцы, саюзнікі*.

**1.** Разгледзьце картасхему «Дзяржавы — пераможцы ў Другой сусветнай вайне» (гл. форзац). Пакажыце краіны, якія ўнеслі асноўны ўклад у перамогу над фашысцкай Германіяй.
**2.** Пакажыце на картасхеме на с. 14 заходнюю дзяржаўную граніцу БССР. Назавіце краіны, якія з'яўляюцца суседзямі сучаснай Беларусі.
**3.** Пакажыце на гэтай жа картасхеме частку БССР, якая адышла да Польшчы ў 1945 годзе.

У першы пасляваенны год была канчаткова ўсталявана дзяржаўная мяжа БССР. Паводле ўмоў дагавора паміж СССР і Польшчай аб савецка-польскай дзяржаўнай граніцы Польшчы перадаваліся частка раёнаў Брэсцкай і Беластоцкай абласцей. Такім чынам усталявалася дзяржаўная граніца, якая існуе па сённяшні час.

На канферэнцыі ў Парыжы (Францыя) у 1946 годзе дэлегацыя БССР удзельнічала ў абмеркаванні пытанняў аб пасляваенных памерах тэрыторый краін. Дэлегацыя БССР дабівалася справядлівага тэрытарыяльнага ўладкавання Еўропы з шанаваннем інтарэсаў усіх дзяржаў і народаў.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 3. Стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). БССР — член ААН

1. Якія дзяржавы сумесна з Савецкім Саюзам змагаліся супраць фашысцкіх захопнікаў?
2. У які перыяд вайны дзяржавы-саюзніцы ўнеслі значны ўклад у разгром фашысцкай Германіі (у пачатку, сярэдзіне, у завяршальны перыяд)?
3. Назавіце дзяржавы, якія перамаглі ў Другой сусветнай вайне.

Незадоўга да заканчэння вайны, у красавіку 1945 года, была склікана **міжнародная канферэнцыя**[1]. Яна адбылася ў горадзе Сан-Францыска, які знаходзіцца ў Злучаных Штатах Амерыкі. Прадстаўнікі розных краін вырашалі пытанне аб тым, як пазбегнуць новай сусветнай вайны, падтрымліваць мір, развіваць дружалюбныя адносіны паміж народамі. З гэтай мэтай на канферэнцыі была заснавана **Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)**[2]. Галоўнай задачай ААН стала развіццё супрацоўніцтва паміж рознымі краінамі. Гэта павінна было дапамагчы вырашаць міжнародныя эканамічныя, сацыяльныя і культурныя праблемы.



Член дэлегацыі БССР падпісвае Статут ААН. 26 чэрвеня 1945 года

Наша рэспубліка з'яўляецца адной з заснавальніц ААН. Гэтае права БССР атрымала за вялікі ўклад у разгром фашызму. Улічаны былі і панесеныя ў ходзе вайны велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. Дамоўленасць аб членстве БССР у ААН была дасягнута загадзя паміж кіраўнікамі трох саюзных дзяржаў: СССР, ЗША і Вялікабрытаніі. ***26 чэрвеня 1945 года*** Беларусь і іншыя краіны падпісалі Статут ААН. Так БССР упершыню ў сваёй гісторыі стала членам самай прэстыжнай міжнароднай арганізацыі.

[1] **Міжнаро́дная канферэ́нцыя** — сход афіцыйных прадстаўнікоў некалькіх дзяржаў. На ёй абмяркоўваюцца важныя пытанні жыцця краін, што ўдзельнічаюць у сходзе.
[2] **Арганіза́цыя Аб'ядна́ных На́цый (АА́Н)** — міжнародная арганізацыя, створаная для ўмацавання міру.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разам з БССР такое ж права атрымала яшчэ адна рэспубліка СССР — Украіна. Каб БССР магла ўдзельнічаць у вырашэнні розных міжнародных пытанняў, у рэспубліцы дзейнічаў Народны камісарыят замежных спраў. Па сённяшні дзень Беларусь з'яўляецца раўнапраўным членам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Удзельнікі ААН штогод збіраюцца для вырашэння найбольш важных пытанняў. Такія сходы носяць назву — **сесіі Генеральнай Асамблеі ААН**[1]. Каля будынка, дзе яны адбываюцца, узнімаюцца сцягі ўсіх краін — удзельніц ААН. У перыяды паміж сесіямі галоўную ролю адыгрывае **Савет Бяспекі ААН**[2]. Яго галоўнымі задачамі з'яўляюцца вырашэнне праблем узаемаадносін паміж дзяржавамі мірным шляхам, зніжэнне ваеннай напружанасці, прадухіленне пагрозы вайны.

Членства БССР у ААН не прывяло да прынцыповых змен у становішчы рэспублікі ўнутры краіны і на міжнароднай арэне. Прадстаўнікі БССР падчас працы ААН фактычна з'яўляліся часткай дэлегацыі СССР. Яны сумесна з дэлегацыяй Савецкага Саюза галасавалі па ўсіх пытаннях, што абмяркоўваліся ў ААН.

Тым не менш уваход Беларусі ў склад ААН адыграў вялікую станоўчую ролю. Ён пашыраў міжнародныя сувязі з іншымі дзяржавамі. Гэта садзейнічала ўсталяванню і развіццю адносін з замежнымі краінамі. Беларускія **дыпламаты**[3] набывалі вопыт міжнароднай дзейнасці, прымаючы ўдзел у вырашэнні міжнародных праблем.

Дзякуючы ўваходжанню ў склад ААН Беларусь атрымала матэрыяльную дапамогу. У краіну ў самы цяжкі пасляваенны час пастаўляліся неабходныя тавары, машыны, абсталяванне.

Дэлегацыя БССР выступала з ініцыятывамі па шэрагу важных праблем. Так, па прапанове БССР Генеральная Асамблея ААН у 1946 годзе прыняла рашэнне аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў.

[1] **Се́сія Генера́льнай Асамбле́і АА́Н** — сход прадстаўнікоў краін — удзельніц ААН, на якім вырашаюцца найбольш важныя пытанні.

[2] **Саве́т Бяспе́кі АА́Н** — орган ААН, які дзейнічае паміж сесіямі Генеральнай Асамблеі. На яго ўскладзена галоўная адказнасць за падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі.

[3] **Дыплама́т** — прадстаўнік дзяржавы, які прымае ўдзел у вырашэнні міжнародных спраў ад імя сваёй краіны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Зала Генеральнай Асамблеі ААН

БССР стала адным з ініцыятараў міжнароднага руху за раззбраенне і ўмацаванне міру.

ААН — самая аўтарытэтная міжнародная арганізацыя. Яна і сёння абараняе мір у свеце.



1. Што такое Арганізацыя Аб'яднаных Нацый?
2. Калі ААН была створана?
3. Як адбылося заснаванне ААН? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
4. З якой мэтай была створана ААН?
5. Раскажыце, чаму БССР была прынята ў склад ААН.
6*. Чаму дэлегацыя БССР на сесіях Генеральнай Асамблеі ААН фактычна была часткай дэлегацыі СССР?
7. Які станоўчы вынік меў уваход дэлегацыі БССР у склад ААН? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
8. З якімі прапановамі выступіла Беларусь у ААН? Адкажыце, карыстаючыся тэкстам вучэбнага дапаможніка.
9*. Што вы ведаеце аб ініцыятывах Беларусі ў ААН на сучасным этапе?



**1.** Растлумачце скарачэнне *ААН*.

**2.** Раскажыце, як вы разумееце словы «Арганізацыя Аб'яднаных Нацый».

**3.** Выберыце правільны варыянт адказу. Пры прыняцці БССР у лік краін — заснавальніц ААН галоўным было:

а) тое, што БССР з'яўляецца рэспублікай у складзе СССР;



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

б) вялікі ўклад БССР у разгром фашызму, панесеныя людскія і матэрыяльныя страты;

в) незалежнасць БССР як дзяржавы.

**4.** Растлумачце, чаму менавіта дэлегацыя БССР выступіла з прапановай прыняць рашэнне аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў. Для адказу выкарыстайце ўжо вядомыя вам прыклады людскіх і матэрыяльных страт у час Вялікай Айчыннай вайны.

**5.** Разгледзьце фотаздымкі на с. 16, 18. Раскажыце, якім чынам ААН уплывае на дзейнасць дзяржаў і жыццё народаў.

**6.** Спытайце ў дарослых, ці вядомы ім прыклады ўдзелу ААН у рашэнні міжнародных пытанняў у сучасны перыяд.

**7.** Паразважайце, чаму працоўныя БССР актыўна падтрымалі масавы рух за мір.

**1.** Знакаміты беларус, дзяржаўны дзеяч, дыпламат Андрэй Андрэевіч Грамыка нарадзіўся ў 1909 годзе ў вёсцы Старыя Грамыкі на Гомельшчыне. Яго далёкія продкі належалі да збяднелага шляхецкага роду. А ўжо яго бацькі ўваходзілі ў сялянскае саслоўе.

З дзяцінства хлопчык прывык дапамагаць бацькам. Андрэй добра вучыўся. Скончыў прафесійна-тэхнічную школу ў Гомелі, затым сельскагаспадарчы тэхнікум у Мінскай вобласці. Падчас вучобы ў Эканамічным інстытуце ў Мінску быў прызначаны дырэктарам сельскай школы недалёка ад Мінска. Паспяховае заканчэнне вышэйшай навучальнай установы прывяло маладога Грамыку ў Расійскую акадэмію сельскагаспадарчых навук.

Самай адметнай старонкай яго біяграфіі стала дыпламатычная праца. Яна пачалася ў 1939 годзе. З гэтага часу Грамыка як прадстаўнік савецкай дзяржавы браў удзел у вырашэнні розных міжнародных спраў. Ён непасрэдна вёў перагаворы аб стварэнні ААН. Яго подпіс стаіць пад Статутам гэтай арганізацыі. У далейшым ён стаў міністрам замежных спраў СССР. З яго ўдзелам абмяркоўваліся і вырашаліся пытанні забароны ядзерных выпрабаванняў, нераспаўсюджання атамнай зброі, прадухілення ядзернай вайны. Ён сцвярджаў, што лепей дзесяць гадоў перагавораў, чым адзін дзень вайны.

У Гомелі ў знак пашаны нашаму знакамітаму земляку Андрэю Андрэевічу Грамыку ўстаноўлены помнік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** У сувязі з уваходжаннем рэспублікі ў склад ААН быў распрацаваны новы Дзяржаўны сцяг БССР. Яго зацвердзілі ў 1951 годзе. Сцяг уяўляў сабой палотнішча, якое складалася з дзвюх гарызантальных палос: чырвонай верхняй і зялёнай ніжняй. На чырвонай паласе ўверсе злева знаходзіліся залатыя выявы сярпа, молата, а над імі — пяціканцовая зорка. Каля дрэўка сцяга вертыкальна размяшчаўся беларускі нацыянальны арнамент белага колеру на чырвоным фоне. Малюнак арнаменту быў узяты з ручніка, які вышыла ў 1917 годзе Матрона Маркевіч, сялянка з Віцебскай вобласці.

У такім выглядзе сцяг існаваў да 1991 года.



Дзяржаўны сцяг БССР

1. Разам з настаўнікам паразважайце, пра што сведчылі наступныя элементы новага Дзяржаўнага сцяга БССР:
   а) серп і молат; в) чырвоны колер;
   б) арнамент; г) зялёны колер.
2. Разгледзьце выявы дзяржаўных сцягоў БССР (уверсе) і Рэспублікі Беларусь (с. 139). Параўнайце іх. Чым яны падобныя, а чым адрозніваюцца?

## 4. Дзейнасць БССР на міжнароднай арэне ў пасляваенныя гады

1. Якая міжнародная арганізацыя садзейнічае падтрыманню міру і бяспекі ў свеце?
2. Па якіх прычынах БССР стала членам ААН?

У пасляваенны перыяд у жыцці Беларусі адбыліся важныя змены. Адной з галоўных стаўся выхад яе на шырокую міжнародную арэну. Гэта адбылося ў першую чаргу праз членства ў Арганізацыі Аб’яднаных Нацый.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Народная дэманстрацыя ў падтрымку міру

БССР у пасляваенныя гады падтрымлівала шырокія культурныя сувязі перш за ўсё з краінамі Усходняй Еўропы. Адносіны ў гэтай галіне развівалі дзяржаўныя ведамствы, партыйныя і грамадскія арганізацыі, творчыя саюзы, калектывы, навучальныя і навуковыя ўстановы, бібліятэкі. БССР удзельнічала ў працы розных міжнародных арганізацый. Сярод іх — **ЮНЕСКА**[1] **(Арганізацыя Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры)**, **МАГАТЭ**[2] **(Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі)**.

Многія беларусы, якія жылі за мяжой, цікавіліся тым, што адбываецца ў БССР. Таму было ўтворана Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой.

Членства ў ААН дазволіла Беларусі ўдзельнічаць з 1947 года ў Міжнародным саюзе электрасувязі і Сусветным паштовым саюзе. Пазней БССР стала членам Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (з 1948 года), Міжнароднай арганізацыі працы (з 1954 года). Гэта пашырыла магчымасці развіцця краіны. Усяго з 1944 па 1955 год рэспубліка падпісала больш за 30 міжнародных дагавораў і пагадненняў з рознымі краінамі.

Аднак узаемаадносіны з іншымі дзяржавамі былі абмежаваныя. Асабліва гэта тычылася сферы палітыкі і эканомікі.

[1] **ЮНЕ́СКА (Арганіза́цыя Аб'ядна́ных На́цый па пыта́ннях адука́цыі, наву́кі і культу́ры)** — установа Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая садзейнічае развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў галінах адукацыі, навукі і культуры.

[2] **МАГАТЭ́ (Міжнаро́днае аге́нцтва па а́тамнай эне́ргіі)** — міжнародная арганізацыя, якая садзейнічае развіццю супрацоўніцтва ў галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прамыя эканамічныя сувязі рэспублікі з іншымі краінамі ў першыя пасляваенныя гады практычна адсутнічалі. Рэспубліка выступала толькі ў якасці пастаўшчыка тавараў. Асноўныя рашэнні прымаліся кіраўніцтвам СССР.

Нягледзячы на тое што свет яшчэ памятаў наступствы Другой сусветнай вайны, міжнародныя адносіны былі складанымі. СССР і Злучаныя Штаты Амерыкі змагаліся за першынство ў свеце. Хаця баявыя дзеянні паміж імі не вяліся, дзяржавы распрацоўвалі новыя віды ўзбраення, пастаўлялі іх сваім саюзнікам. У розных частках свету праз гэта ўзнікалі канфлікты. Супрацьстаянне дзяржаў без непасрэдных ваенных дзеянняў пачалі называць **«халоднай вайной»**[1]. Яна спараджала недавер і падазронасць паміж народамі і не спрыяла мірнаму развіццю адносін паміж дзяржавамі.

Узнікненне і абвастрэнне «халоднай вайны» ўжо ў першыя пасляваенныя гады наклалі адбітак і на дзейнасць ААН. На яе пасяджэннях усё часцей і часцей чуліся ўзаемныя абвінавачанні ў росце міжнароднай напружанасці. Перш за ўсё гэта тычылася ЗША і СССР. Процістаянне пачало ўзмацняцца. У абвастрэнні міжнародных адносін многія ўбачылі пагрозу новай сусветнай вайны. Ва ўсім свеце разгортваўся масавы рух за мір. Гэты працэс актыўна падтрымліваў і народ Беларусі.

У 1963 годзе дэлегацыя БССР у ліку першых падпісала ў Маскве міжнародны дагавор. Ён забараняў выпрабаванні ядзернай зброі ў атмасферы, космасе і пад вадой. Неўзабаве была падпісана Дэкларацыя ААН аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы краін, аб ахове іх незалежнасці і суверэнітэту. Разам з іншымі дзяржавамі Беларусь прымала ўдзел у распрацоўцы Дэкларацыі аб умацаванні міжнароднай бяспекі. Гэты дакумент абвяшчаў недапушчальнасць ваеннай акупацыі тэрыторыі чужой краіны.

1. Што спрыяла выхаду БССР на міжнародную арэну? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
2. Якія сувязі Беларусь падтрымлівала ў пасляваенныя гады з краінамі Усходняй Еўропы? Адкажыце, выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка.

[1] **«Хало́дная вайна́»** — супрацьстаянне без непасрэдных ваенных дзеянняў паміж ЗША і СССР і іх саюзнікамі ў 1946—1980-я гады.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Чаму ўзаемадзеянні БССР з іншымі дзяржавамі былі абмежаванымі? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
**4.** Як вы разумееце словазлучэнне «халодная вайна»? Праверце свой адказ па слоўніку тэрмінаў і паняццяў у канцы вучэбнага дапаможніка.
**5.** Чаму ў свеце пачаўся рух за мір? Знайдзіце адказ у тэксце параграфа.
**6.** Якія важныя дакументы аб захаванні міру ва ўсім свеце былі падпісаны БССР? Адкажыце з дапамогай тэксту.
**7*.** Якія найбольш важныя міжнародныя арганізацыі існуюць сёння?



**1.** Разгледзьце фотаздымак на с. 21 і паразважайце, чаму людзі нашай краіны імкнуліся падтрымаць мір ва ўсім свеце.

**2.** Што абазначаюць наступныя скарачэнні: *ААН, ЮНЕСКА, МАГАТЭ*? Знайдзіце іх тлумачэнне ў слоўніку тэрмінаў і паняццяў.

**3*.** Прывядзіце ўжо вядомыя вам прыклады дзейнасці ЮНЕСКА ў сучасны перыяд на тэрыторыі Беларусі.

**4.** Паразважайце аб неабходнасці ўваходжання краіны ў міжнародныя арганізацыі:
а) у Міжнародны саюз электрасувязі;
б) у Сусветны паштовы саюз;
в) у Сусветную метэаралагічную арганізацыю.

Ці патрэбны ў сучасным жыцці такія арганізацыі?

**5.** Як вы разумееце асноўны сэнс наступных дакументаў?
а) Дагавор аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі ў атмасферы, космасе і пад вадой;
б) Дэкларацыя ААН аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы краін, аб ахове іх незалежнасці і суверэнітэту;
в) Дэкларацыя аб умацаванні міжнароднай бяспекі.



**1.** ЮНЕСКА займаецца аховай сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. У спісе Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь значацца 4 аб’екты. Усе яны — унікальная каштоўнасць беларускага народа, неад’емная частка сусветнай культурнай спадчыны. Сярод іх — Нацыянальны парк «Белавежская пушча», замкава-паркавыя комплексы ў Міры (Гродзенская вобласць) і Нясвіжы (Мінская вобласць). Белавежская пушча прызнана аб’ектам выключнай прыгажосці і найвялікшага прыроднага значэння.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Белавежская пушча — аб’ект, уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА

Яшчэ 11 аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі могуць быць уключаны ў спіс. Гэта знаёмыя вам вежа ў Камянцы (Брэсцкая вобласць), царква-крэпасць у Сынковічах (Гродзенская вобласць) і іншыя.

**2.** МАГАТЭ і сёння адыгрывае вялікую ролю ў жыцці дзяржаў. Штаб-кватэра арганізацыі знаходзіцца ў сталіцы Аўстрыі — горадзе Вене. Беларусь мае цесныя кантакты з гэтай міжнароднай арганізацыяй. У першую чаргу наша краіна супрацоўнічае з МАГАТЭ, вырашаючы пытанні пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы і аднаўлення забруджаных раёнаў.

Асабліва важнае значэнне мае ўзаемадзеянне з МАГАТЭ ў перыяд будаўніцтва першай на тэрыторыі Беларусі атамнай электрастанцыі (АЭС). Яна ўзводзіцца каля горада Астравец Гродзенскай вобласці.



Будаўніцтва АЭС каля горада Астравец Гродзенскай вобласці



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** У пасляваенныя гады паміж гарадамі розных краін узніклі сяброўскія сувязі. Гэта з'ява пачала насіць назву параднёных гарадоў (гарадоў-пабрацімаў). Паміж гарадамі наладжваліся кантакты і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва ў розных кірунках дзейнасці. Гарады-пабрацімы абменьваліся дэлегацыямі, выставамі, літаратурай. Сталіца нашай краіны стала пабрацімам гарадоў Ліёна (Францыя), Дэтройта (ЗША), Нотынгема (Вялікабрытанія), Бангалора (Індыя) і іншых. Гарады-пабрацімы з'явіліся не толькі ў горада Мінска. У беларускіх гарадах плошчам, вуліцам, скверам сталі даваць незвычайныя назвы ў гонар гарадоў-пабрацімаў.

Сувязі паміж параднёнымі гарадамі існуюць і пашыраюцца і сёння.

Пацікаўцеся, ці існуе ў горада, дзе вы жывяце, горад-пабрацім. Калі так, у чым выяўляюцца сувязі вашага населенага пункта з параднёным горадам?

## 5. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у пасляваенны час (1945—1953)

**1.** Якая палітычная партыя існавала ў СССР?
**2.** Што такое рэпрэсіі?
**3.** Што такое Саветы? Якую ролю ў жыцці дзяржавы яны адыгрывалі? Праверце значэнне паняццяў па слоўніку: *рэпрэсіі, дэпутат, Саветы народных дэпутатаў*.

Як і раней, Камуністычная партыя Беларусі (КПБ) адыгрывала вядучую ролю ў жыцці беларускага грамадства. За гады вайны партыйная арганізацыя рэспублікі панесла вялікія страты. Гэта тычылася як радавых членаў партыі, так і яе кіраўнікоў. Партыйныя органы ў час акупацыі вымушаны былі дзейнічаць або ў падполлі, або за межамі тэрыторыі Беларусі. Пасля вызвалення рэспублікі ад гітлераўскіх захопнікаў дзейнасць партыйнай арганізацыі пачала хутка аднаўляцца.

Камуністычная партыя была не толькі палітычнай арганізацыяй. Яна ўплывала на ўсе сферы жыцця дзяржавы. Партыя фактычна кантралявала дзейнасць улады. Партыйныя камітэты на ўсіх узроўнях



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Перадвыбарчы плакат

актыўна займаліся падборам і расстаноўкай кадраў. У 1946 годзе прайшлі выбары ў Вярхоўны Савет СССР, у 1947 годзе — у Вярхоўны Савет БССР. Аднак сапраўдны ўплыў дэпутатаў на дзяржаўнае жыццё быў нязначны. У Саветы выбіраліся прадстаўнікі партыі і беспартыйныя, якія ва ўсім падтрымлівалі партыю. Зазвычай, калі чалавек не з'яўляўся членам Камуністычнай партыі, ён не мог стаць кіраўніком. Ва ўрадзе таксама ўсе міністры былі членамі партыі.

Нягледзячы на перамогу народа ў вайне, захоўваўся поўны кантроль за ўсімі сферамі жыцця грамадства з боку партыйных органаў. Кіраўнік Камуністычнай партыі і краіны Іосіф Сталін быў абвешчаны вялікім правадыром усіх народаў. Ён меў неабмежаваную ўладу. Гэта спрыяла далейшаму ўмацаванню **культу асобы**[1] Сталіна.

Насельніцтва, якое пражывала на часова акупаванай тэрыторыі, выклікала ў партыйных кіраўнікоў падазронасць і здавалася ненадзейным. Таму гэтыя людзі мусілі быць вельмі асцярожнымі ў сваіх словах і ўчынках, каб не трапіць пад рэпрэсіі.

Савецкія людзі амаль што былі пазбаўлены магчымасці пазнаёміцца з жыццём людзей за мяжой. Такім чынам, грамадства краіны існавала як за «жалезнай заслонай».

Пад партыйным кантролем знаходзілася дзейнасць кожнай грамадскай арганізацыі. Ва ўсіх галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі, як і раней, існавалі прафесійныя саюзы. У іх аб'ядноўваліся людзі розных спецыяльнасцей. Дзейнічалі грамадскія і дзіцячыя аб'яднанні. Дзеці школьнага ўзросту былі акцябратамі і піянерамі. Моладзь уваходзіла ў грамадска-палітычнае аб'яднанне Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі (камсамол). Галасаванні і выбары,

[1] **Культ aсóбы** — узвялічванне ролі аднаго чалавека ў гістарычным развіцці краіны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

сходы, шэсці, дэманстрацыі праходзілі пад непасрэдным кантролем Камуністычнай партыі.

Разам з тым народ, які перамог у такой жудаснай вайне, у большасці не адчуваў сябе прыгнечаным. Ён верыў кіраўніку сваёй дзяржавы, услаўляў яго. Савецкі чалавек ганарыўся далучанасцю да справы будаўніцтва новага грамадства, бо народу заўсёды ўласціва надзея на лепшую будучыню.

**1.** Якая партыя адыгрывала вядучую ролю ў жыцці БССР?
**2.** Пералічыце грамадскія арганізацыі, што існавалі ў рэспубліцы. Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
**3.** Назавіце грамадскія арганізацыі, якія кантралявала Камуністычная партыя.
**4.** З якім гістарычным дзеячам звязана паняцце «культ асобы»?
**5*.** Чым, на вашу думку, можна растлумачыць узмацненне рэпрэсій? Пацвердзіце вашу думку тэкстам вучэбнага дапаможніка.
**6.** Высветліце сэнс тэрміна «жалезная заслона».
**7.** Як «жалезная заслона» ўплывала на жыццё простых людзей? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
**8.** Якое стаўленне да Камуністычнай партыі і яе кіраўніка было ў простых людзей? Адкажыце з дапамогай тэксту параграфа.
**9*.** У чым выяўляўся кантроль жыцця насельніцтва з боку Камуністычнай партыі?

**1.** Выберыце правільны варыянт адказу. Асаблівасць грамадска-палітычнага жыцця ў пасляваенны час заключалася:
а) у існаванні некалькіх партый (шматпартыйнасць);
б) у існаванні адной партыі (аднапартыйнасць).

**2.** Разгледзьце плакат на с. 26 і растлумачце подпіс да яго, карыстаючыся тэкстам вучэбнага дапаможніка. Паразважайце, чаму пасады кіраўнікоў абавязкова займалі толькі члены Камуністычнай партыі. З якой прычыны дзейнасць дэпутатаў Вярхоўнага Савета нязначна ўплывала на дзяржаўнае жыццё?

**3.** З дапамогай фотаздымка на с. 28 раскажыце аб дзіцячых аб'яднаннях у БССР.

**4*.** Складзіце з дапамогай настаўніка план характарыстыкі грамадскага жыцця краіны ў пасляваенныя гады.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**1.** Даведайцеся ў старэйшых, як яны ўдзельнічаюць у выбарах у мясцовыя і вышэйшыя органы ўлады ў наш час. Што ўплывае на іх выбар? *Параўнайце, чым адрозніваюцца выбары сучасныя ад выбараў у пасляваенны час.
**2.** Якія грамадскія арганізацыі існуюць сёння? Паразважайце, ці ёсць падабенства паміж сучаснымі і ранейшымі грамадскімі арганізацыямі і чым яны адрозніваюцца.
**3.** Ці з'яўляюцца вучні вашага класа членамі грамадскай арганізацыі? Раскажыце пра яе дзейнасць.
**4.** У якія грамадскія арганізацыі ўваходзяць вашы бацькі? Распытайце іх пра дзейнасць гэтых арганізацый.

Прыём акцябрат у піянеры праводзіўся святочна. Будучыя піянеры давалі ўрачыстае абяцанне быць вернымі Камуністычнай партыі і савецкаму народу. Кожны піянер мусіў ведаць і выконваць наступныя законы.

*Піянер адданы Радзіме, партыі, камунізму.*
*Піянер рыхтуецца стаць камсамольцам.*
*Піянер раўняецца на герояў барацьбы і працы.*
*Піянер шануе памяць барацьбітоў, якія загінулі, і рыхтуецца стаць абаронцам Айчыны.*
*Піянер — лепшы ў вучобе, працы і спорце.*
*Піянер — сумленны і верны сябар, які заўсёды смела стаіць за праўду.*
*Піянер — таварыш і важаты акцябрат.*
*Піянер — сябар піянерам і дзецям працоўных усіх краін.*



Прыём у піянеры



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 6. Культурнае жыццё беларускага народа (1945—1953)

1. Што такое лясныя школы і для чаго яны існавалі?
2. Назавіце вядомых вам дзеячаў навукі і культуры Беларусі.
3. Якія творы беларускіх пісьменнікаў, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, вы ведаеце?

Развіццё культуры беларускага народа праходзіла ў складаных умовах. Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі на тэрыторыі рэспублікі школы не працавалі, за выключэннем нязначнай колькасці пачатковых класаў. Школьныя будынкі ў большасці або знаходзіліся ў разбураным стане, або выкарыстоўваліся акупантамі для сваіх патрэб. Было знішчана школьнае абсталяванне. Таму задача адраджэння агульнаадукацыйнай школы пасля выгнання акупантаў аказалася вельмі складанай. Трэба было рамантаваць і ўзводзіць нанава будынкі школ у гарадах і вёсках, наладзіць выпуск школьнага абсталявання.

Значна скарацілася за час вайны і колькасць настаўнікаў. Дзеці, не атрымаўшы адпаведнай свайму ўзросту адукацыі, вымушаны былі вучыцца разам з малодшымі. Вучоба дзяцей не адтэрміноўвалася ні на адзін дзень. Заняткі праводзіліся і ў зямлянках, і на адкрытых пляцоўках, і ў будынках, якія аднаўляліся. Найчасцей урокі праходзілі без падручнікаў і пісьмовых прылад. Але самае важнае, што дапамагала дзецям, — жаданне вучыцца.



Школьныя заняткі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Дзякуючы вялікім агульным намаганням ужо да 1950 года школ у рэспубліцы стала болей, чым перад вайной.

Істотна зменшылася за час вайны і колькасць урачоў, інжынераў і іншых спецыялістаў. Не ў лепшых умовах, чым школы, знаходзіліся ўстановы, дзе рыхтавалі спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Але ў першае пасляваеннае пяцігоддзе поўнасцю аднавілі работу вышэйшыя навучальныя ўстановы. Сярод іх найбольш вылучаўся Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Неўзабаве пасля вайны прынялі студэнтаў і навучэнцаў Беларускі тэатральны інстытут і мастацкае вучылішча ў Мінску. Хутка аднавілі сваю дзейнасць сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы (вучылішчы, тэхнікумы).

Урадам краіны праводзіліся важныя культурныя мерапрыемствы. Пачалі працаваць музеі. Ужо ў верасні 1945 года адчыніў дзверы літаратурны музей Янкі Купалы. Пры запаведніку «Белавежская пушча», створаным яшчэ да вайны, быў адкрыты Музей прыроды.

Нягледзячы на цяжкасці пасляваеннага часу, развіццё беларускай культуры не спынялася. З’явіліся новыя таленавітыя дзеячы.

У беларускай літаратуры і культуры гэтых гадоў галоўнай тэмай стала Вялікая Айчынная вайна. Большасць беларускіх пісьменнікаў, якія распавядалі пра вайну, самі былі яе ўдзельнікамі. Шмат зрабілі, каб данесці праўду пра вайну, вядомыя пісьменнікі Якуб Колас, Іван Навуменка, Янка Брыль і іншыя.

Убачыў свет першы беларускі раман пра партызанскі рух «Глыбокая плынь» Івана Шамякіна (1949). У 1944 годзе напісаў свой раман «Млечны Шлях» Кузьма Чорны. У 1952 годзе выйшаў раман Івана Мележа «Мінскі напрамак». Пачаў працаваць над раманам «Векапомныя дні» Міхась Лынькоў. Пра вайну пісалі беларускія паэты Пятрусь Броўка, Максім Танк, Пімен Панчанка, Пятро Глебка. Аркадзь Куляшоў атрымаў у 1946 годзе Дзяржаўную прэмію за паэму «Сцяг брыгады». За плённую дзейнасць былі адзначаны Якуб Колас, Пятрусь Броўка і многія іншыя.

Адзначаўся ўздым і тэатральнага мастацтва. У першыя пасляваенныя гады з’явіліся п’есы «Заложнікі» Алеся Кучара і «Канстанцін Заслонаў» Аркадзя Маўзона. Яны былі пастаўлены у Беларускім дзяржаўным тэатры імя Янкі Купалы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



*Яўген Зайцаў.* Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе

У выяўленчым мастацтве таксама з’явілася шмат твораў, у якіх адлюстраваны падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Мастак Яўген Зайцаў напісаў карціны «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе», «Парад беларускіх партызан у Мінску», «Канстанцін Заслонаў». Жывапісец Валянцін Волкаў прысвяціў сваю карціну «Мінск 3 ліпеня 1944 года» вызваленню сталіцы. Мастаку Івану Ахрэмчыку належыць карціна «Абаронцы Брэсцкай крэпасці».

Многія музычныя творы беларускіх кампазітараў таксама закраналі тэму Вялікай Айчыннай вайны.

У першыя пасляваенныя гады культурнае жыццё народа, думкі і меркаванні людзей знаходзіліся пад партыйным наглядам. Узмацніўся кантроль ва ўсіх галінах навукі і культуры. Ахвярамі рэпрэсій сталі шэраг дзеячаў культуры, пісьменнікі, вучоныя. Іх абвінавачвалі ў выказванні думак, якія разыходзіліся з поглядамі партыйных дзеячаў.

?

1. У якім стане знаходзіліся пасля вайны ўстановы адукацыі, навукі і культура Беларусі?
2. Чаму патрэбна было неадкладна пачаць адукацыю дзяцей і моладзі пасля заканчэння вайны?
3. У якіх умовах пачала аднаўляцца адукацыя?
4. Якой была галоўная тэма творчасці беларускіх дзеячаў культуры?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Назавіце імёны беларускіх аўтараў, якія пісалі пра вайну.
6. Чаму былі прысвечаны тэатральныя пастаноўкі? Назавіце іх.
7. Пералічыце імёны вядомых беларускіх мастакоў. Назавіце іх творы.
8. Хто кантраляваў працу дзеячаў навукі і культуры?
9. Ці кантралявала партыя культурнае жыццё народа? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.

Разгледзьце фотаздымак на с. 29. Раскажыце пра стан школьнай адукацыі пасля вайны.

Пацікаўцеся ў старэйшых, як наладжвалася вучоба дзяцей і моладзі пасля вайны ў вашай мясцовасці.

Цяжкасці палітычных праследаванняў спазнаў і вядомы вучоны-гісторык Мікалай Улашчык. Першы раз ён быў арыштаваны ў 1930 годзе і сасланы ў Вяцкую вобласць (Расія) на пяць гадоў. У 1941 годзе яго зноў арыштавалі і выслалі на пяць гадоў у Чэлябінскую вобласць (Расія). У 1951 годзе ён быў асуджаны на 8 гадоў. Гісторык знаходзіўся ў папраўча-працоўных лагерах у Сібіры. Пазней справядлівасць у дачыненні Улашчыка была адноўлена. Пасля гэтага ён плённа працаваў у галіне гісторыі. Улашчык стаў доктарам гістарычных навук. Па яго працах і сёння вывучаецца гісторыя Беларусі.

Рэпрэсіі зведалі пісьменнікі Сяргей Грахоўскі, Алесь Звонак, Павел Пруднікаў. У ліку нямногіх ім пашанцавала выжыць. Пасля вызвалення яны змаглі стварыць шмат літаратурных твораў.

## 7. Аднаўленне разбуранай вайной прамысловасці

1. Калі пачалося вызваленне Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў?
2. У якіх умовах пачалося аднаўленне прамысловасці БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны?
3. Якія галіны народнай гаспадаркі належаць да цяжкай прамысловасці?
4. Што такое лёгкая прамысловасць?

Аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі пачалося з восені 1943 года. У гэты час Гомель і частка Гомельскай вобласці былі вызвалены Чырвонай Арміяй ад фашысцкай акупацыі. У пачатку 1944 года пачалося



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Праца ў цяжкіх умовах разрухі

адраджэнне прамысловасці ў 36 раёнах Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей. У сярэдзіне года пачаў выпускаць прадукцыю Гомельскі паравозавагонарамонтны завод. У першую чаргу аднаўляліся прадпрыемствы, якія выраблялі прадукцыю для фронту і прадметы першай неабходнасці. Па меры далейшага вызвалення тэрыторыі рэспублікі пашыраліся і аднаўленчыя работы. Разам з адраджэннем гаспадаркі наладжвалася мірнае жыццё насельніцтва.

Найбольш цяжка было ў першыя пасляваенныя гады. Тым не менш аднаўленне прамысловасці ішло паспяхова.

Перш за ўсё аднаўлялася цяжкая прамысловасць, да якой належаць машынабудаванне, металаапрацоўка, электраэнергетыка (вытворчасць электраэнергіі). На працягу 1944 года было адноўлена 72 электрастанцыі. Зноў пачалі працаваць Добрушская папяровая фабрыка «Герой працы», Віцебская швейная фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі» і іншыя. У 1945 годзе сталі дзейнічаць «Гомсельмаш», Магілёўскі металаапрацоўчы камбінат.

Развіццё гаспадаркі ў краіне працягвала планавацца на пяцігадовы тэрмін (пяцігодку). Па ліку гэта была ўжо чацвёртая пяцігодка. Яе тэрмін прыпаў на першыя пасляваенныя гады (1946—1950). На працягу чацвёртай пяцігодкі планавалася не толькі завяршыць аднаўленне гаспадаркі БССР, але і забяспечыць яе далейшае развіццё. Пераадолець цяжкасці пасляваеннай разрухі дапамагалі ўсе рэспублікі СССР.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Аднаўленне чыгункі

Яны накіроўвалі ў Беларусь рабочых і інжынераў, абсталяванне, матэрыялы.

Разам з тым у развіцці **эканомікі**[1] БССР былі і недахопы. Адставалі энергетыка і здабыча торфу. Лёгкая прамысловасць аднаўлялася не такімі шпаркімі тэмпамі, як цяжкая. Марудна развівалася вытворчасць тавараў народнага спажывання, харчовай прадукцыі.

У цяжкім становішчы знаходзіўся транспарт, бо ў час вайны беларуская чыгунка была амаль поўнасцю разбурана. Але ўжо ў 1950 годзе даўжыня адноўленай чыгункі склала 93 % ад даваеннай. Былі пабудаваны масты, вакзалы, паравозныя дэпо. Пачаўся выпуск і аўтамабіляў. Поўнасцю былі адноўлены прадпрыемствы пошты і сувязі (тэлеграфнай і тэлефоннай).

У сувязі з шырокім размахам аднаўленчых работ у рэспубліцы апераджальнымі тэмпамі развівалася будаўніцтва. Да ўдзелу ў будаўнічых працах прыцягваліся і нямецкія ваеннапалонныя.

Хутка ўзнімаліся з руін вёскі і гарады. Сярод іх і сталіца нашай Радзімы — Мінск. У працы па аднаўленні ўдзельнічалі ўсе жыхары краіны.

[1] **Экано́міка** — усе галіны народнай гаспадаркі (прамысловасць, сельская гаспадарка, транспарт, гандаль і іншыя), якія забяспечваюць насельніцтва неабходнымі таварамі і паслугамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У вольны ад асноўнай працы час яны разбіралі руіны, рамантавалі і будавалі. Напрыклад, у Мінску кожны гараджанін адпрацаваў на аднаўленні сталіцы не менш чым 15 гадзін у месяц.

Здабыўшы перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, савецкі народ марыў пра мірнае, светлае жыццё. Па ўсёй краіне разгарнулася спаборніцтва паміж брыгадамі, прадпрыемствамі і рабочымі за высокія працоўныя дасягненні. Яно садзейнічала выкананню галоўнай задачы — аднаўленню і далейшаму развіццю народнай гаспадаркі краіны, адраджэнню гарадоў і вёсак.



Плакат з заклікам да ўдзелу ў аднаўленні Мінска



1. Калі пачалося аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі?
2. Чым адрозніваецца цяжкая і лёгкая прамысловасць? Выкарыстайце слоўнік.
3. Якія галіны прамысловасці ў першыя пасляваенныя гады развівaліся ў першую чаргу? Чаму? Для адказу скарыстайцеся тэкстам дапаможніка.
4*. Растлумачце, чым было абумоўлена хуткае аднаўленне прамысловасці БССР у пасляваенныя гады.
5. Чаму аднаўленне транспарту было адной з першачарговых эканамічных задач у Беларусі? Як яно ажыццяўлялася? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
6. Як развівалася будаўніцтва ў рэспубліцы?
7. Што спрыяла хуткаму аднаўленню гарадоў і вёсак краіны?
8*. Якія вынікі пераўтварэнняў у прамысловасці за чацвёртую пяцігодку вы можаце назваць?



1. Разгледзьце фотаздымкі і плакат на с. 33—35. Раскажыце аб аднаўленні прамысловасці краіны пасля вайны. Паразважайце, чаму кожны грамадзянін удзельнічаў у аднаўленні краіны пасля ваенных разбурэнняў.

2. Назавіце асаблівасці аднаўлення прамысловасці БССР у 1945—1953 гадах. Выкарыстайце схему на с. 36.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Асаблівасці аднаўлення прамысловасці БССР у 1945—1953 гадах**

- Вялікія матэрыяльныя і людскія страты
- Дапамога савецкіх рэспублік
- Пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці (машынабудавання, металаапрацоўкі, электраэнергетыкі і іншага)
- Адставанне лёгкай прамысловасці (вытворчасці тавараў народнага спажывання)
- Першачарговае аднаўленне транспарту
- Разгортванне маштабнага будаўніцтва

Спытайце ў дарослых, што яны ведаюць пра аднаўленне вашага роднага краю ў першыя гады пасля вызвалення. Даведайцеся пра гэта і ў краязнаўчым музеі.

## 8. Аднаўленне разбуранай вайной сельскай гаспадаркі

1. Якія страты панесла сельская гаспадарка ў час Вялікай Айчыннай вайны?
2. Што такое калектывізацыя?
3. Што такое калгас?
4. Каму належалі зямля і сродкі яе апрацоўкі ў калгасе?
5. Хто такія сяляне-аднаасобнікі?

Сельская гаспадарка ў пасляваенны час знаходзілася ў цяжкім становішчы. Гэта было звязана ў першую чаргу з ваеннымі разбурэннямі. Аднаўленне сельскай гаспадаркі ў параўнанні з іншымі галінамі эканомікі ішло больш марудна. Кіраўніцтва дзяржавы большасць сродкаў накіроўвала ў прамысловасць. Сялянства павінна было само вырашаць праблемы пераадолення наступстваў вайны. Вёска аказалася не ў стане забяспечыць краіну неабходнымі харчовымі прадуктамі. Сельскагаспадарчай тэхнікі пасля вайны было мала. Колькасць жывёлы за гады



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ


Нарыхтоўка сена

вайны значна скарацілася, перш за ўсё не хапала коней. Жывёла праз бяскорміцу была ў вельмі дрэнным стане. Таму нярэдка мужчыны і жанчыны замест каня самі запрагаліся ў плуг ці барану. Шматлікія цяжкасці выклікала неабходнасць аднаўляць вялікую колькасць жылля і гаспадарчых пабудоў, знішчаных у час вайны на вёсцы.

Але, нягледзячы на гэта, сяляне пастаўлялі дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі нават больш, чым гэта дазвалялі ўмовы. Ужо ў 1950 годзе плошчы пасеваў у рэспубліцы амаль дасягнулі даваеннага ўзроўню. Павялічыўся адпаведна і збор збожжа. Раслі паказчыкі таксама ў жывёлагадоўлі.

Цяжкая праца калгаснікаў вымяралася ў **працаднях**[1], за якія амаль нічога не плацілі. Існавалі сяляне ў асноўным за кошт таго, што мелі з агародаў і свайго падвор'я. Гаспадарка, якую вялі калгаснікі на прысядзібных надзелах, з'яўлялася больш прадукцыйнай за калгасную. Значную частку сваёй прадукцыі сяляне былі вымушаны здаваць дзяржаве па нізкіх цэнах. Асабліва цяжкімі выдаліся 1946 і 1947 гады. У гэты перыяд праз неспрыяльнае надвор'е быў сабраны вельмі нізкі ўраджай. Акрамя таго, у сялян пачалі «абразаць» (памяншаць) іх прысядзібныя надзелы. Гэта тлумачылася тым, што на іх сяляне працавалі больш, чым у калгасе.

[1] **Працадзе́нь** — форма ўліку выкананай калгаснікамі працы. За кожны працадзень у канцы года плацілі заробак збожжам, гароднінай і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Да 1947 года насельніцтва гарадоў забяспечвалася прадуктамі харчавання па картачках. Гэта сведчыла аб цяжкім стане сельскай гаспадаркі. Такое становішча было звязана не толькі з ваеннымі разбурэннямі, але і з тым, як вялося гаспадаранне на зямлі. Пасля вайны індывідуальныя формы вядзення гаспадаркі на сяле, якія існавалі раней, былі ліквідаваны. Захаваліся толькі калгасы і саўгасы. Таму разам з адраджэннем калгасаў і саўгасаў, створаных да вайны, паскоранымі тэмпамі ажыццяўлялася суцэльная калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі. На гэтых землях у кароткі час усе сялянскія гаспадаркі былі аб’яднаны ў калгасы. Пры гэтым нярэдка выкарыстоўваліся насілле і рэпрэсіі. У сялян-аднаасобнікаў была адабрана маёмасць. Іх сем’і, а таксама сем’і тых, хто выступаў супраць калгасаў, высялялі ў малаабжытыя раёны Савецкага Саюза.

Нягледзячы на цяжкія ўмовы сялянскага жыцця, калгаснікі не маглі пакінуць вёску. Яны не мелі магчымасці ўладкавацца на працу ў горадзе, бо ім не выдавалі пашпарты. Каб умацаваць калгасы і саўгасы, савецкая ўлада з канца 1940-х гадоў накіроўвала туды значныя сродкі, тэхніку, спецыялістаў. З’явіліся гаспадаркі, якія дасягнулі высокіх поспехаў у вырошчванні збожжавых культур, вытворчасці мяса і малака. У 1950 годзе пачалося ўзбуйненне калгасаў, калі некалькі дробных калектыўных гаспадарак аб’ядноўваліся ў адну. Да больш моцных далучалі слабыя гаспадаркі.

У гэты час жыццё працаўнікоў вёскі крыху палепшылася. Але ўвогуле адраджэнне сяла ішло з вялікімі цяжкасцямі. Не было адноўлена пагалоўе коней, свіней, авечак. У некаторых гаспадарках сяляне на працадзень атрымлівалі па 200—300 грамаў збожжа. Вельмі марудна ішла электрыфікацыя калгасаў, бо не хапала электрастанцый. Патрабаваліся карэнныя змены ў арганізацыі сельскай гаспадаркі.

1. Куды дзяржава накіроўвала больш сродкаў на аднаўленне? Выберыце правільны адказ:
   а) у прамысловасць;
   б) у сельскую гаспадарку.
2. Чаму сельская гаспадарка пасля вайны аднаўлялася больш марудна, чым прамысловасць?
3. Якую плату за сваю працу атрымлівалі сяляне?
4. Калі з калгаснікамі вялі разлік за працадні?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Што атрымліваў калгаснік за працадні?
6. Назавіце асноўныя формы вядзення сельскай гаспадаркі ў БССР у пасляваенны перыяд.
7*. Чым адрозніваюцца індывідуальная і калектыўная формы вядзення сельскай гаспадаркі?
8. Як апрацоўвалі зямлю сяляне на асабістым падвор'і і ў калгаснай гаспадарцы?
9. Чаму сялянам пачалі памяншаць прысядзібныя надзелы?
10. З якой прычыны сяляне не маглі пакідаць вёскі і ўладкоўвацца ў гарадах?
11. Што было зроблена для ўмацавання калгасаў і саўгасаў?
12. Для чаго праводзілася ўзбуйненне калгасаў?
13*. Якімі былі вынікі пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы?

**1.** Разгледзьце фотаздымак на с. 37 і раскажыце аб аднаўленні сельскай гаспадаркі пасля ваенных разбурэнняў.

**2.** Назавіце асаблівасці аднаўлення сельскай гаспадаркі БССР у 1945—1953 гадах. Пры адказе выкарыстайце схему.

**Асаблівасці аднаўлення сельскай гаспадаркі БССР у 1945—1953 гадах**

- Вялікія разбурэнні і людскія страты
- Маруднае аднаўленне амаль без выдаткавання дзяржаўных сродкаў
- Захаванне калгаснай сістэмы. Адмена іншых формаў вядзення гаспадаркі. Уціск сялян-аднаасобнікаў
- Правядзенне калектывізацыі ў заходніх абласцях

Спытайце ў дарослых, што ім вядома пра аднаўленне сельскай гаспадаркі вашага роднага краю ў першыя гады пасля вызвалення. Атрымайце дадатковыя звесткі ў час наведвання краязнаўчага музея.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**1.** Адразу пасля вызвалення ад акупантаў зноў пачалі дзейнічаць калгасы і саўгасы. Ва ўсходніх абласцях Беларусі іх аднаўленне ішло хуткімі тэмпамі, бо калектывізацыя сельскай гаспадаркі тут была праведзена яшчэ да вайны. У іншым становішчы знаходзіліся заходнія вобласці. Да вайны тут было аб'яднана ў калгасы толькі 7 % сялянскіх гаспадарак. Ускладняла задачу іх аб'яднання тое, што на захадзе Беларусі значную колькасць сялянскіх двароў складалі хутары. Яны часцей за ўсё былі раскіданы на значных адлегласцях адзін ад аднаго. Іх пачалі ссяляць у адну вёску і аб'ядноўваць у калгасы. Ажыццяўлялася гэта супраць жадання людзей, а часам суправаджалася ліквідацыяй гаспадаркі і высяленнем сямей у іншыя раёны.

**2.** На сяле не хапала не толькі машын, сельскагаспадарчых прылад, угнаенняў, недастаткова было рабочых рук і кіраўнікоў. Многія калгасы пачалі ўзначальваць воіны, якія вярнуліся з фронту, былыя партызаны.

У родныя мясціны, ушчэнт разбураныя фашыстамі, вярнуўся Кірыл Пракопавіч Арлоўскі. За мужнасць і гераізм яго ўзнагародзілі Зоркай Героя Савецкага Саюза. Ён быў прызначаны старшынёй калгаса, нягледзячы на тое што ў выніку цяжкага ранення страціў кісці рук і вельмі моцна пашкодзіў слых. З таго часу калгас «Рассвет» Кіраўскага раёна на Магілёўшчыне, які ўзначаліў Арлоўскі, пачаў хутка аднаўляцца. Праз некаторы час калгас стаў адной з лепшых гаспадарак краіны. За сумленную працу і высокія дасягненні Кірыл Пракопавіч Арлоўскі атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы.



Калгас «Рассвет»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 9. Матэрыяльнае становішча насельніцтва ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе

1. Паразважайце, што азначае выраз «матэрыяльнае становішча насельніцтва».
2. Якім было матэрыяльнае становішча людзей адразу пасля вайны?
3*. Аб чым сведчыла картачная сістэма прадуктовага забеспячэння насельніцтва?

У першыя пасляваенныя гады матэрыяльнае становішча насельніцтва ў СССР і адпаведна ў БССР было цяжкім. Асноўныя сродкі дзяржава накіроўвала на аднаўленне эканомікі. Насельніцтва падтрымлівалася на тыя невялікія грошы, што заставаліся пасля забеспячэння патрэб народнай гаспадаркі. Да 1947 года захоўвалася картачная сістэма. Пры гэтым па картачках гарантавана можна было атрымаць толькі хлеб. Іншыя ж прадукты харчавання, напрыклад, тлушч і макаронныя вырабы, выдаваліся не ўсюды. Разам з картачнай сістэмай забеспячэння харчавання існаваў і камерцыйны гандаль. Яго арганізавалі не прадпрымальнікі, а дзяржава. У камерцыйных крамах можна было набыць амаль усё. Цэны на тавары ў іх былі значна вышэйшыя, чым на прадукты, якія размяркоўваліся па картачках. Напрыклад, цукар каштаваў у камерцыйнай краме ў 36 разоў даражэй, чым у звычайным магазіне.

На сялян картачная сістэма не распаўсюджвалася. Яны павінны былі забяспечваць сябе самі. Гэта ім удавалася за кошт прысядзібных надзелаў. Сабраны ўраджай не толькі карміў сялян, але і даваў магчымасць прадаць пэўную колькасць прадуктаў на калгасным рынку.

З 1947 года заработная плата насельніцтва пачала няўхільна павышацца. У снежні 1947 года была адменена картачная сістэма. Людзі пачалі жыць трошкі лепш. Тым не менш узровень цэн на прадукты харчавання і спажывецкія тавары ў сярэднім перавышаў кошты ў перадваенны перыяд.

Дабрабыт насельніцтва, нягледзячы на павышэнне заработнай платы, рос не так хутка. Гэта было звязана з тым, што кошт тавараў народнага спажывання зніжаўся марудна, а падаткі на прыбыткі насельніцтва за гэты перыяд узраслі. Акрамя падаткаў працоўныя абавязкова



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Пераезд на новую кватэру. 1952 год.
Карціна *Аляксандра Лакціёнава*




Аблігацыя 1948 года

павінны былі пазычаць грошы дзяржаве. Гэтыя выплаты называліся **дзяржаўнымі пазыкамі**[1]. На ўнесеную суму выдаваліся **аблігацыі**[2]. Для працоўных падпіска на аблігацыі была дадатковым цяжарам. Найбольш цяжкім ярмом гэта стала для сялян, якія і так мелі невялікія даходы. З аднаго боку, людзі разумелі, што без іх падтрымкі ў дзяржавы не будзе неабходнай колькасці сродкаў для развіцця. З другога боку, кіраўніцтва краіны недастаткова клапацілася аб стварэнні ўмоў для паляпшэння дабрабыту насельніцтва.

У пасляваенныя гады вялося шырокамаштабнае жыллёвае будаўніцтва. Людзі ўжо не туліліся ў зямлянках, аднак насельніцтва было недастаткова забяспечана неабходнай жылой плошчай. У сярэднім на аднаго чалавека прыходзілася 2,5—3 квадратныя метры. Але гэта абсалютна не адпавядала патрэбам насельніцтва БССР.

Паступова аднаўлялася сістэма аховы здароўя працоўных. Гэта былі першыя крокі на шляху паляпшэння жыцця людзей, якое заставалася яшчэ вельмі цяжкім.

[1] **Дзяржа́ўныя пазы́кі** — атрыманне дзяржавай у доўг грошай.
[2] **Аблiга́цыя** — пазыковая каштоўная папера, якая дазваляе праз пэўны перыяд часу атрымаць яе вартасць грашыма.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Якім было матэрыяльнае становішча насельніцтва ў СССР і адпаведна ў БССР у першыя пасляваенныя гады?
2. Куды накіроўваліся асноўныя грашовыя сродкі?
3. Што такое картачная сістэма?
4. Што атрымлівалі працоўныя па картачках?
5. Ці атрымлівалі сяляне прадукты харчавання па картачках?
6. Калі былі адменены картачкі на прадукты харчавання?
7. Як палепшыліся жыллёвыя ўмовы насельніцтва Беларусі ў першую пасляваенную пяцігодку?

**1.** Разгледзьце карціну на с. 42 і раскажыце пра змены ў матэрыяльным становішчы насельніцтва ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

**2.** Разгледзьце фотаздымак на с. 42 і раскажыце, якім чынам людзі падтрымлівалі дзяржаву ў яе развіцці.

Даведайцеся ў дарослых, што яны ведаюць аб тым, як жылі іх бабулі і дзядулі ў першыя пасляваенныя гады. Распытайце, ці існуюць сёння аблігацыі. Дзе іх набываюць?

Разам з адменай картачнай сістэмы была праведзена грашовая рэформа. Яе галоўнай мэтай была стабілізацыя грашовай сістэмы краіны. Але фактычна янаператварылася ў спосаб вырашыць праблемы аднаўлення гаспадаркі дзяржавы за кошт насельніцтва. Шмат хто страціў свае накапленні. Але дзякуючы рэформе ўдалося часткова пераадолець недахоп тавараў народнага спажывання.

## 10. Працоўны подзвіг беларускага народа. Уклад народаў СССР у аднаўленне БССР у пасляваенны перыяд

1. Калі пачалося аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі рэспублікі?
2. Чаму сяляне не былі зацікаўлены ў выніках сваёй працы?
3. У якую дзяржаву ўваходзіла БССР?
4. З дапамогай картасхемы на с. 45 вызначце, якія рэспублікі ўваходзілі ў склад СССР.

Ужо да 1950 года народная гаспадарка рэспублікі была адноўлена. Яна амаль дасягнула даваеннага ўзроўню. Улічваючы велізарныя скла-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

данасці пасляваеннага перыяду, гэта з’явілася сапраўдным працоўным подзвігам беларускага народа.

Асноўны цяжар аднаўленчых работ лёг непасрэдна на плечы ўсіх жыхароў Беларусі. У гэтай справе яны праявілі вялікую трываласць, цярплівасць і сілу волі. Гэтыя рысы заўжды былі ўласцівы нацыянальнаму характару беларускага народа. На працягу стагоддзяў беларусы цвёрда засвоілі, што жыццё — гэта перш за ўсё праца. Чым горшыя ўмовы жыцця, тым мацней неабходна старацца. Для большасці людзей праца заставалася галоўным сродкам існавання.

Пасля вайны ўзрасла і нацыянальная самасвядомасць народа. Адной з галоўных прычын таго стала перамога над такім моцным і небяспечным ворагам, якім з’яўлялася фашысцкая Германія. Нягледзячы на ўсе цяжкасці пасляваеннага жыцця, людзей не пакідала надзея на паспяховае пераадоленне разрухі. Тым больш што гэтыя спадзяванні падмацоўваліся рэальнымі справамі.

Працоўныя Беларусі адгукнуліся на заклік жыхароў Ленінграда (зараз Санкт-Пецярбург) выканаць пяцігадовы план за чатыры гады. Каб ажыццявіць гэта, працоўныя разгарнулі паміж сабой спаборніцтва, хто ў больш кароткі тэрмін выканае планавае заданне. Цэлыя калектывы і асобныя рабочыя імкнуліся дасягнуць вышэйшых паказчыкаў. Такое спаборніцтва насіла назву сацыялістычнага.

Аднаўленне зруйнаванай вайной гаспадаркі БССР стала магчымым дзякуючы самаадданай працы ўсяго беларускага народа. Значны ўклад у паспяховае эканамічнае развіццё рэспублікі ўнеслі былыя партызаны і ўдзельнікі вайны. Сярод іх — сталявар Мінскага аўтазавода Дзмітрый Іванавіч Барашкін і ўдзельнік вайны брыгадзір муляраў Дзяніс Рыгоравіч Булахаў. Гэтыя людзі за свае працоўныя заслугі сталі ганаровымі грамадзянамі горада Мінска.

БССР, якая з’яўлялася часткай адзінай саюзнай дзяржавы, у час аднаўлення ўласнай гаспадаркі атрымала дапамогу ад іншых рэспублік краіны.

Беларускі народ з дапамогай братніх народаў СССР зрабіў першыя крокі на шляху аднаўлення гаспадаркі нават тады, калі яшчэ працягвалася вайна. Рэспублікі, якія пазбеглі гітлераўскай акупацыі, дзяліліся з беларускім народам тым, што мелі самі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Граніца СССР
■ Масква Сталіца СССР
□ Мінск Сталіца БССР

Лічбамі на карце пазначаны: 1 — Эстонская ССР; 2 — Латвійская ССР; 3 — Літоўская ССР; 4 — Беларуская ССР; 5 — Малдаўская ССР; 6 — Грузінская ССР; 7 — Армянская ССР; 8 — Азербайджанская ССР; 9 — Кіргізская ССР; 10 — Таджыкская ССР

Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

Урад СССР выдаткаваў значныя грашовыя сродкі на аднаўленне народнай гаспадаркі БССР і на дапамогу насельніцтву. З розных канцоў Савецкага Саюза ў рэспубліку ішлі вагоны з харчаваннем, адзеннем, абуткам і медыкаментамі. Было дастаўлена шмат станкоў, металу, будаўнічых матэрыялаў, аўтамабіляў, трактароў. З індустрыяльных цэнтраў краіны прыбылі сотні спецыялістаў, кваліфікаваных рабочых. Працоўныя пачалі разам з беларусамі аднаўляць прадпрыемствы машынабудавання і металаапрацоўкі. Гэта былі рабочыя з Масквы, Горкага (зараз Ніжні Ноўгарад), Свярдлоўска (зараз Екацярынбург) і іншых гарадоў СССР. У выніку сумеснай працы ўжо ў 1944 годзе ў рэспубліцы аднавіліся шэраг машынабудаўнічых заводаў. На некаторых з іх быў арганізаваны рамонт самалётаў, танкаў, аўтамашын, выпуск іншай ваеннай прадукцыі. Усё гэта патрабавалася на франтах Вялікай Айчыннай вайны.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Лес Беларусі — Украіне. 1950 год

Больш за тры тысячы чалавек з БССР адправіліся ў іншыя рэспублікі, каб набываць новыя прафесіі. Па сканчэнні навучання яны вярнуліся ў рэспубліку, каб працаваць на новабудоўлях.

У сваю чаргу, беларускі народ дапамагаў аднаўляць гаспадарку іншым савецкім рэспублікам, асабліва тым, хто таксама зведаў нямецка-фашысцкую акупацыю. З БССР на вугальныя шахты Данбаса адпраўляўся лес. Шматтысячны атрад моладзі рэспублікі быў накіраваны на аднаўленне разбураных гарадоў і прамысловасці Украіны. Маладыя беларусы працавалі ў Сталінградзе (зараз Валгаград), на Дняпроўскай гідраэлектрастанцыі, металургічным заводзе «Запарожсталь» і іншых прадпрыемствах.

1. Як вы разумееце словы «працоўны подзвіг»?
2. Чаму працу людзей па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі можна параўнаць з подзвігам?
3. Што дапамагала працоўным аднаўляць народную гаспадарку?
4. Чаму рэспублікі СССР дапамагалі БССР у аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі? У чым гэта выяўлялася?
5. Якую дапамогу аказвалі беларусы братнім рэспублікам?

**1.** Падлічыце, за які тэрмін была аднаўлена і амаль дасягнула даваеннага ўзроўню народная гаспадарка рэспублікі. Што гэтаму спрыяла?
**2.** Разгледзьце картасхему на с. 45. Выкарыстоўваючы яе і тэкст параграфа, складзіце расказ пра дапамогу братніх народаў СССР у аднаўленні гаспадаркі БССР.
**3.** Разгледзьце фотаздымак уверсе і раскажыце аб дапамозе БССР іншым савецкім рэспублікам.

Даведайцеся, хто з вашай мясцовасці зрабіў значны ўклад у аднаўленне народнай гаспадаркі БССР.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У снежні 1943 года ўрад Савецкага Саюза прыняў пастанову. Яна была накіравана на дапамогу БССР у аднаўленні яе сельскай гаспадаркі. Згодна з пастановай у рэспубліку было завезена з усходніх раёнаў СССР 1542 трактары, 13 тысяч коней, 30 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, 130 тысяч авечак, 50 тысяч свіней. У 1945 годзе ў Беларусь даставілі 25 тысяч сельскагаспадарчых машын, звыш 3 тысяч аўтамашын, сотні тысяч галоў жывёлы. Для Беларусі была выдаткавана неабходная колькасць збожжа, насення лёну для веснавой сяўбы.

Неўзабаве савецкі ўрад прыняў пастанову «Аб аказанні дапамогі Беларускай ССР па забеспячэнні насельніцтва харчовымі і прамысловымі таварамі». У 1944 годзе такая дапамога ішла з усіх канцоў краіны.

## 11. Вынікі развіцця БССР у пасляваенны перыяд (1945—1953)

1. Якія мэты ў развіцці народнай гаспадаркі ставіліся пасля Вялікай Айчыннай вайны?
2. Што азначае паняцце «пяцігодка»?
3. Чаму дзяржава ў першыя пасляваенныя гады асноўную ўвагу надавала развіццю прамысловасці?

Аднаўленне гаспадаркі планавалася завяршыць на працягу чацвёртай пяцігодкі, якая ахоплівала 1946—1950 гады. У асноўным гэтая мэта была дасягнута.

За кароткі тэрмін з 1944 па 1950 год сталі даваць прадукцыю каля 6 тысяч адноўленых і пабудаваных прадпрыемстваў. У іх ліку — Мінскі, Гомельскі, Віцебскі, Аршанскі станкабудаўнічыя заводы, Гомельскі паравозавагонарамонтны завод. У 1946 годзе выпусціў першую прадукцыю матацыклетны і веласіпедны завод у Мінску. У БССР з’явіліся найбуйнейшыя новыя прадпрыемствы — напрыклад, аўтамабільны і трактарны заводы ў Мінску. У будаўніцтве гэтых заводаў прымала ўдзел уся краіна. Машынабудаванне і металаапрацоўка сталі вядучымі галінамі эканомікі Беларусі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Першыя грузавікі МАЗа.
1950-я гады



Сучасная прадукцыя МАЗа

Цяжкая прамысловасць па-ранейшаму развівалася больш хуткімі тэмпамі, чым лёгкая. На прадпрыемствах паўсюдна пачаліся істотныя змены. Планавалася на шэрагу прадпрыемстваў правесці **рэканструкцыю**[1]. Старое абсталяванне замянялася сучасным. Планавалася зрабіць механізаванай і сельскагаспадарчую прамысловасць. У выніку павінна была адбыцца замена ручной працы на вытворчасць з дапамогай розных аўтаматаў і механізмаў.

За гады пятай пяцігодкі, з 1951 года, колькасць прадукцыі, што выпускала прамысловасць БССР, павялічылася амаль у два разы. Пачалася вытворчасць шэрагу новых відаў прадукцыі. У іх лік уваходзілі грузавыя аўтамабілі, самазвалы, трактары «Беларусь» і іншае.

Значных поспехаў дасягнула лёгкая прамысловасць. Былі пабудаваны Мінскі і Гродзенскі тонкасуконныя камбінаты. Развівалася швейная прамысловасць. Павялічыўся выпуск тавараў народнага спажывання: абутку, адзення, вырабаў са скуры і іншага.

Рабіліся пэўныя захады для пашырэння вытворчасці адзення, абутку, прадметаў побыту і адпаведна для павышэння ўзроўню жыцця працоўных. Пачаў выпускаць сваю прадукцыю Віцебскі дывановаплюшавы камбінат.

Усе дасягненні першых пасляваенных гадоў атрымалі развіццё ў пятую пяцігодку. Напрыклад, значная колькасць рабочых Мінскага аўтамабільнага завода (МАЗа) увесь час перавыконвалі сваю працоўную норму. Такім чынам, яны выпускалі прадукцыю ўжо ў лік будучых гадоў.

[1] **Рэканстру́кцыя** — карэнная перабудова прадпрыемства, будынка, памяшкання і іншага.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Першы колавы трактар «Беларусь». 1953 год




Першы тралейбус Мінска

Шмат рабілася дзеля таго, каб паскорыць будаўніцтва шашэйных дарог, павялічыць колькасць перавозак грузаў і пасажыраў на рачным і аўтамабільным транспарце. У 1952 годзе з'явілася першая тралейбусная лінія. Значна ўзрасла працягласць аўтобусных ліній, што дазволіла звязаць абласныя гарады з раённымі цэнтрамі.

Разам з тым існавалі і негатыўныя з'явы. Па-ранейшаму галоўная ўвага надавалася патрэбам абароннай прамысловасці, таму асноўныя сродкі выдаткоўваліся на гэтыя мэты. Марудна развівалася сельская гаспадарка. Заработная плата калгаснікаў была вельмі невысокай, а іх зацікаўленасць у выніках працы — нізкай. Краіне былі патрэбны змены — рэформа народнай гаспадаркі.

**1.** Калі адбылося аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі?
**2.** Прывядзіце прыклады адраджэння эканомікі Беларусі пасля Вялікай Айчыннай вайны.
**3.** Што спрыяла хуткаму аднаўленню народнай гаспадаркі?
**4.** Што змянілася ў забеспячэнні людзей таварамі народнага спажывання?
**5.** Якія праблемы засталіся ў развіцці народнай гаспадаркі БССР?
**6.** Якія змены адбыліся ў развіцці транспарту?
**7*.** З чым былі звязаны недахопы ў развіцці народнай гаспадаркі БССР?

**1.** Разгледзьце фотаздымкі на с. 48 і паразважайце, як змянілася прадукцыя МАЗа болей чым за 60 гадоў.
**2.** Складзіце план расказу пра вынікі аднаўлення гаспадаркі. Выкарыстайце схемы на с. 36, 39.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**З гісторыі Мінскага аўтамабільнага завода (МАЗа)**

Адразу пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на заводзе пачалася падрыхтоўка да выпуску грузавікоў. Іх зборкай рабочыя спярша займаліся ледзьве не пад адкрытым небам. Адначасова ўзводзіліся цэхі будучага завода. У кастрычніку 1947 года былі сабраны першыя пяць МАЗаў. А ў 1951 годзе завод ужо выпусціў 25 тысяч машын, перавысіўшы планавае заданне болей чым у паўтара раза. Гэтаму спрыяла жаданне працаўнікоў хутчэй наладзіць мірнае жыццё. Да таго ж у калектыве было арганізавана сацыялістычнае спаборніцтва. Для вялікай колькасці людзей завод стаў вельмі важнай часткай жыцця. Шмат хто пачынаў там свой працоўны шлях з юнацтва і аддаў прадпрыемству многія дзесяцігоддзі.

Сёння на МАЗе акрамя грузавікоў і прычэпаў выпускаюцца розныя аўтобусы, тралейбусы. Гэтая тэхніка пастаўляецца ў некалькі дзясяткаў краін далёкага замежжа і СНД.

## 12. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «Беларусь у пасляваенныя гады (1945—1953)» (параграфы 1—11)

**1.** Выберыце правільны варыянт адказу. Выкарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.

1) У першыя пасляваенныя гады ў БССР аддавалася перавага аднаўленню:

а) прамысловасці;

б) сельскай гаспадаркі.

2) Сельская гаспадарка ў пасляваенны час вялася выключна ў форме:

а) індывідуальнай гаспадаркі;

б) калгасаў і саўгасаў.

3) Народная гаспадарка БССР дасягнула даваеннага ўзроўню:

а) у 1947 годзе;

б) у 1950 годзе;

в) у 1953 годзе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4) Картачная сістэма забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання існавала:

а) да 1947 года;
б) да 1950 года;
в) да 1953 года.

5) Чацвёртая пяцігодка ахоплівала:

а) 1946—1950 гады;
б) 1951—1955 гады;
в) 1956—1960 гады.

6) Даваенная колькасць школ у БССР была адноўлена:

а) да 1947 года;
б) да 1950 года;
в) да 1953 года.

7) БССР была прынята ў ААН:

а) як рэспубліка ў складзе СССР;
б) як незалежная дзяржава;
в) за вялікі ўклад БССР у разгром фашызму, панесеныя велізарныя людскія і матэрыяльныя страты.

8) Новы дзяржаўны сцяг БССР з'явіўся:

а) у 1945 годзе;
б) у 1949 годзе;
в) у 1951 годзе.

**2.** Растлумачце, як вы разумееце наступныя словы і словазлучэнні: *пяцігодка, дзяржаўныя пазыкі, калектывізацыя, лёгкая прамысловасць, цяжкая прамысловасць, нацыянальнае багацце, гарады-пабрацімы, культ асобы, «халодная вайна», «жалезная заслона», працоўны подзвіг.*

**3.** Дапоўніце наступныя сказы:

а) *У першыя пасляваенныя гады насельніцтва магло набыць харчовыя прадукты па ... .*

б) *Пяцігодка аднаўлення гаспадаркі БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны была па ліку ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** Вызначце, якія словы з правага слупка маюць дачыненне да паняццяў з левага слупка.

| | |
|---|---|
| цяжкая прамысловасць | працадні |
| сельская гаспадарка | прыцягненне нямецкіх ваеннапалонных |
| будаўніцтва | выпуск аўтамабіляў і трактароў |

**5.** Растлумачце, чаму рэспублікі СССР дапамагалі БССР у аднаўленні зруйнаванай вайной народнай гаспадаркі.

**6.** Растлумачце, чаму ў заходніх абласцях БССР пасля іх вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў узяты курс на правядзенне агульнай калектывізацыі.

**7.** Растлумачце скарачэнне *ААН*. На што накіравана яе дзейнасць?

**8.** Раскажыце пра асаблівасці аднаўлення народнай гаспадаркі БССР у 1945—1953 гадах. Выкарыстайце схему.

**Асаблівасці аднаўлення народнай гаспадаркі БССР у 1945—1953 гадах**

- Вялікія матэрыяльныя і людскія страты
- Дапамога савецкіх рэспублік
- Пераважнае развіццё цяжкай прамысловасці
- Захаванне калгаснай сістэмы ў сельскай гаспадарцы
- Правядзенне калектывізацыі ў заходніх абласцях



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# БССР У СЯРЭДЗІНЕ 1950-х — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1960-х ГАДОЎ

## 13. Грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў

1. Што азначае выраз «культ асобы»?
2. Як вы разумееце сэнс слоў «дэмакратычныя свабоды»?
3. Што такое рэпрэсіі?
4. Каго аб'ядноўваюць у сваіх радах прафесійныя саюзы?
5. Якія грамадскія аб'яднанні дзяцей і моладзі існавалі ў СССР?
6. Што такое сацыялістычнае спаборніцтва?

У 1953 годзе памёр кіраўнік краіны Іосіф Сталін. Пасля яго смерці ў жыцці рэспублікі, як і ўсёй краіны, пачаліся перамены. Першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (ЦК КПСС) быў абраны Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў.

У 1956 годзе адбыўся 20 з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (КПСС). На ім было ўзнята пытанне аб культе асобы Сталіна і злоўжываннях у перыяд яго ўлады. Партыя абвясціла, што надышоў час перагляду стаўлення да чалавека. Быў узяты курс на адыход ад сталінскага стылю кіравання. Мерапрыемствы, якія ажыццяўляліся ў СССР і адпаведна ў БССР пасля смерці Сталіна, накіроўваліся на дэмакратычныя пераўтварэнні ў краіне. Грамадства падтрымала курс партыі.

Спыніліся масавыя рэпрэсіі. Многія бязвінна асуджаныя аднавілі сваё добрае імя. Людзі сталі больш свабодна выказваць свае думкі і жыць без ранейшага ціску.

На самай справе паслабленні ў жыцці грамадства не азначалі, што партыйныя вярхі адмовіліся ад сваёй кіруючай ролі. Камуністычная партыя працягвала выкарыстоўваць камандныя метады кіравання. Выбары ў Саветы народных дэпутатаў па-ранейшаму былі фармальнымі. Яны знаходзіліся пад пільным кантролем партыйных кіраўнікоў.

У пэўнай ступені пашырылася роля прафесійных саюзаў. Яны пачалі займацца пытаннямі сацыяльнага забеспячэння насельніцтва, арганізацыяй санаторна-курортнага аздараўлення працоўных.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Камсамольцы едуць на цаліну

Грамадскае жыццё моладзі знаходзілася пад наглядам камсамола (Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі). Большая частка маладых людзей, што вучыліся ці працавалі, былі камсамольцамі. Ад членаў гэтай арганізацыі патрабавалася сумленна працаваць ці вучыцца, прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Камсамольцы лічыліся перадавым маладзёжным атрадам Камуністычнай партыі. Самых актыўных з іх прымалі ў рады КПСС. Камсамольцы Беларусі ўнеслі свой уклад у развіццё як рэспублікі, так і ўсяго СССР. Маладыя людзі з камсамольскімі білетамі адпраўляліся на галоўныя будоўлі краіны. Яны ўдзельнічалі ва ўзвядзенні Салігорскага калійнага і Беларускага шыннага камбінатаў, Васілевіцкай, Бярозаўскай і Лукомльскай ДРЭС. Камсамольцаў накіроўвалі будаваць прадпрыемствы хімічнай прамысловасці ў Гродне, Гомелі, Полацку і ў многіх іншых гарадах. Па пуцёўках камсамола працавалі на будоўлях краіны больш за 20 тысяч маладых людзей.

Насельніцтва Беларусі, спадзеючыся на лепшае жыццё, падтрымала змены ў развіцці грамадства. Усе без выключэння працоўныя калектывы спаборнічалі за лепшыя паказчыкі ў працы. Гэта спрыяла эканамічнаму развіццю краіны. Кіраванне сацыялістычным спаборніцтвам ажыццяўляла партыя. Непасрэднай арганізацыяй спаборніцтва займаліся прафсаюзы. Удзельнікі сацыялістычнага спаборніцтва павінны былі не толькі паказваць добрыя вынікі ў працы. Яны мусілі актыўна праяўляць сябе ў грамадскім жыцці.

?

1. Калі адбыўся 20 з’езд КПСС?
2. Што змянілася ў грамадскім жыцці пасля 20 з’езда КПСС? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
3. У чым выяўляліся дэмакратычныя пераўтварэнні ў СССР? Адкажыце, выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка.
4. Якія бакі грамадскага жыцця знаходзіліся пад пільным кантролем партыйных кіраўнікоў? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. У чым выяўлялася роля моладзі ў эканамічным развіцці краіны? Адкажыце з дапамогай тэксту параграфа.
6. Якую ролю ў жыцці грамадства адыгрывалі прафесійныя саюзы? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
7. Што садзейнічала эканамічнаму росту краіны? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
8*. Чаму некаторых людзей называлі беспартыйнымі?

**1.** Дэмакратычныя пераўтварэнні ў БССР пачаліся:
а) у 1953 годзе;
б) у 1945 годзе;
в) у 1965 годзе.
Выберыце правільны адказ і назавіце падзею, з якой былі звязаны гэтыя пераўтварэнні.
**2.** Выберыце правільны адказ. Курс 20 з'езда КПСС пачаў ажыццяўляцца:
а) з 1956 года;
б) з 1964 года;
в) з 1980 года.
Як узнятае на з'ездзе пытанне аб кульце асобы паўплывала на грамадскае жыццё краіны? Пацвердзіце словамі тэксту вучэбнага дапаможніка.
**3.** Як вы разумееце наступныя выразы: *бязвінна асуджаныя, адноўлена іх добрае імя*?

**1.** Даведайцеся, якія грамадскія аб'яднанні існуюць у Беларусі сёння. Як яны называюцца? *Чым іх дзейнасць адрозніваецца і чым падобна на тую, што ажыццяўлялі грамадскія аб'яднанні раней?
**2.** Пацікаўцеся, у якія грамадскія аб'яднанні ўваходзілі вашы старэйшыя сваякі. Паслухайце іх расказ пра той час, разгледзьце фотаздымкі. Спытайце, ці захаваліся ў іх значкі, эмблемы і іншыя атрыбуты ўдзельнікаў грамадскіх аб'яднанняў таго часу. У якіх агульнадзяржаўных падзеях, звязаных з аднаўленнем народнай гаспадаркі, яны прымалі ўдзел?

Пасля цяжкіх гадоў вайны і аднаўлення гаспадаркі адчувалася вострая нястача харчавання. Каб лепей забяспечыць людзей прадуктамі, было прынята рашэнне аб асваенні новых зямель. Прад-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

стаўнікі ўсіх рэспублік, у тым ліку і Беларусі, адправіліся на асваенне цаліны — урадлівай, але неапрацаванай глебы. Разам з асваеннем цаліны будаваліся жыллё, школы, бальніцы. Узнікалі гарады і сельскія населеныя пункты. Людзей, якія паехалі на асваенне новых зямель, пачалі называць цаліннікамі. Вялікую частку іх складала моладзь.

Разгледзьце малюнак на с. 54 і паразважайце, чаму камсамольцы лічыліся перадавым маладзёжным атрадам Камуністычнай партыі.

## 14. Развіццё сельскай гаспадаркі БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў



1. На аднаўленне якой галіны эканомікі ў пасляваенныя гады выдаткоўвалася больш дзяржаўных сродкаў: прамысловасці ці сельскай гаспадаркі?
2*. З якімі цяжкасцямі сустрэліся сяляне ў пасляваенныя гады? Выкарыстайце схему на с. 39.
3. Патлумачце паняцце «працадзень». Звярніцеся да слоўніка.
4. Што такое машынна-трактарная станцыя (МТС)? Знайдзіце азначэнне ў слоўніку.

З сярэдзіны 1950-х да пачатку 1960-х гадоў у СССР і адпаведна ў БССР праходзілі эканамічныя рэформы. Яны былі накіраваны на паляпшэнне стану народнай гаспадаркі.



Кірыл Пракопавіч Арлоўскі

Пастулова адбыліся станоўчыя змены і ў развіцці сельскай гаспадаркі. Пачала ўмацоўвацца матэрыяльна-тэхнічная база калгасаў. Гэта дасягалася за кошт перадачы ім сельскагаспадарчай тэхнікі, якая раней была сабрана на МТС. У 1965 годзе ў БССР стала ў 5 разоў больш трактароў, чым у 1950 годзе. Колькасць камбайнаў і аўтамабіляў павялічылася ў 8 разоў. Дзякуючы гэтаму сельская гаспадарка давала прадукцыі на 70 % болей. Прыкладам дбайнага гаспадарання стаў ужо вядомы вам калгас «Рассвет» Магілёўскай вобласці, які ўзначальваў Кірыл Пракопавіч Арлоўскі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Меліярацыйныя каналы ў вёсцы Бароўка
Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці

На развіццё сельскай гаспадаркі дзяржава пачала выдаткоўваць значна больш сродкаў. Сельскагаспадарчая прадукцыя ў калгаснікаў стала закупляцца дзяржавай па больш высокіх цэнах. Да непасрэднай дапамогі і ўдзелу ў калгаснай вытворчасці прыцягваліся калектывы прадпрыемстваў, навуковых і навучальных устаноў. Іх прадстаўнікі дапамагалі калгаснікам не толькі ва ўборцы ўраджаю, але і ў павышэнні культурнага ўзроўню.

Калгаснікі пачалі атрымліваць грашовыя выплаты за працадні. У сувязі з гэтым палепшыўся дабрабыт вяскоўцаў. Змянялася і стаўленне да працы сялян. У калгаснікаў з'явілася зацікаўленасць у павелічэнні прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі. У выніку пачаў назірацца рост сельскагаспадарчай вытворчасці.

На дапамогу працаўнікам сяла прыйшла хімічная вытворчасць. У краіне быў наладжаны выпуск мінеральных угнаенняў. Гэта спрыяла паляпшэнню ўрадлівасці глебы. На забалочаных землях усё шырэй ажыццяўлялася **меліярацыя**[1]. Асабліва яна закранула Беларускае Палессе. Дзякуючы ёй значна павялічылася колькасць ворыўных зямель для выкарыстання ў сельскай гаспадарцы. Аднак у той час не задумва-

[1] **Меліяра́цыя** — мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне якасці зямель. У Беларусі прадугледжвала асушэнне забалочаных месцаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ліся пра вынікі гэтых мерапрыемстваў. Кіраўніцтва краіны ігнаравала экалагічныя пытанні. У выніку значна пагоршыўся стан навакольнага асяроддзя Палесся.

Па камандзе партыйнага кіраўніцтва на вялікіх зямельных плошчах пачалі вырошчваць кукурузу. Паўсюднае пашырэнне гэтай культуры стала яшчэ адным негатыўным момантам у развіцці сельскай гаспадаркі. Кукурузу сеялі замест жыта, пшаніцы, бульбы. У выніку ў пачатку 1960-х гадоў у краіне пачаліся цяжкасці з забеспячэннем насельніцтва хлебам. У выніку такога становішча зноў паўстала пытанне аб неабходнасці рэформы сельскай гаспадаркі.




Плакат «Дарогу кукурузе». 1955 год. Мастак *Віктар Гаваркоў*

1. Назавіце галоўныя кірункі пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы.
2. Якія змены адбыліся ў матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні працы калгаснікаў? Як гэтыя змены адбіліся на жыцці сялян?
3. Што спрыяла развіццю сельскагаспадарчай вытворчасці?
4. Назавіце адмоўныя з’явы ў развіцці сельскай гаспадаркі гэтага перыяду.
5. Якія мерапрыемствы прывялі да пагаршэння стану навакольнага асяроддзя?

**1.** Пад кіраўніцтвам дарослых падрыхтуйце паведамленне пра тое, што робяць людзі для падтрымання чысціні навакольнага асяроддзя.
**2.** Разгледзьце фотаздымак на с. 57. Раскажыце, што вы ведаеце пра асушэнне забалочаных зямель на тэрыторыі БССР. *Чаму гэта з’ява негатыўна паўплывала на навакольнае асяроддзе?

Эканоміка Беларусі была спланавана без уліку мясцовых асаблівасцей і інтарэсаў. Тэрыторыя БССР займала меней чым 1 % плошчы Савецкага Саюза. Аднак у рэспубліцы пражывала прыкладна 4 % насельніцтва СССР. Нягледзячы на тое, вялікая ўвага надавалася развіццю хімічнай прамысловасці. Прадпрыемствы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

гэтай галіны выпускалі велізарныя ў маштабах краіны аб’ёмы прадукцыі. Беларусь вырабляла больш за палову калійных угнаенняў, амаль чвэрць хімічных валокнаў. Перанасычанасць прадпрыемствамі хімічнай прамысловасці не спрыяла захаванню чысціні навакольнага асяроддзя Беларусі. Гэта адмоўна ўплывала на стан здароўя людзей.

## 15. Развіццё прамысловасці БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў

1. У чым заключаўся працоўны подзвіг беларускага народа ў гады пасляваеннага развіцця прамысловасці БССР?
2. Якія галіны народнай гаспадаркі аднаўляліся ў першую чаргу (прамысловасць ці сельская гаспадарка)?
3*. З якімі цяжкасцямі сустрэліся людзі ў аднаўленчы перыяд? Выкарыстайце табліцу 1 на с. 12.
4. Што такое індустрыялізацыя? Праверце па слоўніку.

З сярэдзіны 1950-х гадоў індустрыяльнае развіццё рэспублікі ішло паскоранымі тэмпамі. Гэтаму спрыяла выкарыстанне ў вытворчасці новых дасягненняў навукі і тэхнікі (навукова-тэхнічны прагрэс). Такое паскоранае развіццё ў той жа час ахапіла ўсе развітыя краіны свету. Савецкі Саюз па многіх паказчыках адставаў ад краін Захаду. Кіраўніцтва СССР заўсёды імкнулася да таго, каб пераадолець адставанне. Таму неабходна было больш хуткімі тэмпамі развіваць тыя галіны прамысловасці, якія забяспечвалі высокі тэхнічны ўзровень усёй народнай гаспадаркі. Да іх належалі машынабудаванне і металаапрацоўка, хімічная і нафтахімічная прамысловасць, энергетыка.

Кожны год уводзіліся ў дзеянне некалькі дзясяткаў новых прамысловых прадпрыемстваў. Павялічылася прадукцыйнасць працы. Упершыню ў рэспубліцы быў асвоены выпуск лесавозных аўтамабіляў. Амаль у два разы вырасла вытворчасць тавараў народнага спажывання. Пачалі выпускаць сваю прадукцыю мінскія гадзіннікавы завод, камвольны камбінат. Хутка развіваўся транспарт. У Беларусі з’явіўся новы від транспарціроўкі нафты і газу — трубаправодны.

У гады шостай пяцігодкі (1956—1960) пачалі надаваць асаблівую ўвагу ўкараненню ў прамысловасць дасягненняў навукі і тэхнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прадпрыемства «Нафтан» (раней Полацкі нафтаперапрацоўчы завод). Пабудавана ў 1958—1963 гадах

У 1957 годзе ў СССР быў запушчаны першы штучны спадарожнік Зямлі, пабудаваны першы атамны ледакол.

У гэты час была ажыццёўлена спроба змяніць сістэму кіравання прамысловасцю. Да таго часу прамысловыя прадпрыемствы, калгасы і саўгасы працавалі па адным дзяржаўным плане, які распрацоўваўся ў Маскве. Таму яны не мелі дастатковай самастойнасці ў гаспадарчай дзейнасці. Было вырашана стварыць на месцах Саветы народнай гаспадаркі. Ім перадавалася права на кіраванне ўсёй прамысловасцю і будаўніцтвам. У БССР таксама быў створаны Савет народнай гаспадаркі. Але рэформа сістэмы кіравання прамысловасцю дала мала станоўчых вынікаў. Прамысловасць пачала адставаць у сваім развіцці. У пачатку 1960-х гадоў яе паказчыкі пагоршыліся. Гэта не спрыяла паляпшэнню дабрабыту людзей. Рэальныя даходы насельніцтва знізіліся.

?

1. Што спрыяла хуткаму развіццю прамысловасці Беларусі з сярэдзіны 1950-х гадоў?
2. Назавіце новыя дасягненні ў галіне прамысловасці сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў. Скарыстайцеся тэкстам вучэбнага дапаможніка.
3. Якое значэнне меў навукова-тэхнічны прагрэс у гады шостай пяцігодкі? Зачытайце адпаведны абзац тэксту вучэбнага дапаможніка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4*.** Як матэрыяльнае становішча людзей залежыць ад развіцця гаспадаркі?

* Разгледзьце схему. Адкажыце, якімі былі кірункі развіцця прамысловасці ў другой палове 1950-х — сярэдзіне 1960-х гадоў. Прывядзіце прыклады, выкарыстоўваючы тэкст вучэбнага дапаможніка.

**Напрамкі развіцця прамысловасці ў БССР**

- Машынабудаванне
- Металаапрацоўка
- Хімічная прамысловасць
- Нафтахімічная прамысловасць

У чарговы раз кіраўніцтва СССР вырашыла правесці грашовую рэформу. Яна пачалася 1 студзеня 1961 года. Пры гэтым 10 старых рублёў мяняліся на 1 новы. Рэформа павінна была ператварыць савецкі рубель у сапраўдны плацежны сродак. Аднак гэтага не адбылося. Больш за тое, дадзеная рэформа прывяла да часовага пагаршэння матэрыяльнага становішча працоўных.

## 16. З'яўленне на карце Беларусі новых гарадоў

1. Назавіце найстарэйшы горад Беларусі.
2. Пералічыце абласныя цэнтры Беларусі.

У пасляваенныя гады на тэрыторыі Беларусі пачалі ўзнікаць новыя гарады. Гэта было звязана з будаўніцтвам буйны́х заводаў, фабрык, электрастанцый, з асваеннем радовішчаў карысных выкапняў.

Гісторыя горада ***Салігорска*** пачынаецца 10 жніўня 1958 года. У гэты дзень адбыўся мітынг, на якім быў закладзены першы камень будучага горада. У гонар гэтай падзеі сёння ў Салігорску ўзвышаецца манумент. З 1965 года Салігорск стаў раённым цэнтрам.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прадпрыемства «Беларуськалій»

Салігорск — горад шахцёраў. Яго прадукцыя — калійная соль — вядома далёка за межамі нашай краіны. Продаж калійнай солі дае значны прыбытак дзяржаве. Здабываюць гэтае багацце шахцёры. Праца іх цяжкая і небяспечная. Прадпрыемства «Беларуськалій» штодзень адгружае тысячы тон калійных угнаенняў для сельскай гаспадаркі. Яно забяспечвае сваёй прадукцыяй сельскую гаспадарку не толькі Беларусі, але і іншых краін свету.

***Светлагорск*** — гэта горад энергетыкаў і хімікаў. Ён вядомы з 16 стагоддзя. Але тады ён быў вёскай і зваўся Шацілавічы. У 1958 годзе на правым беразе ракі Бярэзіны была пабудавана Васілевіцкая ДРЭС. Менавіта таму ў 1961 годзе гэты населены пункт быў перайменаваны ў Светлагорск. Зараз акрамя электрастанцыі ў ім працуюць вытворчае



Вытворчае аб’яднанне «Светлагорск-Хімвалакно»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



БелАЗ. Цэх галоўнага канвеера

аб'яднанне «СветлагорскХімвалакно» і цэлюлозна-кардонны камбінат. «СветлагорскХімвалакно» выпускае звышмоцныя матэрыялы. На Светлагорскім цэлюлозна-кардонным камбінаце з драўніны вырабляюць кардон, паперу, цэлюлозу.

***Наваполацк*** — горад хімікаў, які існуе з 1958 года. Ён вырас побач са старажытным Полацкам на левым беразе Заходняй Дзвіны. Тут пабудавана вядомае на ўсю Беларусь і далёка за яе межамі прадпрыемства па перапрацоўцы нафты.

Горад ***Жодзіна*** згадваецца ў гістарычных крыніцах з 17 стагоддзя. Тады ён быў мястэчкам, з 1871 года тут знаходзілася чыгуначная станцыя. З 1963 года Жодзіна — горад аўтамабілебудаўнікоў. На аўтамабільным заводзе БелАЗ у Жодзіне вырабляюць шматтонныя самазвалы. Першы з іх быў выпушчаны ў ***1958 годзе***. У музеі Беларускага аўтазавода адлюстравана ўся гісторыя гэтага знакамітага прадпрыемства. Яно прайшло шлях ад выпуску 25-тоннага аўтасамазвала да сучасных 320-тонных машын. Цяжкагрузныя беларускія аўтасамазвалы вельмі патрэбны на вялікіх будоўлях не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.

У Жодзіне дзейнічаюць ГЭС, навукова-практычныя цэнтры па жывёлагадоўлі і земляробстве.

?

1. Назавіце новыя гарады, якія з'явіліся на карце нашай Радзімы.
2. З чым звязана з'яўленне новых гарадоў?
3. Якія прадпрыемствы працуюць у новых гарадах?
4. Чым праславілі новыя гарады нашу Радзіму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разгледзьце фотаздымкі на с. 62—63. Складзіце з дапамогай іх і тэксту параграфа расказ пра новыя беларускія гарады.

Знайдзіце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) гарады Салігорск, Светлагорск, Наваполацк, Жодзіна.

Чаму менавіта на гэтай зямлі ўзнік горад Салігорск? З чым звязана яго назва?

Легенда расказвае, што ў далёкія часы ў гэтым краі жыў чарадзей. Ён быў вельмі прагны, адбіраў у людзей і цягнуў да сябе ўсё, што яму спадабалася. Людзі пачалі змагацца з ім. Не вытрымаў чарадзей людскога гневу і схаваўся далёка пад зямлю, захапіўшы ўсе багацці з сабой. З таго часу збяднелі навакольныя месцы, спустошыліся палеткі, сталі галадаць людзі. Зямля-матухна ператварыла слёзы людскія ў соль каменную. Аднак у нашы часы людзі знайшлі гэтыя багацці, і зараз яны прыносяць карысць усяму беларускаму народу.

Вось як расказвае пра свае ўражанні ад Салігорска пісьменнік Уладзімір Ліпскі:

«Аднойчы я трапіў глыбока пад зямлю. І было гэта ў Салігорску, у горадзе, да якога тры гадзіны язды ад Мінска.

Горад пачаў будавацца ля вёскі Чыжэвічы, у голым полі. Дамы раслі мо хутчэй, чым грыбы ў лесе. Падумайце самі: спачатку ў новым горадзе жыло ўсяго 500 чалавек, а праз дзесяць гадоў — трыццаць тысяч. Адусюль ехалі сюды людзі.

І зразумеў я ў салігорскім падзямеллі, што так вабіць людзей у маладым горадзе, чаму ён хутка расце і застаецца заўжды маладым.

Незлічоныя багацці схаваны пад зямлёй. Каб іх здабыць, трэба шмат умелых і вопытных рук, працавітых машын. Вось і расце з кожным годам сям'я беларускіх шахцёраў.

…Я атрымаў дазвол спусціцца ў адну з шахтаў. Правілы строгія: трэба надзець рабочы касцюм, каску з ліхтарыкам, слухацца павадыра, не парушаць правілаў бяспекі. Падышлі да шахты, выклікалі вялізны ліфт і паехалі ўніз, пад зямлю.

Вельмі доўга спускаліся. Аж страшнавата стала. Ды вось урэшце і прыехалі. Выходзім. Якая прыгажосць! Здаецца, трапіў у падземныя палацы. „Падлога" і „сцены" быццам высланы віцеб-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

скімі і брэсцкімі дыванамі. Чырвоныя, белыя, бэзавыя фарбы нібы ўплецены ў шэрую пароду. Пальцам датыкаюся да каляровай сцяны, спрабую на язык: салёна. Дык вось якія „дываны“ тчэ мастачка-прырода!

Ідзём па шырокай і роўнай вуліцы — штрэку. Нас абганяюць падземныя машыны. Штрэк асветлены, а яшчэ ў кожнага — свой ліхтарык. Прыгожа, таямніча. Дыхаецца лёгка. А на сценах усё новыя і новыя ўзоры. Вачэй не адарваць.

Наша захапленне падземнымі тунэлямі доўжылася да таго часу, пакуль не ўбачылі шахцёраў. Яны працуюць у лаве, дзе соль прымаюць металічныя „далоні“. Магутныя камбайны ўгрызаюцца ў нетры палескай зямлі. Твары ў шахцёраў валявыя, мужныя. Усміхаюцца, значыць, добра ідзе работа.

Толькі не думайце, што і ім пад сілу здабыць усе залежы беларускай калійнай солі. Яе столькі, што хопіць не аднаму пакаленню шахцёраў. Болей таго, трэба думаць, як выкарыстаць незлічоныя багацці адпрацаванай руды, з якой утварыліся цэлыя горы каля Салігорска.

А вы ж яшчэ ўлічыце, што геолагі працягваюць вывучаць нетры Беларусі. Можна не сумнявацца: яны адкрыюць новыя скарбы беларускай зямлі.

Калійныя ўгнаенні дапамагаюць хлебаробам збіраць высокія ўраджаі. І ў нас, і за межамі нашай рэспублікі. Во як далёка свецяць агні Салігорска!»

## 17. Буйны́я прадпрыемствы ў Беларусі сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў

1. Назавіце прадпрыемствы, што існавалі ў Беларусі ў даваенны перыяд.
2. Якія гады ахоплівалі пятая і шостая пяцігодкі?

У гады пятай і шостай пяцігодак у Беларусі ствараліся новыя прадпрыемствы. Пачаў дзейнічаць Полацкі нафтаперапрацоўчы завод. На ім сталі вырабляць бензін і мазуту.

У сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў былі пабудаваны заводы аўтаматычных ліній і электронных вылічальных машын (ЭВМ)



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Вытворчасць халадзільнікаў у кампаніі «Атлант»
(раней Мінскі завод халадзільнікаў)

у Мінску. У ***1960 годзе*** пачаты выпуск беларускіх ЭВМ. Уводзіліся ў дзеянне буйны́я прадпрыемствы хімічнай прамысловасці: Гомельскі суперфасфатны і Гродзенскі азотна-тукавы заводы. У ***1963 годзе*** быў заснаваны Салігорскі калійны камбінат.

З 1959 года пачаў працаваць Мінскі завод халадзільнікаў. Яго першая прадукцыя з маркай «Мінск» убачыла свет у 1962 годзе.

Акрамя новых прадпрыемстваў хуткімі тэмпамі развіваліся тыя, што існавалі раней. Працягваў выпускаць прадукцыю Мінскі матацыклетны і веласіпедны завод. Мінскія аўтамабільны (МАЗ) і трактарны (МТЗ) заводы сталі вядучымі прадпрыемствамі БССР.

На заснаваным у 1946 годзе Мінскім трактарным заводзе ў ***1950 годзе*** пачаўся выпуск трактароў. Спачатку гэта была мадэль, якую раней выраблялі на Ліпецкім трактарным заводзе (Расія). У хуткім часе быў асвоены выпуск новага трактара «Беларусь» (сучасная назва «Беларус»). З 1962 года трактарны завод пачаў выпуск трактара МТЗ-50. На той час гэта быў адзін з найлепшых колавых трактароў.

На Мінскім аўтамабільным заводзе, адкрытым у 1947 годзе, была распачата вытворчасць грузавых аўтамабіляў і самазвалаў, лесавозаў. Першы аўтамабіль МАЗ-205 сышоў з канвеера ў ***1947 годзе***. У 1958 годзе самазвалу МАЗ-530 на Міжнароднай прамысловай выставе ў Бруселі (Бельгія) быў прысуджаны галоўны прыз.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Буйныя прадпрыемствы сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў

Беларусь ператварылася ў краіну з развітой прамысловасцю. Яе ўклад у эканоміку СССР у параўнанні з іншымі рэспублікамі стаў адным з найбольшых.

Трактары, халадзільнікі, тэлевізары, гадзіннікі мінскіх заводаў і сёння карыстаюцца вялікім попытам у свеце. А «Беларуськалій» (былы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Салігорскі калійны камбінат) штодзень адгружае тысячы тон калійных угнаенняў. Яго прадукцыя патрэбна для сельскай гаспадаркі не толькі Беларусі, але і іншых краін.

1. Якія буйны́я прадпрыемствы ўзніклі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў?
2. Назавіце гарады, у якіх у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў узніклі новыя прамысловыя прадпрыемствы.
3. Якое значэнне маюць тэрміны «лёгкая прамысловасць» і «цяжкая прамысловасць»?
4. Якую прадукцыю выпускаюць прадпрыемствы цяжкай прамысловасці?
5. Што вырабляюць прадпрыемствы лёгкай прамысловасці?
6. Прывядзіце прыклады прадпрыемстваў цяжкай і лёгкай прамысловасці.

**1.** Разгледзьце табліцу 2. Назавіце буйны́я прадпрыемствы, якія ўзніклі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў.

*Табліца 2*

**Буйны́я прадпрыемствы сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў**

| Галіна прамысловасці | Прадпрыемствы |
|---|---|
| **Машынабудаванне** | Мінскі завод халадзільнікаў (цяпер кампанія «Атлант»); МАЗ; МТЗ; БелАЗ; Мінскі механічны завод (цяпер Беларускае оптыка-механічнае аб’яднанне) |
| **Металаапрацоўка** | Магілёўскі металургічны завод |
| **Хімічная прамысловасць** | Гродзенскі азотна-тукавы завод (зараз кампанія «Гродна Азот»); Салігорскі калійны камбінат (у далейшым вытворчае аб’яднанне «Беларуськалій»); Светлагорскі завод штучнага валакна (зараз прадпрыемства «СветлагорскХімвалакно») |
| **Нафтахімічная прамысловасць** | Полацкі нафтаперапрацоўчы завод (у далейшым прадпрыемства «Нафтан») |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Заканчэнне табл. 2*

| Галіна прамысловасці | Прадпрыемствы |
|---|---|
| **Станкабудаванне** | Мінскі завод аўтаматычных ліній |
| **Электронная прамысловасць** | Мінскі завод электронных вылічальных машын (зараз Мінскае вытворчае аб’яднанне вылічальнай тэхнікі) |

**2.** Пад кіраўніцтвам настаўніка знайдзіце матэрыялы, якія пазнаёмяць вас з сучаснай прадукцыяй Мінскага трактарнага завода або іншых буйны́х прадпрыемстваў Беларусі.
**3.** Разгледзьце фотаздымкі на с. 66, 69. З дапамогай іх і тэксту параграфа раскажыце, якую прадукцыю пачалі выпускаць беларускія прадпрыемствы ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў.

Пакажыце на картасхеме на с. 67, дзе знаходзіліся буйны́я прадпрыемствы сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў.

Якія прадпрыемствы цяжкай і лёгкай прамысловасці існуюць у вашай мясцовасці? Што яны выпускаюць?

### З гісторыі Мінскага трактарнага завода

Трактар «Беларус» сёння вядомы ва ўсім свеце. За сваю гісторыю, якая ахоплівае больш за паўстагоддзя, трактар шмат разоў змяняўся і мог выконваць розныя задачы. Завод выпускаў трактары і для лесанарыхтовак, і для ўборкі бавоўны. Былі нават мадэлі, прызначаныя для працы на горных схілах.



Сучасны трактар «Беларус»

Мінскі трактарны завод як сучасны вытворца сельскагаспадарчай тэхнікі бярэ ўдзел у міжнародных выставах. Цэхі па зборцы трактароў «Беларус» адкрыты ў розных краінах свету.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 18. Сувязі БССР з іншымі рэспублікамі СССР

1. Калі былі ўтвораны СССР, БССР?
2. Колькі рэспублік уваходзіла ў склад СССР?
3. Хто дапамагаў беларускаму народу аднаўляць народную гаспадарку БССР?

Эканоміка БССР развівалася як частка адзінай народнай гаспадаркі ўсёй краіны. Гэта дазваляла аб’ядноўваць матэрыяльныя рэсурсы і магчымасці БССР і іншых рэспублік СССР. Разам народы СССР маглі вырашаць буйны́я задачы па развіцці эканомікі і культуры.

БССР атрымлівала з іншых рэспублік розныя віды машын, дэталяў. У Беларусь ішлі сталь, чыгун, нафта, газ, вугаль, метал і іншае.

БССР пастаўляла ў саюзныя рэспублікі грузавыя аўтамабілі, трактары, тэлевізары, металарэзныя станкі, маторы, падшыпнікі, мінеральныя ўгнаенні, будаўнічыя матэрыялы.

Беларускія вучоныя і працоўныя ўнеслі вялікі ўклад у асваенне прыродных багаццяў Сібіры і Далёкага Усходу. Яны працавалі на радовішчах нафты і газу ў Цюменскай вобласці (Расія), на важных будоўлях у розных месцах СССР.

У 1950—1960-я гады беларусы прынялі актыўны ўдзел у асваенні **цаліны**[1]. Гэтыя землі знаходзіліся ў Казахстане, Сібіры і на іншых тэрыторыях. На цаліну з БССР пастаўляліся машыны, абсталяванне і будаўнічыя матэрыялы. За 1954—1960 гады на асваенне цаліны



Беларусы на цаліне

[1] **Цалі́на** — урадлівыя, але неапрацаваныя землі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з Беларусі выехала каля 60 тысяч юнакоў і дзяўчат. З іх дапамогай там ствараліся новыя саўгасы, пачалі будавацца гарады і пасёлкі. Краіна атрымала вялікую колькасць хлеба.




Беларускія будаўнікі ад'язджаюць на аднаўленне Ташкента пасля землетрасення. Чэрвень 1966 года

У БССР сумесная дзейнасць беларускіх працоўных і прадстаўнікоў іншых рэспублік дала станоўчыя вынікі. У рэспубліцы была створана магутная прамысловасць. Значнае развіццё атрымалі энергетыка, машына- і прыборабудаванне, электроніка і радыёэлектроніка, хімія і нафтахімія.

БССР займала адносна невялікую тэрыторыю (менш за 1 % ад плошчы СССР). Насельніцтва рэспублікі складала прыкладна 4 % жыхароў Савецкага Саюза. Нягледзячы на гэта, доля Беларускай ССР у агульнасаюзнай вытворчасці была вельмі значнай.

Паміж саюзнымі рэспублікамі існавалі шырокія культурныя і навуковыя сувязі. Руская мова вывучалася ва ўсіх школах Савецкага Саюза. Таму ў шматнацыянальнай дзяржаве, якой быў Савецкі Саюз, усе добра разумелі адно аднаго. Творчыя калектывы паказвалі сваё майстэрства ў час правядзення Тыдняў мастацтва Беларусі ў розных гарадах Савецкага Саюза. БССР, у сваю чаргу, сустракала прадстаўнікоў іншых братніх рэспублік. Так у дзяржаве адбываўся міжнацыянальны культурны абмен.

?

1. Што атрымлівала Беларуская ССР ад іншых рэспублік СССР?
2. Якія тавары пастаўляла Беларуская ССР у іншыя рэгіёны краіны?
3. Якія гаспадарчыя адносіны існавалі паміж саюзнымі рэспублікамі?
4. Які ўклад у асваенне цалінных зямель унесла БССР?
5. Якія яшчэ сувязі, акрамя эканамічных, існавалі паміж братнімі рэспублікамі?

Разгледзьце фотаздымкі на с. 70—71. Карыстаючыся тэкстам параграфа, складзіце расказ пра ўзаемадапамогу савецкіх рэспублік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 19. Пераўтварэнні ў галіне народнай адукацыі

1. У якім стане была народная адукацыя пасля Вялікай Айчыннай вайны?
2. Да якога года ўдалося ўзнавіць даваенную колькасць школ?

За кароткі перыяд пасля Вялікай Айчыннай вайны народная адукацыя ў Беларусі зрабіла значны крок у сваім развіцці. Ствараліся ўмовы для атрымання моладдзю неабходных ведаў. У рэспубліцы з 1959 года была ўведзена абавязковая 8-гадовая адукацыя дзяцей. Павялічвалася колькасць сярэдніх агульнаадукацыйных школ з вытворчым навучаннем. Пашыралася і ўмацоўвалася іх матэрыяльна-тэхнічная база. Ва ўсіх школах ствараліся працоўныя майстэрні. Вучні не толькі набывалі веды, але і рыхтаваліся да прафесійнай дзейнасці ў розных галінах народнай гаспадаркі. Сярэднюю адукацыю атрымлівала ўсё большая колькасць моладзі. Навучанне, якое ў шэрагу школ было раней асобным для хлопцаў і дзяўчат, зараз стала сумесным. Дзеці, бацькі якіх не мелі магчымасці забяспечыць неабходныя ўмовы для навучання, і сіроты атрымлівалі адукацыю ў школах-інтэрнатах.

Згодна з перапісам насельніцтва 1959 года, амаль усе грамадзяне рэспублікі ўмелі чытаць і пісаць. Параўнайце: у 1939 годзе пісьменных было меней за 80 %.

З канца 1950-х гадоў ствараліся прафесійна-тэхнічныя вучылішчы (ПТВ). У гэтых установах сталі рыхтаваць рабочых розных спецыяльнасцяў.



На занятках у прафесійна-тэхнічным вучылішчы ў Крычаве



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Развівалася і сістэма вышэйшай адукацыі. У выніку дзеці рабочых і сялян станавіліся інтэлігенцыяй. Значна павялічылася колькасць вышэйшых навучальных установаў і студэнтаў у іх. Юнакі і дзяўчаты, якія працавалі на прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы, маглі атрымліваць адукацыю завочна.



Студэнты-геолагі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. 1955 год

Але разам з тым з другой паловы 1950-х гадоў у сістэме народнай адукацыі назіралася адмоўная з'ява. Школы з беларускай мовай навучання ў сваёй большасці ператвараліся ў рускамоўныя. Гэта адбывалася таму, што руская мова ў краіне з'яўлялася дзяржаўнай і была сродкам міжнацыянальных зносін. У выніку вялікая частка беларусаў аддалялася ад роднай мовы і нацыянальна-культурнага жыцця.

1. Якія змены адбыліся ў народнай адукацыі?
2. Колькі гадоў складала абавязковая адукацыя ў гэты перыяд?
3. Як змянілася адукаванасць дарослага насельніцтва ў параўнанні з даваенным перыядам?
4. Якім чынам навучэнцы рыхтаваліся да прафесійнай дзейнасці ў розных галінах эканомікі?
5. Назавіце адмоўную з'яву ў сістэме народнай адукацыі.
6*. Чым тагачасная сістэма народнай адукацыі адрознівалася ад сённяшняй?

**1.** Разгледзьце фотаздымкі на с. 72—73. Складзіце расказ аб магчымасцях атрымання адукацыі ў моладзі таго перыяду.

**2.** Як вы разумееце паняцце «завочная адукацыя»?

**3.** Растлумачце словы «руская мова з'яўлялася дзяржаўнай». Якія мовы ў сучасны перыяд з'яўляюцца дзяржаўнымі ў Беларусі? На якой мове вядзецца навучанне ў вашай школе? Ці вывучаеце вы беларускую мову?

Пацікаўцеся, калі пабудавалі вашу школу.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 20. Развіццё навукі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў

1. Назавіце імёны вядомых вам дзеячаў навукі БССР.
2. Якія навуковыя ўстановы ў нашай краіне вам вядомы?

У пасляваенны перыяд працягвалася развіццё навукі. Кіраўнікі СССР і БССР прызнавалі яе значную ролю ў жыцці беларускага грамадства. Вялікае значэнне мела дапамога Беларусі з боку навуковых цэнтраў СССР.

У 1950-я гады ў Мінск на сталую працу прыехалі вучоныя-фізікі, матэматыкі і іншыя навукоўцы. Іх дзейнасць паспрыяла з'яўленню новых навуковых кірункаў у рэспубліцы, падрыхтоўцы мясцовых кадраў вучоных.

На мэты развіцця навукі з дзяржаўнага бюджэту выдаткоўваліся немалыя сродкі. Гэта вяло да хуткага росту колькасці навуковых устаноў. Вядучым цэнтрам навукі ў рэспубліцы, як і раней, з'яўлялася Акадэмія навук БССР. У ёй узніклі новыя навукова-даследчыя інстытуты. Яны займаліся разнастайнымі праблемамі эканомікі, хіміі, фізікі, матэматыкі і культуры Беларусі. Навуковыя ўстановы адкрываліся не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах рэспублікі. Павялічылася і колькасць навуковых супрацоўнікаў. Сярод знакамітых навукоўцаў гэтага перыяду — фізікі Мікалай Барысевіч, Антон Сеўчанка, Барыс Сцяпанаў, Фёдар Фёдараў, матэматык Мікалай Яругін. Навуковая дзейнасць гэтых беларускіх даследчыкаў непасрэдна ўплывала на развіццё эканомікі дзяржавы. Пазней іх праца была высока ацэнена. Вучоныя атрымалі Дзяржаўныя прэміі СССР і БССР. Яны ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы.


Васіль Феафілавіч Купрэвіч

Прэзідэнтам Акадэміі навук БССР з 1952 па 1969 год быў акадэмік Васіль Феафілавіч Купрэвіч. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ён жыў у блакадным Ленінградзе. Нягледзячы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

на цяжкія ўмовы, Купрэвіч працягваў займацца навукай, якая была так неабходна краіне пасля доўгачаканай перамогі над фашызмам. У час працы ў БССР даследчык неаднаразова прадстаўляў беларускую навуку за мяжой.

Вучоныя пачалі шмат увагі надаваць вытворчым задачам. З гэтай мэтай адкрываліся навукова-вытворчыя ўстановы. На прамысловых прадпрыемствах сталі працаваць навуковыя лабараторыі. Такім чынам, у БССР укараняліся самыя новыя распрацоўкі вучоных: сучасныя станкі, аўтаматычныя лініі. У выніку на змену ручной працы паступова прыходзіла механізацыя.

На прадпрыемствах Беларусі сталі выпускацца прыборы асабліва высокай дакладнасці. У 1960 годзе ўбачыла свет першая беларуская электронная вылічальная машына. Пуск у БССР у 1962 годзе атамнага рэактара паклаў пачатак ядзерным даследаванням. Пачалося асваенне космасу. Сярод касманаўтаў Савецкага Саюза былі беларусы Пётр Клімук і Уладзімір Кавалёнак. Сваёй дзейнасцю яны ўнеслі вялікі ўклад у асваенне касмічнай прасторы. Кожны з іх здзейсніў па тры касмічныя палёты. У 1978 годзе Клімук у час свайго трэцяга палёту сустрэўся на касмічнай станцыі з Кавалёнкам. За тры палёты Уладзімір Кавалёнак правёў у космасе 215 сутак.

**1.** Якой установе належала вядучая роля ў развіцці навукі?
**2.** Назавіце прозвішчы вядомых беларускіх вучоных.
**3.** Якія новыя задачы вырашалі беларускія вучоныя?
**4.** Для чаго ствараліся навукова-вытворчыя ўстановы?
**5.** Назавіце беларусаў, якія сталі сусветна вядомымі касманаўтамі.
**6*.** З чым звязана павелічэнне ролі навукі ў жыцці грамадства?

**1.** Складзіце расказ пра развіццё беларускай навукі.
**2.** Падрыхтуйце паведамленне пра аднаго з беларускіх касманаўтаў. Выкарыстайце дадатковую літаратуру са школьнай бібліятэкі.
**3.** У пазашкольны час зрабіце разам з класам выставу «Беларускія касманаўты».

Даведайцеся, якія навуковыя ўстановы працавалі ў азначаны перыяд у вашай мясцовасці. Якія з іх існуюць і сёння?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**1.** Навуковая праца беларускіх даследчыкаў атрымала прызнанне не толькі ў рэспубліцы, але і ва ўсім СССР. Акадэмік АН БССР Міхаіл Мацапура за распрацоўку машын для асваення забалочаных зямель у 1962 годзе стаў лаўрэатам Ленінскай прэміі. Такой жа ўзнагароды быў удастоены акадэмік АН БССР Міхаіл Ельяшэвіч за даследаванні ў галіне аптычных назіранняў савецкіх ядзерных выпрабаванняў (1966).

**2.** На сённяшні дзень у космасе пабывалі болей за 500 чалавек. Трое з іх — беларусы.

Пётр Ільіч Клімук нарадзіўся ў вёсцы Камароўка каля Брэста. Там прайшло яго дзяцінства. Скончыў ваеннае вучылішча лётчыкаў. Пётр Клімук быў прыняты ў 1965 годзе ў атрад касманаўтаў. Здзейсніў як камандзір касмічнага карабля тры палёты. Затым працаваў кіраўніком. З'яўляецца ганаровым грамадзянінам Брэста і шэрагу гарадоў былога Савецкага Саюза. Мае мноства ўзнагарод.

Пасля Клімука ў касмічную прастору адправіўся Уладзімір Кавалёнак.

У 2012 годзе эстафету ў беларускіх касманаўтаў прыняў ураджэнец горада Чэрвеня Мінскай вобласці Алег Навіцкі.

Яго палёт на Міжнародную касмічную станцыю працягваўся паўгода. У гэтай экспедыцыі акрамя Алега Навіцкага ўдзельнічалі касманаўт з Расіі і астранаўт з ЗША.



Пётр Клімук



Уладзімір Кавалёнак



Алег Навіцкі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Наша краіна ў 2012 годзе стала касмічнай дзяржавай. Тады ўпершыню быў запушчаны ўласна беларускі спадарожнік. У Беларусі плануецца пашырэнне дзейнасці па асваенні касмічнай прасторы.

## 21. Развіццё культуры ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў

1. Назавіце вядомых вам паэтаў і празаікаў, што пісалі пра Вялікую Айчынную вайну. Якія іх творы вам знаёмы?
2. Успомніце, якім падзеям прысвечаны карціны: «Мінск 3 ліпеня 1944 года» Валянціна Волкава, «Парад беларускіх партызан у Мінску» Яўгена Зайцава.

Галоўнай у беларускай літаратуры заставалася тэма Вялікай Айчыннай вайны. Плённа працавалі над ёй Алесь Адамовіч, Іван Навуменка, Іван Чыгрынаў. Шырокую вядомасць сваімі ваеннымі аповесцямі, такімі як «Жураўліны крык», «Трэцяя ракета», «Альпійская балада» і іншыя, набыў Васіль Быкаў.

У гэты перыяд у поўнай ступені раскрыўся талент Івана Мележа, Івана Шамякіна і шэрагу іншых таленавітых пісьменнікаў.

У 1954 годзе Якуб Колас завяршыў работу над трылогіяй «На ростанях». У 1960-я гады з'явіліся раманы «Людзі на балоце» Івана Меле-



Іван Шамякін на сустрэчы з чытачамі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

жа, «Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля, «Сасна пры дарозе» Івана Навуменкі.

Дасягненнямі беларускай скульптуры сталі работы Заіра Азгура, Андрэя Бембеля, Аляксея Глебава, Сяргея Селіханава і іншых. Адна з найбольш важных з іх — Манумент Перамогі ў Мінску, узведзены ў 1954 годзе. Беларускія скульптары шмат сваіх твораў прысвяцілі героям Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх — помнікі падпольшчыку, Герою Савецкага Саюза Канстанціну Заслонаву ў Оршы, піянеру-герою Марату Казею ў Мінску (аўтар — Сяргей Селіханаў).

Адбудоўваўся галоўны праспект сталіцы, які сёння носіць назву праспекта Незалежнасці. На ім з'явіліся новыя прыгожыя будынкі. Адзін з найлепшых з іх — Палац культуры прафсаюзаў.

Высокім майстэрствам вылучаліся пастаноўкі тэатраў імя Янкі Купалы і Якуба Коласа, Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Былі створаны шэраг новых тэатраў і мастацкіх калектываў. У айчыннай оперы пашырыліся творы беларускіх кампазітараў на сучасную тэматыку. Так, доўгі час ішла п'еса «Калючая ружа» Юрыя Семянякі, прысвечаная жыццю студэнцтва. Была пастаўлена опера Аляксея Туранкова «Яснае світанне» аб уз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР. З'явіліся спектаклі беларускага балета, напрыклад, «Мара» Яўгена Глебава. На працягу многіх гадоў не сыходзіла са сцэны тэатра імя Янкі Купалы камедыя Андрэя Макаёнка «Лявоніха на арбіце».



Скульптурная выява на Мануменце Перамогі ў Мінску.
Скульптар *Сяргей Селіханаў*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Нацыянальны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча

Многія музычныя творы былі прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне, а таксама людзям працы. Песня Несцера Сакалоўскага на словы Міхася Клімковіча «Мы — беларусы» пасля адпаведнай апрацоўкі стала Дзяржаўным гімнам БССР.

З'явіліся Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла БССР і Дзяржаўны народны хор БССР. Імі кіравалі Рыгор Шырма і Генадзь Цітовіч. Гэтыя музычныя калектывы сёння носяць іх імёны.

1. Якая тэма была галоўнай у беларускай літаратуры сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў?
2. Назавіце імёны беларускіх пісьменнікаў і паэтаў гэтага перыяду.
3. З якімі творамі беларускіх пісьменнікаў таго часу вы знаёмы?
4. Якія беларускія тэатры праславіліся сваім высокім майстэрствам?
5. Назавіце імёны беларускіх скульптараў.
6. Калі пабудаваны Манумент Перамогі ў Мінску?
7. Хто аўтар музыкі Дзяржаўнага гімна БССР? Каму належаць словы гімна?
8. Назавіце імёны кіраўнікоў знакамітых беларускіх музычных калектываў.

**1.** Разам са школьным бібліятэкарам зрабіце выставу кніг беларускіх пісьменнікаў пра Вялікую Айчынную вайну.
**2.** Пазнаёмцеся з тэкстам Дзяржаўнага гімна БССР.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Пабывайце з бацькамі ў тэатрах ці музеях, якія знаходзяцца ў вашай мясцовасці, Нацыянальным мастацкім музеі.

## 22. Паўсядзённае жыццё беларускага народа ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў

Разам з развіццём эканомікі краіны паляпшалася і жыццё народа.

Асноўную частку даходаў насельніцтва складала заработная плата. У 1950-х — першай палове 1960-х гадоў яна павысілася больш чым на 20 %. Істотна павялічылася і аплата працы калгасніка. Дагэтуль ён мог працаваць і не атрымаць наогул нічога. З 1965 года калгаснікам сталі назначацца пенсіі па старасці і інваліднасці. Сяляне атрымалі пашпарты, як і ўсе грамадзяне краіны.

Павышаўся ўзровень мінімальных заработнай платы і пенсіі. Адначасова праводзілася палітыка зніжэння рознічных цэн на прадуктовыя і прамысловыя тавары. Значна палепшылася прадуктовае забеспячэнне насельніцтва. Але прамысловых тавараў у продажы не хапала. Таму былі павышаны цэны на дываны, матацыклы, машыны і іншае.

Толькі ў 1967 годзе ў краіне быў уведзены пяцідзённы працоўны тыдзень з двума выхаднымі днямі. Людзі больш часу маглі адпачываць, займацца выхаваннем сваіх дзяцей.

У гэтыя гады шмат увагі надавалася жыллёваму будаўніцтву. Кіраўніцтвам дзяржавы ставілася задача забяспечыць жыллём усё насельніцтва. Для гэтага патрэбна было шмат будаўнічых матэрыялаў. Іх пачалі вырабляць у вялікай колькасці. Было наладжана хуткае будаўніцтва пяціпавярховых дамоў. Узводзілі іх з гатовых домабудаўнічых канструкцый.

Кватэры мелі невялікую плошчу, а планіроўка пакояў была не вельмі ўдалай. Нягледзячы на гэта, такое хуткае будаўніцтва дазволіла людзям атрымаць асобныя кватэры. Такім чынам палепшыліся жыллёвыя ўмовы значнай колькасці насельніцтва. Толькі за 10 гадоў, з 1956 па 1965 год, у рэспубліцы звыш трох мільёнаў чалавек атрымалі жыллё.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Першая ў рэспубліцы «хрушчоўка». Пабудавана ў Мінску ў 1956 годзе

Аднак патрэбы насельніцтва ў жыллі па-ранейшаму заставаліся незадаволенымі. Вялікая колькасць грамадзян працягвалі жыць у камунальных кватэрах — так званых камуналках. На некалькі пакояў, у якіх жылі асобныя сем'і, быў толькі адзін санвузел, адзін калідор і агульная кухня. Далёка не кожная сям'я мела радыёпрыёмнік, тэлевізар, хатні тэлефон.

Пачала аднаўляцца і далей развівацца сфера паслуг. Павялічвалася колькасць лазняў, цырульняў, увогуле прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання. Там можна было адрамантаваць абутак, мэблю, пашыць адзенне. Аднак гэта сфера развівалася марудна. І пакуль што насельніцтва БССР, як і ўсёй Савецкай краіны, не мела высокай якасці жыцця. Людзі прызвычаіліся абмяжоўваць свае патрэбы. Народ радаваўся таму, што жыве без вайны.

Жыццё на вёсцы ў параўнанні з гарадскім было значна цяжэйшым. Дабрабыт калгаснікаў і сфера паслуг на сяле пакуль значна адставалі ад гарадскіх умоў жыцця.

Амаль адсутнічала магчымасць атрымліваць прафесійную падрыхтоўку, павышаць свой культурны ўзровень. Таму сельская моладзь імкнулася пераехаць у горад на вучобу і працу. У выніку гэтага большую колькасць сельскага насельніцтва складалі людзі сталага ўзросту. Адбылося так званае **старэнне насельніцтва**[1].

[1] **Старэ́нне насе́льніцтва** — павелічэнне колькасці пажылых непрацаздольных людзей у складзе насельніцтва.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як змяніўся дабрабыт насельніцтва ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў? У чым праявіліся гэтыя змены?
2. Якія станоўчыя зрухі адбыліся ў жыцці сялян?
3. Раскажыце пра змену жыллёвых умоў людзей.
4. Як развівалася сфера паслуг?
5. Чаму сельская моладзь імкнулася пераехаць у горад?
6*. Як растлумачыць, чаму людзі жылі ў такіх сціплых умовах і не скардзіліся?

**1.** Пазнаёмцеся са схемай «Асноўныя кірункі паляпшэння матэрыяльнага становішча насельніцтва БССР». Складзіце расказ пра станоўчыя змены ў дабрабыце насельніцтва.
**2.** Як змяніўся матэрыяльны дабрабыт беларускага насельніцтва ў другой палове 1950-х — сярэдзіне 1960-х гадоў у параўнанні з пасляваенным перыядам? Для адказу выкарыстайце схему.

**Асноўныя напрамкі паляпшэння матэрыяльнага становішча насельніцтва БССР**

- Павелічэнне ўзроўню мінімальных зарплаты і пенсіі
- Павышэнне пенсій, у тым ліку калгаснікам
- Паляпшэнне жыллёвых умоў насельніцтва ў гарадах
- Забеспячэнне таварамі народнага спажывання

Пазнаёмцеся з тэкстам у рубрыцы «Цікава ведаць» і даведайцеся ў дарослых, ці існуюць у вашай мясцовасці «хрушчоўкі». Як яны выглядаюць сёння?

Людзі празвалі пяціпавярховыя блочныя дамы «хрушчоўкамі». Бо іх пачалі будаваць у той час, калі кіраўніком дзяржавы быў Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў. Дамы выглядалі падобнымі адзін да аднаго. Яны былі шэрага невыразнага колеру. Кватэры ў іх мелі невялікую плошчу. Аднак яны былі хаця і маленькія, але асобныя. Многія сем'і, якія жылі ў кватэрах камунальнага тыпу, змаглі перасяліцца ў асобнае жыллё. Але патрэба ў жыллі кожнай сям'і так і не была задаволена.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 23. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў» (параграфы 13—22)

**1.** Якія падзеі спрыялі дэмакратычным пераўтварэнням у СССР? Выкарыстайце наступныя словазлучэнні: *культ асобы, рэабілітацыя бязвінна асуджаных*.

**2.** Выкарыстайце тэкст падручніка і правільна суаднясіце назвы прамысловых прадпрыемстваў з гарадамі, дзе яны былі пабудаваны.

| | |
|---|---|
| трактарны завод | Салігорск |
| суперфасфатны завод | Гродна |
| азотна-тукавы завод | Наваполацк |
| калійны камбінат | Гомель |
| нафтаперапрацоўчы завод | Мінск |

**3.** Выберыце правільны адказ.

1) Цаліна — гэта:
   а) дрыгвяністая глеба;
   б) пясчаная глеба;
   в) урадлівая, але неапрацаваная глеба.

2) Нафтаперапрацоўчы камбінат быў пабудаваны:
   а) у Гродне;
   б) у Гомелі;
   в) у Полацку.

3) Выпуск халадзільнікаў быў наладжаны:
   а) у Магілёве;
   б) у Мінску;
   в) у Віцебску.

4) 25-тонныя аўтасамазвалы БелАЗ пачалі выпускаць:
   а) у Мінску;
   б) у Магілёве;
   в) у Жодзіне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5) Жыхары сельскай мясцовасці атрымалі пенсіі:
   а) у 1953 годзе;
   б) у 1957 годзе;
   в) у 1965 годзе.

6) Абавязковая 8-гадовая адукацыя была ўведзена:
   а) у 1958 годзе;
   б) у 1965 годзе;
   в) у 1977 годзе.

7) Навучальныя ўстановы, якія рыхтавалі рабочых, называліся:
   а) тэхнікумы;
   б) інстытуты;
   в) прафесійна-тэхнічныя вучылішчы.

8) Манумент Перамогі ўзведзены ў Мінску:
   а) у 1945 годзе;
   б) у 1953 годзе;
   в) у 1954 годзе.

9) Хто ў прыведзеным спісе з'яўляецца касманаўтам, а хто — навукоўцам?
   а) Пётр Клімук;
   б) Міхаіл Ельяшэвіч;
   в) Уладзімір Кавалёнак;
   г) Мікалай Барысевіч;
   д) Алег Навіцкі.

**4.** Растлумачце наступныя словы і скарачэнні: *эканоміка, меліярацыя, «хрушчоўкі», МАЗ, ЭВМ*.

**5.** Правільна суаднясіце назвы літаратурных твораў і прозвішчы іх аўтараў.

| | |
|---|---|
| Янка Брыль | «Альпійская балада» |
| Іван Мележ | «Птушкі і гнёзды» |
| Васіль Быкаў | «Людзі на балоце» |
| Іван Навуменка | «Сасна пры дарозе» |
| Якуб Колас | «На ростанях» |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**6.** Назавіце прозвішчы аўтараў:

а) аповесці «Жураўліны крык»;

б) рамана «Людзі на балоце»;

в) рамана «Сасна пры дарозе».

**7.** Дапоўніце сказ.

*Руская мова з’яўлялася ў СССР і БССР ... мовай.*

**8.** Назавіце помнік, адлюстраваны на фатаграфіі. Чаму прысвечаны гэты манумент?





Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1960-х — СЯРЭДЗІНЕ 1980-х ГАДОЎ

## 24. Кіраўнікі рэспублікі ў другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў

1. Назавіце вядомых вам кіраўнікоў нашай рэспублікі. Чым яны вам запомніліся?
2. Што такое пяцігодка? Праверце па слоўніку.

У другой палове 1960-х — 1980-х гадах, як і раней, галоўную ролю ў жыцці краіны адыгрывала Камуністычная партыя Савецкага Саюза (КПСС). Планы пяцігодак прымаліся на з'ездах Камуністычнай партыі. У партыйных органах дзейнічалі аддзелы, якія кіравалі асобнымі галінамі эканомікі. Колькасць партыйных і дзяржаўных чыноўнікаў увесь час павялічвалася. Іх дзейнасць кантралявалася з Масквы. Таму кіраўнікамі рэспублік вельмі часта прызначаліся выхадцы з іншых рэспублік СССР.

У 1956 годзе Першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі (ЦК КПБ) стаў беларус Кірыл Трафімавіч Мазураў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён быў адным з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага і падпольнага руху. Гэты партыйны дзеяч унёс значны ўклад у аднаўленне гаспадаркі БССР. Акрамя шматлікіх партыйных пасад Мазураў у 1950—1979 гадах з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

Сярод партыйных кіраўнікоў вылучаўся Пётр Міронавіч Машэраў, які карыстаўся вялікай павагай усяго беларускага народа. Ён з 1965 па 1980 год узначальваў партыйную арганізацыю Беларусі. На пасаду Першага сакратара ЦК КПБ яго прапанавалі камуністы БССР. Пётр Міронавіч Машэраў вылучаўся дэмакратычнасцю і прастатой. Яшчэ ён карыстаўся вялікай павагай як кіраўнік партызанскай і падпольнай барацьбы. За гераізм у гады вайны яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Дзякуючы працы мільёнаў людзей пад кіраўніцтвам Машэрава БССР стала адной з перадавых рэспублік. З яго дзейнасцю звязаны значныя дасягненні ў развіцці беларускай эканомікі, навукі і культуры.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Кірыл Трафімавіч
Мазураў



Пётр Міронавіч
Машэраў



Ціхан Якаўлевіч
Кісялёў

Аднак і ён быў абмежаваны ў сваіх дзеяннях. Кіраўнікі рэспублік не мелі магчымасці самастойна прымаць прынцыповыя рашэнні, якія датычыліся жыцця іх народа. У прыватных гутарках Машэраў нярэдка выказваў незадаволенасць тым становішчам, якое склалася ў кіраванні партыяй і дзяржавай.

Адным з таленавітых кіраўнікоў быў і Ціхан Якаўлевіч Кісялёў. На працягу амаль 20 гадоў ён узначальваў Савет Міністраў БССР, пасля быў Першым сакратаром ЦК КПБ. Кісялёў выступіў ініцыятарам будаўніцтва Мінскага метрапалітэна. Ён загадаў узвесці на месцы Хатыні мемарыяльны комплекс, прысвечаны ўсім спаленым фашыстамі вёскам Беларусі.

**1.** Прадстаўнікі якой партыі займалі пасады кіраўнікоў у рэспубліцы?
**2.** Хто займаўся кіраваннем эканомікай?
**3.** Што вы даведаліся пра Пятра Міронавіча Машэрава?
**4.** Хто такі Кірыл Трафімавіч Мазураў?
**5.** Што ўзначальваў Ціхан Якаўлевіч Кісялёў?

**1.** Пра Кірыла Трафімавіча Мазурава з павагай гаварылі: «Асцярожны беларус. У жыцці і справах ён кіраваўся народнай мудрасцю: сем разоў адмерай — адзін раз адрэж. Залатая рыса нашага нацыянальнага характару! Яна дапамагла пазбегнуць вялікіх памылак…» У Мазурава неаднаразова ўзнікалі спрэчкі з кіраўніцтвам



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

краіны. Ён заўсёды абараняў інтарэсы простых людзей. Напрыклад, Мазураў выступіў з крытыкай ідэі аб’яднаць прысядзібныя ўчасткі ў калектыўныя гаспадаркі.

**2.** Пётр Міронавіч Машэраў (1918—1980) працаваў на Віцебшчыне, быў настаўнікам фізікі і матэматыкі. Калі пачалася вайна, Машэраў стаў адным з арганізатараў і кіраўнікоў падполля. Затым ён быў камандзірам партызанскага атрада, камісарам партызанскай брыгады. У 26 гадоў яго ўдастоілі звання Героя Савецкага Саюза. Машэраў карыстаўся вялікай павагай сярод насельніцтва Беларусі. Беларусь ганарыцца славутым сынам свайго народа. Памяць яго ўшанавана ў назве праспекта ў беларускай сталіцы. Яго імя носіць Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт.

## 25. Развіццё прамысловасці ў другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў

1. Што такое прамысловасць? Праверце па слоўніку.
2. Чым адрозніваюцца паміж сабой цяжкая і лёгкая прамысловасць? Параўнайце значэнні гэтых паняццяў з дапамогай слоўніка.
3. Што такое рэформа? Праверце па слоўніку.

У сярэдзіне 1960-х гадоў у развіцці прамысловасці СССР зноў узніклі цяжкасці. Эканомікай па-ранейшаму кіравалі партыйныя чыноўнікі. Працоўныя калектывы не прымалі актыўнага ўдзелу ў развіцці сваіх прадпрыемстваў. Для пераадолення гэтых і іншых негатыўных з’яў зноў была распрацавана эканамічная рэформа. Яна прадугледжвала ў першую чаргу пераўтварэнні ў кіраванні народнай гаспадаркай. Трэба было змяніць стаўленне самога працоўнага калектыву да вынікаў сваёй дзейнасці. Планавалася даць больш шырокія паўнамоцтвы прадпрыемствам у вырашэнні пытанняў уласнага развіцця. У працоўных калектывах мусілі ўлічваць, колькі сродкаў выдаткоўваецца на вытворчасць, колькі атрымоўваецца ад рэалізацыі прадукцыі. Трэба было клапаціцца аб прыбытку. У выніку ад гэтага залежала заработная плата кожнага працаўніка, а таксама магчымасць абнаўляць прадпрыемства сучасным абсталяваннем. Такім чынам, кожны павінен быў па-гаспадарску ставіцца да сваёй працы. На прадпрыем-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Беларускі металургічны завод у Жлобіне

ствах уводзіліся **гаспадарчы разлік**[1] і **самафінансаванне**[2]. Працоўныя калектывы пачалі клапаціцца аб тым, каб іх прадукцыя карысталася попытам у пакупнікоў і своечасова прадавалася. Патрабавалася самастойна вырашаць пытанні ўзаемадачыненняў паміж прадпрыемствамі, абмену прадукцыяй, заключаць узаемавыгадныя дагаворы. Атрыманыя грашовыя сродкі павінны былі выкарыстоўвацца для пашырэння вытворчасці і павышэння якасці прадукцыі, павелічэння заработнай платы працаўнікоў. Гэта азначала выкарыстанне элементаў **рыначнай эканомікі**[3]. Па падобных правілах працавалі замежныя прадпрыемствы. Іх дзейнасць цалкам залежала ад патрабаванняў рынку. Таму яны клапаціліся аб канкурэнтаздольнасці сваёй прадукцыі, каб прадпрыемства магло мець прыбытак і развівацца.

Рэформа пачалася ў верасні 1965 года. Прадпрыемствы сталі больш самастойнымі. Павялічылася зацікаўленасць рабочых у выніках працы.

[1] **Гаспада́рчы разлі́к (гасразлі́к)** — спосаб вядзення гаспадаркі, пры якім усе выдаткі на вытворчасць прадукцыі акупляюцца. Прадугледжваў зацікаўленасць працаўнікоў прадпрыемства ў павелічэнні аб'ёму і паляпшэнні якасці прадукцыі.
[2] **Самафінансава́нне** — незалежнае існаванне прадпрыемства за кошт самастойнага кіравання сваімі грашовымі сродкамі.
[3] **Ры́начная экано́міка** — гаспадаранне, пры якім змяншаецца ўплыў дзяржавы на справы прадпрыемстваў, павялічваецца асабістая зацікаўленасць працоўных у выніках сваёй дзейнасці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Найважнейшыя новыя прадпрыемствы БССР сярэдзіны 1960-х — першай паловы 1980-х гадоў

Станоўчыя вынікі рэформы праявіліся ў БССР амаль што адразу. Палепшылася работа прамысловасці. Было пабудавана больш за 70 новых буйных прадпрыемстваў. У іх ліку — Беларускі шынны камбінат у Бабруйску, нафтаперапрацоўчы завод у Мазыры, Беларускі металургічны завод у Жлобіне. У вытворчасці пачала выкарыстоўвацца робататэхніка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Па-ранейшаму адбываўся хуткі рост пераважна цяжкай прамысловасці. Яна выконвала неабходныя заказы, звязаныя з забеспячэннем ваеннай бяспекі СССР. У той жа час лёгкая прамысловасць, якая вырабляла спажывецкія тавары, працягвала заставацца другараднай галіной.

Аднак у перыяд і гэтай рэформы не змяніліся метады кіравання эканомікай. Як і раней, партыйныя органы вырашалі асноўныя пытанні гаспадарчага жыцця і пры гэтым не лічыліся з патрабаваннямі часу. Такім чынам, дадзеная рэформа мела некаторыя станоўчыя вынікі, але значна не паўплывала на агульны стан эканомікі дзяржавы. З сярэдзіны 1970-х гадоў развіццё прамысловасці зноў запаволілася.

*Табліца 3*

**Вынікі рэформы 1965 года ў прамысловасці**

| Станоўчыя | Адмоўныя |
|---|---|
| 1) Палепшылася работа прамысловых прадпрыемстваў;<br>2) пабудаваны новыя прадпрыемствы, пачаўся выпуск запатрабаванай прадукцыі;<br>3) пачала выкарыстоўвацца робататэхніка і іншыя дасягненні навукі і тэхнікі | 1) Апераджальны рост цяжкай прамысловасці ў параўнанні з лёгкай;<br>2) захаваліся камандныя метады кіравання прамысловасцю з боку партыйных органаў |

1. Чаму ўзнікла неабходнасць рэформы эканомікі?
2. Калі пачалася эканамічная рэформа?
3. Якія змены адбыліся ў стаўленні прадпрыемстваў да вынікаў сваёй дзейнасці? Знайдзіце адказ у тэксце.
4. Якія станоўчыя змены адбыліся ў прамысловасці Беларусі?
5*. Як вы лічыце, ці павінны працоўныя прадпрыемстваў клапаціцца аб выніках агульнай працы?
6*. Як вы разумееце паняцці «гаспадарчы разлік», «самафінансаванне», «рыначная эканоміка»?

Разгледзьце табліцу 3 уверсе і зрабіце высновы аб выніках рэформы:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

а) станоўчыя з’явы;
б) адмоўныя з’явы.

На картасхеме на с. 90 пакажыце месцы знаходжання найважнейшых прадпрыемстваў гэтага перыяду.

Даведайцеся, якім было развіццё вашага населенага пункта ў час эканамічнай рэформы.

## 26. Змены ў развіцці сельскай гаспадаркі ў другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў

1. Што азначае паняцце «меліярацыя»? Праверце па слоўніку.
2. Што станоўчага і адмоўнага было ў меліярацыі зямель?
3. Якія былі вынікі эканамічнай рэформы 1965 года? Выкарыстайце тэкст і табліцу 3 на с. 91.

У сакавіку 1965 года ў сельскай гаспадарцы таксама пачалася эканамічная рэформа. Перш за ўсё змяніўся парадак нарыхтоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Цяпер планы яе закупак дзяржавай складаліся на шэсць гадоў наперад. Зноў павышаліся нарыхтоўчыя цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю. За выраблена звыш плана калгасы маглі атрымаць дадатковыя прыбыткі. Гэта давала магчымасць палепшыць матэрыяльнае становішча сельскай гаспадаркі. З 1965 па 1969 год калгасам была перададзена вялікая колькасць трактароў, аўтамабіляў, шмат іншай тэхнікі і абсталявання.

Як і прамысловасць, сельская гаспадарка ў 1960—1970-я гады атрымала магчымасці для ўмацавання і пашырэння сваёй матэрыяльна-тэхнічнай базы. Гэта адбывалася перш за ўсё дзякуючы развіццю навукі і тэхнікі. Іх дасягненні ўсё больш шырока сталі выкарыстоўвацца ў сельскагаспадарчай вытворчасці. Пачалі распрацоўвацца і ўкараняцца больш дасканалыя тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур і жывёлагадоўлі.

Шырока выкарыстоўваліся дасягненні хімічнай прамысловасці. Значна павялічылася (амаль у 20 разоў) колькасць штучных угнаенняў. Уносіць іх у глебу і апрацоўваць палі хімікатамі пачалі пры дапамозе


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

авіяцыі. Вынікам гэтага стаў рост урадлівасці глебы і павелічэнне ўраджайнасці збожжавых культур. Працягвалася меліярацыя зямель і асушэнне балот, у выніку чаго плошча ворыўных зямель значна павялічылася. Аднак, з другога боку, гэта прыводзіла да ўзнікнення экалагічных праблем.



На калгасных палетках. Гомельская вобласць

Рэспубліку ў тыя гады ў народзе называлі «адкормачным цэхам Савецкага Саюза». Гэта было звязана з развіццём у БССР жывёлагадоўлі. Пачынаючы з канца 1960-х гадоў тут былі добра наладжаны адкорм буйной рагатай жывёлы, свіней, малочная жывёлагадоўля. Галоўнай задачай сельскай гаспадаркі з'яўлялася забеспячэнне насельніцтва буйны́х гарадоў СССР харчовымі прадуктамі. Вырашалася яна праз стварэнне прадпрыемстваў адзінага **аграпрамысловага комплексу (АПК)**[1].

У АПК не толькі вырошчвалася сельскагаспадарчая прадукцыя, але і дзейнічалі прадпрыемствы для яе перапрацоўкі. У розных раёнах рэспублікі былі пабудаваны буйны́я птушкафабрыкі, кароўнікі, свінарнікі, цяпліцы для гародніны. На гэтых жа сельскагаспадарчых прадпрыемствах дзейнічалі цэхі па перапрацоўцы сваёй прадукцыі: каўбасныя, кандытарскія, кансервавыя і іншыя. Каб забяспечыць насельніцтва прадуктамі харчавання, была распрацавана **Харчовая праграма**[2], прынятая ў ***1982 годзе***.

Тым не менш гэтыя пераўтварэнні закранулі не ўсе сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Самастойнасць сельскагаспадарчых вытворцаў абмяжоўвалася недахопам асабістых сродкаў (грошай). Сельская гаспадарка ў большай ступені развівалася за кошт дзяржаўнага бюджэту. Колькасць сродкаў, якія выдаткоўваліся на гэту галіну, увесь час павялічвалася. Але патрэбы рэспублікі ў прадукцыі сельскай гаспадаркі так і не былі задаволены. Знізіліся аб'ёмы вытворчасці шэрагу

[1] **Аграпрамысло́вы ко́мплекс (АПК)** — група прадпрыемстваў, якія займаюцца вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі і яе перапрацоўкай.
[2] **Харчо́вая прагра́ма** — праграма 1982 года, якая прадугледжвала забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

відаў неабходнай сельскагаспадарчай прадукцыі. Харчовае забеспячэнне насельніцтва на пачатак 1980-х гадоў нават пагоршылася. Такім чынам, неапраўданыя былі і выдаткі, якія накіроўваліся дзяржавай у гэтую галіну народнай гаспадаркі.

*Табліца 4*

**Вынікі рэформы 1965 года ў сельскай гаспадарцы**

| Станоўчыя | Негатыўныя |
|---|---|
| 1) Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы;<br>2) распрацоўка і выкарыстанне дасягненняў навукі і тэхнікі;<br>3) выкарыстанне дасягненняў хімічнай прамысловасці;<br>4) стварэнне аграпрамысловых комплексаў | 1) Існаванне вялікай колькасці гаспадарак за кошт дзяржаўнага бюджэту;<br>2) неапраўданае павелічэнне колькасці дзяржаўных сродкаў, выдаткаваных на падтрымку сельскай гаспадаркі;<br>3) выкарыстанне камандных метадаў кіравання сельскай гаспадаркай з боку партыйных органаў |

**1.** За кошт чаго стала магчымым паляпшаць паказчыкі сельскагаспадарчай вытворчасці? Адказ знайдзіце ў тэксце.
**2.** Што спрыяла павелічэнню ўрадлівасці глебы і ўраджайнасці збожжавых культур?
**3.** Як вы разумееце словы «адкормачны цэх Савецкага Саюза»?
**4.** Што такое аграпрамысловы комплекс?
**5.** З якой прычыны эканамічная рэформа сельскай гаспадаркі 1965 года пацярпела няўдачу? Выкарыстайце табліцу 4 уверсе.
**6*.** Якія мерапрыемствы вялі да пагаршэння экалагічнага становішча ў БССР?

**1.** Растлумачце, чым адрозніваецца аграпрамысловы комплекс ад калгаса. Як вы разумееце словаспалучэнне «аграпрамысловы комплекс»? Растлумачце кожную частку гэтага паняцця.

**2.** Разгледзьце табліцу 4 уверсе і зрабіце высновы аб выніках рэформы:

а) станоўчыя змены;

б) адмоўныя з’явы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 27. Дасягненні і недахопы ў развіцці народнай гаспадаркі рэспублікі ў другой палове 1960-х — пачатку 1980-х гадоў

1. Як вы разумееце выраз «дабрабыт насельніцтва»?
2. Што такое рэформа?
3. Чаму неабходна было праводзіць эканамічную рэформу?

Рэформы не прывялі да паляпшэння ў эканоміцы краіны. Як і раней, прамысловасць рэспублікі развівалася пераважна за кошт павелічэння колькасці прадпрыемстваў і рабочых. Прадукцыі выпускалася ўсё больш, але часта яна была нізкай якасці і не вытрымлівала канкурэнцыі з замежнымі таварамі.

Пасля эканамічнай рэформы 1965 года павялічыўся аб’ём будаўніцтва. Але яно было недастаткова механізавана. Доля ручной працы ў будаўніцтве складала больш за палову. Аб’екты (школы, жылыя дамы і іншае) нярэдка здаваліся з недахопамі, мелі нізкую якасць. Тэмпы будаўніцтва былі вельмі марудныя.

За гэты перыяд значна ўмацавала сваю матэрыяльна-тэхнічную базу сельская гаспадарка. Але, нягледзячы на гэта, яна развівалася таксама марудна. Гэта было звязана як з недахопамі кіравання, так і з неэфектыўным выкарыстаннем дзяржаўных сродкаў. Як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы захоўвалася цэнтралізаванае кіраванне. Гэта форма арганізацыі народнай гаспадаркі атрымала назву **«камандная эканоміка»**[1]. Кіраўніцтва знаходзілася далёка ад непасрэднай вытворчасці на прадпрыемстве ці ў сельскай гаспадарцы. Таму абставіны, якія складваліся на месцы, не ўлічваліся і неабходныя дзеянні не прадпрымаліся своечасова. Самі ж працоўныя калектывы не бралі на сябе адказныя рашэнні. Такое становішча не спрыяла развіццю гаспадаркі. Велізарныя сродкі, якія дзяржава выдаткоўвала на паляпшэнне стану сельскай гаспадаркі, выкарыстоўваліся не заўсёды дбайна. Вельмі часта яны ішлі на падтрымку тых калгасаў, якія дрэнна працавалі. Такія гаспадаркі атрымлівалі вялікія дзяржаўныя пазыкі,

[1] **Кама́ндная экано́міка** — эканамічная сістэма, у якой кіраванне народнай гаспадаркай ажыццяўляецца ўрадам дзяржавы ў адпаведнасці з цэнтралізаваным планаваннем.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

але пры гэтым не выконвалі дзяржаўнага плана. Іх эканоміка была стратнай. Каб падтрымаць такія калгасы, дзяржава па высокім кошце закупляла ў іх мяса, малако, збожжа. Прадаваліся ж гэтыя прадукты для насельніцтва па адносна нізкай цане. Такім чынам, краіна губляла вялікую колькасць дзяржаўных сродкаў. Калгасы ператварыліся ў даўжнікоў дзяржавы, але пры гэтым не маглі разлічыцца з ёй.

Такая з'ява была характэрная і для сельскай гаспадаркі, і для прамысловасці. Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы працягвалі існаваць шмат стратных прамысловых прадпрыемстваў.

Пры гэтым насельніцтва падтрымлівалася дзяржавай: яно мела магчымасць купляць тавары па нізкіх цэнах. Гэта спрыяла забеспячэнню людзей, бо заробкі ў працоўных былі даволі невялікія. Аднак доўга так працягвацца не магло. Колькасць прадпрыемстваў і калгасаў, якія сталі даўжнікамі дзяржавы, павялічвалася. Стан эканомікі краіны пагаршаўся.

Народная гаспадарка не паспявала і за патрэбамі насельніцтва, якія ўвесь час узрасталі. Напрыклад, вельмі павольна развівалася вытворчасць каляровых тэлевізараў. У сярэдзіне 1980-х гадоў у параўнанні з замежнымі краінамі адставала вытворчасць і выкарыстанне відэатэхнікі, персанальных камп'ютараў. Людзі дзесяцігоддзямі чакалі кватэр, устаноўкі хатніх тэлефонаў. Далёка не кожная сям'я мела аўтамабіль. Ён каштаваў вялікіх грошай, і да таго ж, каб яго набыць, людзі чакалі сваёй чаргі не адзін год.

У гэты перыяд была характэрная такая негатыўная з'ява, як **дэфіцыт**[1]. Людзі ўвесь час сутыкаліся з недахопам нават прадуктаў харчавання. Вялізныя чэргі ўтвараліся ў магазінах і за таварамі народнага спажывання (адзенне, абутак і іншае). Найбольшым попытам карысталіся тавары з-за мяжы. Айчынная прадукцыя таго часу не адпавядала патрабаванням насельніцтва, ды яе і не хапала.

Кіраўніцтва краіны зноў спрабавала палепшыць стан эканомікі праз рэформу. Аднак гэта не дало значных вынікаў. Па-ранейшаму галоўнай перашкодай на шляху паляпшэння стану народнай гаспадаркі была сістэма кіравання краінай і эканомікай. У такой сітуацыі людзі страчвалі давер да ўрада.

[1] **Дэфіцы́т** — адсутнасць альбо недастатковая колькасць тавараў ці паслуг.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Якімі былі вынікі рэформы 1965 года ў прамысловасці? Выкарыстайце табліцу 3 на с. 91.
2. Чаму рэформа не прывяла да змен у сельскай гаспадарцы? Адкажыце з дапамогай табліцы 4 на с. 94.
3. Ці забяспечвала народная гаспадарка патрэбы насельніцтва? Пацвердзіце свой адказ словамі тэксту.

Разам з настаўнікам паразважайце, што сведчыла аб узнікненні пэўных праблем у гаспадарцы БССР. Выкарыстайце схему.

**Прыкметы заняпаду ў эканоміцы БССР**

- Нізкі тэхнічны ўзровень станкоў, машын, абсталявання
- Ужыванне адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання
- Перавага колькасных паказчыкаў у развіцці эканомікі (большая колькасць прадпрыемстваў і працоўных на іх)
- Выдаткоўванне значных сродкаў на развіццё абароннай прамысловасці
- З'яўленне экалагічных праблем праз правядзенне меліярацыі і хімізацыі сельскай гаспадаркі
- Страты дзяржаўных сродкаў у выніку розніцы паміж высокай закупачнай і нізкай прадажнай цаной на сельскагаспадарчую прадукцыю

Пацікаўцеся ў дарослых, як жыла ваша сям'я ў той перыяд (ці мелі асобную кватэру, тэлефон і іншае).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 28. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гадоў

1. Якая палітычная партыя была галоўнай сілай у дзяржаўным жыцці СССР? Як яна ўплывала на грамадска-палітычнае жыццё краіны?
2. Што такое дэмакратычныя свабоды? Праверце значэнне гэтага паняцця па слоўніку.
3. Што такое рэпрэсіі? Праверце па слоўніку.
4. Як вы разумееце паняцце «свабода слова»? Праверце па слоўніку.

У кастрычніку 1964 года Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў быў зняты з пасады Першага сакратара Камуністычнай партыі (КПСС). Кіраўніком КПСС стаў Леанід Ільіч Брэжнеў. А з 1977 года ён займаў яшчэ і вышэйшую дзяржаўную пасаду ў краіне — **Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**[1]. Фактычна ён стаў кіраўніком усёй Савецкай дзяржавы.

Гады ўлады Брэжнева (1964—1982) атрымалі назву перыяду застою. Савецкі Саюз, у тым ліку і БССР, фактычна спыніўся ў сваім грамадска-палітычным развіцці. Лічылася, што ў краіне існуе дэмакратыя. Аднак дэмакратычныя свабоды, абвешчаныя ў **Канстытуцыі**[2] СССР і БССР, на самай справе мелі фармальны характар. У гэты час быў прыпынены разгляд спраў асуджаных людзей, якія сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій. Партыйныя органы па-ранейшаму працягвалі кантраляваць сродкі масавай інфармацыі. Яшчэ больш заўважнай зрабілася адсутнасць свабоды слова. Людзі выказвалі сваё стаўленне да ўсяго, што адбываецца ў краіне, толькі з дазволу партыйных чыноўнікаў. За грамадска-палітычным жыццём уважліва сачылі спецыяльныя органы. Уся ўлада фактычна была ў чыноўнікаў. Партыйныя кіраўнікі ўсё больш адрываліся ад жыцця народа. Пераважная іх частка не задумвалася, як на самай справе жывуць простыя людзі.

Разам з тым па-ранейшаму большасць насельніцтва давярала партыйным лідарам. Свае асабістыя імкненні простыя людзі звязвалі з будучыняй сваёй краіны. Пакуль адбывалася хоць і павольнае, але

[1] **Старшыня́ Прэзі́дыума Вярхо́ўнага Саве́та СССР** — вышэйшая дзяржаўная пасада ў Савецкім Саюзе. З 1977 года яе займаў кіраўнік Камуністычнай партыі.
[2] **Канстыту́цыя** — асноўны закон дзяржавы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ўсё ж павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва. Адносіны народа да палітыкі партыі былі прыхільнымі. Таму большасць людзей на той час не праяўляла палітычнай актыўнасці. У другой палове 1970-х гадоў рост дабрабыту насельніцтва замарудзіўся, а па многіх паказчыках і знізіўся. Людзі пачалі больш крытычна ставіцца да партыйных кіраўнікоў. Аднак свае думкі яны не выказвалі, баючыся рэпрэсій з боку ўлад.

Партыйнае кіраўніцтва працягвала ўплываць на асобу савецкага чалавека праз установы адукацыі і грамадскія арганізацыі. Яны выхоўвалі моладзь, якая цалкам падтрымлівала Камуністычную партыю і яе імкненне да будаўніцтва **камунізму**[1]. Значная роля ў гэтай справе надавалася Ленінскаму Камуністычнаму Саюзу Моладзі Беларусі (ЛКСМБ). Кожны малады чалавек зазвычай станавіўся камсамольцам. Камсамол у сваёй дзейнасці падпарадкоўваўся Камуністычнай партыі.

Асноўнай формай грамадскага жыцця насельніцтва БССР быў удзел у выбарах, прысвечаных дзяржаўным святам дэманстрацыях, шэсцях. Яны ладзіліся 1 мая (Свята працы), 7 лістапада (Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі), 9 мая (Дзень Перамогі). З вялікім размахам святкаваліся знамянальныя даты гісторыі партыі і дзяржавы.

Беларускі народ у гэтыя гады стаў паступова страчваць сваю нацыянальную самасвядомасць. Родная мова ўжывалася беларусамі абмежавана. Яна сустракалася пераважна ў літаратурнай дзейнасці і шэрагу сродкаў масавай інфармацыі. У СССР нацыянальная прыналежнасць людзей і іх нацыянальныя інтарэсы ўлічваліся недастаткова. Людзі розных нацыянальнасцей, якія былі грамадзянамі СССР, сталі агульна называцца савецкім народам. Гэта тычылася і грамадзян Беларусі.

У 1978 годзе была прынята новая Канстытуцыя БССР. Як і ў Канстытуцыі СССР, у ёй замацоўвалася кіруючая роля Камуністычнай партыі ў жыцці дзяржавы. Гэта сведчыла аб канчатковым аб’яднанні дзяржаўнага і партыйнага апаратаў кіравання. Вынікам стала прыняцце шэрагу неабгрунтаваных рашэнняў.

[1] **Камуні́зм** — грамадства, у якім усе людзі роўныя і няма прыватнай уласнасці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Помнік у Мінску «Сынам Айчыны, якія загінулі за яе межамі»

Найгоршыя наступствы мела ўвядзенне савецкіх войскаў у Афганістан у 1979 годзе. Гэты крок тлумачыўся неабходнасцю дапамогі суседняй краіне, дзе наспявала грамадзянская вайна. Амаль усе савецкія людзі на той момант падтрымалі палітыку партыі, бо выхоўваліся як **інтэрнацыяналісты**[1]. Яны добра ставіліся да людзей усіх нацыянальнасцей і былі гатовы ў любую хвіліну прыйсці на дапамогу. Але на самай справе ўвод савецкіх войскаў у іншую дзяржаву з'яўляўся ўмяшаннем у яе ўнутраныя справы. Некаторыя людзі былі супраць гэтага рашэння кіраўніцтва краіны. Аднак іх спробы заявіць свой пратэст не далі вынікаў.

1. Кіраўнік якой партыі займаў вышэйшую пасаду ў краіне — Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР? Адказ на пытанне знайдзіце ў тэксце вучэбнага дапаможніка.
2. Хто фактычна з'яўляўся кіраўніком усёй Савецкай дзяржавы? Адкажыце пры дапамозе тэксту параграфа.
3. Адкажыце на пытанні, дадзеныя ніжэй. Зрабіце выснову аб тым, ці мелі на самай справе савецкія грамадзяне ў 1960—1980-я гады дэмакратычныя свабоды.
   1) Якія сферы грамадскага жыцця кантралявалі партыйныя органы?
   2) Ці мог чалавек свабодна выказваць сваё стаўленне да таго, што адбываецца ў краіне?
4. Чаму людзі верылі кіраўнікам партыі?

**5*.** Як змянілася роля КПСС у жыцці савецкага грамадства пасля прыняцця новай Канстытуцыі БССР?

6. У чым праяўляўся інтэрнацыяналістычны характар грамадскага жыцця ў БССР?
7. Чаму савецкія людзі не выказалі адмоўнага стаўлення да вайны ў Афганістане?

[1] **Інтэрнацыяналі́ст** — чалавек, які выступае за сяброўства і ўзаемадапамогу паміж нацыямі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**8*.** Чаму мінулае нашай краіны гэтага перыяду мы разглядаем перш за ўсё праз гісторыю ўсяго Савецкага Саюза?

Разгледзьце фотаздымак на с. 100 і адкажыце, каму ўстаноўлены помнік на востраве на рацэ Свіслач. З якімі падзеямі звязаны гэты манумент?

Горам і болем адгукнулася ў сэрцах беларускіх жанчын — матуль, жонак ды сясцёр — гібель амаль васьмісот беларускіх воінаў у Афганістане. Спецыяльныя самалёты, што атрымалі назву «чорныя цюльпаны», у цынкавых трунах дастаўлялі на радзіму воінаў, якія страцілі жыццё на чужыне. Сярод іх — ураджэнец Пухавіцкага раёна старшы сяржант Мікалай Чэпік. Пры выкананні баявога задання ён трапіў у засаду і быў паранены. Каб не апынуцца ў палоне, Мікалай узарваў міну. Ён знішчыў праціўнікаў, але і сам загінуў. Яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У памяць аб усіх, хто загінуў у Афганістане, пастаўлены помнік-капліца воінам-афганцам. Ён знаходзіцца на невялічкім востраве на рацэ Свіслач, што працякае праз Мінск. Гэтае месца атрымала назву «Востраў мужнасці і смутку». Кожны год каля помніка на востраве збіраюцца былыя воіны, бацькі і родныя тых, хто загінуў у гэтай вайне.

## 29. Развіццё народнай адукацыі (1965—1985)

1. Успомніце, калі была ўведзена абавязковая 8-гадовая адукацыя.
2. Якія магчымасці атрымала моладзь у сувязі з увядзеннем абавязковай 8-гадовай адукацыі?

Для паспяховага будаўніцтва камунізму краіне патрэбны былі адукаваныя людзі. Народная адукацыя развівалася пад уплывам грамадска-палітычнага жыцця краіны.

У другой палове 1970-х гадоў у рэспубліцы школы перайшлі з абавязковага 8-гадовага да ўсеагульнага 10-гадовага навучання. Амаль усе выпускнікі 8-х класаў агульнаадукацыйнай школы працягвалі вучобу для атрымання сярэдняй адукацыі. Яны заставаліся ў школах (9, 10 класы) ці паступалі ў прафесійна-тэхнічныя вучылішчы (ПТВ).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Такім чынам, адбыўся пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Гэта прывяло да хуткага росту адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, і ў першую чаргу моладзі. Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі з’явіўся галоўным дасягненнем у развіцці народнай адукацыі.

Ва ўсіх школах пачала дзейнічаць кабінетная сістэма. Ствараліся кабінеты па розных прадметах: матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, гісторыі і іншых. Гэта дало магчымасць палепшыць якасць навучання па ўсіх вучэбных прадметах. У школах пашырылася выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання. Разам з атрыманнем адукацыі вучні рыхтаваліся да ўдзелу ў прадукцыйнай працы ў розных галінах народнай гаспадаркі. Практычныя навыкі навучэнцы атрымлівалі на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, міжшкольных вучэбна-вытворчых камбінатах, вучнёўскіх вытворчых брыгадах, школьных майстэрнях. Але былі і недахопы. Вучэбна-матэрыяльная база народнай адукацыі адставала, асабліва ў выкарыстанні камп’ютараў.

У 1970-я гады прафесійна-тэхнічныя вучылішчы пачалі рыхтаваць кваліфікаваных рабочых з сярэдняй адукацыяй. У 1985 годзе ў параўнанні з 1965 годам больш як у 3 разы павялічылася колькасць навучэнцаў у ПТВ.

Стала значна болей і спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. У рэспубліцы ў 1985 годзе дзейнічала больш за 30 вышэйшых навучальных устаноў (ВНУ). У іх навучалася да 200 тысяч студэнтаў. Гэта былі будучыя інжынеры, урачы, педагогі, юрысты, эканамісты і іншыя спецыя-




Беларускі дзяржаўны аграрна-тэхнічны ўніверсітэт (сучасная назва)



Адзін з карпусоў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (сучасная назва)



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лісты, патрэбныя для краіны. Найбуйнейшым сярод вышэйшых навучальных устаноў з'яўляўся Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Выпуск спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй павялічыўся з 1960 па 1985 год больш чым у 3 разы. Патрэбы рэспублікі ў неабходных кадрах спецыялістаў забяспечваліся амаль поўнасцю.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (сучасная назва)

Дзякуючы працы беларускіх вучоных на прадпрыемствах былі выкарыстаны новыя распрацоўкі. Напрыклад, сталі выпускацца станкі высокай дакладнасці. Выраблялася прадукцыя, неабходная для асваення космасу. Хуткімі тэмпамі развіваліся радыёэлектроніка і вылічальная тэхніка.

?

1. Якія змены адбыліся ў народнай адукацыі?
2. Як вы разумееце паняцце «ўсеагульная сярэдняя адукацыя»?
3. Колькі гадоў трэба было вучыцца, каб атрымаць сярэднюю адукацыю?
4. Што азначае «кабінетная сістэма ў школе»?
5. Якім чынам навучэнцы рыхтаваліся да працоўнай дзейнасці?
6. Якія змены адбыліся ў падрыхтоўцы працоўных кадраў?
7. Назавіце найбуйнейшую вышэйшую навучальную ўстанову БССР у гэты перыяд.
8. Якія ўстановы забяспечвалі патрэбы краіны ў спецыялістах з вышэйшай адукацыяй?

**9*.** Што з'явілася галоўным дасягненнем у развіцці народнай адукацыі ў 1965—1985 гадах?

**10*.** Якім чынам грамадскае жыццё людзей уплывае на развіццё адукацыі?

**1.** Даведайцеся пра развіццё сістэмы народнай адукацыі ў 1965—1985 гадах у вашай мясцовасці. Якія дзейнічалі вышэйшыя навучальныя ўстановы?

**2.** Якія прадметныя кабінеты існуюць сёння ў вашай школе? Колькі гадоў налічвае ваша школа? Ці носіць яна імя якога-небудзь славутага чалавека?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 30. Літаратура і мастацтва (1965—1985)

1. Якім падзеям прысвячалі свае творы беларускія пісьменнікі ў першыя гады пасля Вялікай Айчыннай вайны?
2. Якіх мастакоў Беларусі вы ведаеце?
3. У якім горадзе нарадзіўся і пачаў сваю творчую дзейнасць Марк Шагал?

Грамадска-палітычнае жыццё краіны цалкам фарміравала культуру гэтага перыяду. З канца 1960-х гадоў узмацніўся кантроль культуры з боку органаў Камуністычнай партыі Беларусі. Таму беларускія літаратары знаходзіліся ў даволі складаным становішчы. Ад іх патрабавалася ўслаўляць савецкага чалавека. Тыя творы, у якіх гэта адсутнічала, не дазвалялася выдаваць.

Нягледзячы на азначаныя складанасці, у другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гадоў з'явіліся сапраўды шчырыя творы. Яны адлюстроўвалі падзеі з жыцця савецкіх людзей, распавядалі пра факты, чалавечыя ўзаемаадносіны, пачуцці, характары.

Вядучай тэмай заставаліся гераічныя старонкі Вялікай Айчыннай вайны. Плённа ў гэтым напрамку працавалі Іван Шамякін, Іван Навуменка. Падзеі вайны найбольш яскрава адлюстраваліся ў творах «Мёртвым не баліць» (1965), «Сотнікаў» (1970), «Знак бяды» (1982) Васіля Быкава. Уклад гэтага славутага пісьменніка ў беларускую літаратуру быў адзначаны прысваеннем яму звання Героя Сацыялістычнай Працы.

У гэты перыяд выйшла «Хатынская аповесць» Алеся Адамовіча. Зверствы фашыстаў на беларускай зямлі апісаны ў дакументальнай кнізе Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка «Я з вогненнай вёскі».

У 1974 годзе Кандрат Крапіва напісаў сатырычную камедыю «Брама неўміручасці». Аўтар быў удастоены Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы.

Значным дасягненнем беларускай савецкай літаратуры стаўся цыкл раманаў Івана Мележа «Палеская хроніка».

З'явіліся літаратурныя творы на тэмы рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны. Выйшлі ў свет аповесці Івана Шамякіна «Браняпоезд», «Та-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

варыш Ленін», «Лёс майго земляка». Пятрусь Броўка выдаў зборнік прозы «Разам з камісарам». Былі надрукаваны раманы Івана Шамякіна «Атланты і карыятыды», «Вазьму твой боль». У 1981 годзе Івану Шамякіну прысвоілі званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У гэтыя часы прайшлі творчае сталенне і набылі вядомасць такія беларускія літаратары, як Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч і іншыя.

Беларуская літаратура пачала звяртацца і да гістарычнай спадчыны нашай Айчыны. Так, у рамане Уладзіміра Караткевіча «Чорны замак Альшанскі» мудрагеліста спалучаюцца мінулае і сучаснае. Паводле гэтага твора і рамана «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча створаны мастацкія фільмы. Яны былі зняты на кінастудыі «Беларусьфільм».

У 1970-я гады кінастудыя «Беларусьфільм» выпусціла шэраг фільмаў, прысвечаных ваеннай тэматыцы. Найвядомейшыя з іх — «Альпійская балада» паводле аповесці Васіля Быкава (рэжысёр Барыс Сцяпанаў), тэлесерыял «Руіны страляюць» (рэжысёр Віталь Чацверыкоў).

Развівалася і музычнае мастацтва Беларусі. Былі створаны оперы Юрыя Семянякі «Зорка Венера», Дзмітрыя Смольскага «Сівая легенда», балеты Яўгена Глебава «Альпійская балада» і «Курган». У Беларусі і далёка за яе межамі вядома творчасць славутых «Песняроў» пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна. Гэты ансамбль спяваў народныя песні на беларускай мове ў сучаснай апрацоўцы. «Песняры» карысталіся вялікай папулярнасцю, збіралі на свае



Кандрат Крапіва



Міхаіл Савіцкі



Васіль Быкаў



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



«Песняры»

канцэрты поўныя залы слухачоў, незалежна ад месца выступлення. Дзякуючы іх творчасці Беларусь і яе культуру сталі ведаць у розных краінах свету. І ў наш час славутыя «Песняры» застаюцца любімымі выканаўцамі не аднаго пакалення беларусаў. Іх шануюць не толькі ў Беларусі, але і ў многіх іншых краінах.

У беларускім выяўленчым мастацтве ў гэты час адной з галоўных заставалася тэма мінулай вайны. Былі створаны палотны «Пакаранне смерцю», «Партызанская мадонна» Міхаіла Савіцкага.

Адзін з лепшых мастакоў Беларусі — Міхаіл Савіцкі (1922—2010). Трапіўшы ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў нямецкі палон, мастак прайшоў праз цяжкія выпрабаванні ў фашысцкіх канцлагерах. Як напамін пра тое на яго руцэ назаўсёды застаўся нумар вязня. Гэтым таленавітым мастаком была створана серыя карцін пад назвай «Лічбы на сэрцы». Яны прысвечаны вязням фашысцкіх лагераў смерці.



Помнік Янку Купалу ў Мінску. Скульптары *Анатоль Анікейчык, Леў Гумілеўскі, Андрэй Заспіцкі*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Значныя дасягненні былі і ў манументальным мастацтве Беларусі. Калектыў архітэктараў і скульптар Сяргей Селіханаў у ***1969 годзе*** стварылі мемарыяльны комплекс «Хатынь». У тым жа годзе быў узведзены Курган Славы (скульптары Андрэй Бембель і Анатоль Арцімовіч). Сярод іншых твораў манументальнага мастацтва асабліва вылучаецца комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», адкрыты ў ***1971 годзе***. У 1972 годзе Заірам Азгурам узведзены помнік Якубу Коласу і скульптурныя групы, прысвечаныя літаратурным героям твораў пісьменніка. Анатоль Анікейчык, Леў Гумілеўскі і Андрэй Заспіцкі ў гэтым жа годзе стварылі помнік Янку Купалу.

1. Якія тэмы былі галоўнымі ў творчасці дзеячаў беларускай культуры другой паловы 1960-х — першай паловы 1980-х гадоў?
2. Назавіце імёны і творы найбольш вядомых дзеячаў беларускай культуры таго часу.
3. Пералічыце галоўныя дасягненні ў беларускім манументальным мастацтве.
4. Якія мастацкія кінастужкі па творах беларускіх пісьменнікаў былі створаны на кінастудыі «Беларусьфільм»?
5. Назавіце творы беларускага музычнага мастацтва.
6. Якімі былі ўмовы для творчай працы?
7. Што вы ведаеце пра Міхаіла Савіцкага? Як лёс мастака паўплываў на яго творчасць?

**1.** Народны пісьменнік Беларусі, грамадскі дзеяч Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 года ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы. У 1941 годзе адправіўся добраахвотнікам на фронт. Прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну. Стаў афіцэрам Савецкай Арміі. Быў двойчы паранены. Яго бацькі атрымалі паведамленне, што сын загінуў. Нават імя будучага славутага пісьменніка змясцілі на абеліску на месцы пахавання. Але ён уцалеў, цудам застаўся ў жывых. Калі вярнуўся з вайны, у сваіх творах праўдзіва апісваў вайну, перажыванні чалавека, звязаныя з ёю. Творы Васіля Быкава на тэму Вялікай Айчыннай вайны перакладзены больш чым на 50 моў свету. Праз іх людзі пазнаюць праўду аб жудаснай вайне.

Памёр Васіль Уладзіміравіч Быкаў 22 чэрвеня 2003 года.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** З мастацкай культурай Беларусі звязаны пачатак творчасці Марка Шагала. Ён нарадзіўся ў 1887 годзе ў Віцебску, вырас у простай шматдзетнай сям'і. У 19 гадоў юнак паступіў у прыватную школу мастака Іегуды Пэна. Яго настаўнік так уразіўся талентам свайго вучня, што дазволіў яму наведваць заняткі бясплатна. Малады мастак пачаў маляваць усё, што акаляла яго ў родных мясцінах. На яго палотнах можна ўбачыць простых жыхароў Віцебска, драўляныя дамы, гандлёвыя лаўкі, свойскіх жывёл і іншае.

Ён пражыў доўгае жыццё, але, на жаль, не на Радзіме. У 1923 годзе ён з'ехаў у Францыю. Аднак вобразы роднага Віцебска назаўсёды захаваліся ў яго творчасці. Марк Шагал памёр у 1985 годзе. Прызнанне ў сябе на радзіме мастак атрымаў толькі праз многія гады. Сёння ў Віцебску існуе Дом-музей Марка Шагала. Яго наведваюць беларусы і госці нашай краіны.

## 31. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «БССР у другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў» (параграфы 24—30)

**1.** Выберыце правільны варыянт адказу. Выкарыстайце тэкст параграфаў, слоўнік тэрмінаў і паняццяў і табліцу «Асноўныя гістарычныя даты» ў канцы вучэбнага дапаможніка.

1) Развіццё эканомікі было звязана:
   а) з павышэннем якасных паказчыкаў;
   б) з павелічэннем колькасці прадпрыемстваў і працоўных.

2) Эканамічная рэформа пачалася:
   а) у 1957 годзе;
   б) у 1965 годзе;
   в) у 1982 годзе.

3) Харчовая праграма была прынята:
   а) у 1957 годзе;
   б) у 1965 годзе;
   в) у 1982 годзе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4) Экалагічныя праблемы ў Беларусі звязаны:
   а) з хімізацыяй;
   б) з меліярацыяй;
   в) з жывёлагадоўляй.

5) Назавіце, хто з кіраўнікоў рэспублікі быў Героем Савецкага Саюза:
   а) Кірыл Трафімавіч Мазураў;
   б) Пётр Міронавіч Машэраў;
   в) Ціхан Якаўлевіч Кісялёў.

6) Усеагульная абавязковая 10-гадовая адукацыя была ўведзена:
   а) у 1959 годзе;
   б) у 1965 годзе;
   в) у другой палове 1970-х гадоў.

**2.** Растлумачце паняцці і скарачэнні: *рыначная эканоміка, самафінансаванне, гаспадарчы разлік, аграпрамысловы комплекс, хімізацыя, АПК, ПТВ, ВНУ*. Праверце сябе па слоўніку.

**3.** Назавіце асноўныя праблемы ў развіцці эканомікі краіны ў 1960—1980-я гады. Выкарыстайце схему на с. 97.

**4.** Правільна суаднясіце назвы твораў і іх аўтараў.

| | |
|---|---|
| «Знак бяды» | Уладзімір Караткевіч |
| «Хатынская аповесць» | Васіль Быкаў |
| «Чорны замак Альшанскі» | Алесь Адамовіч |
| Помнік Якубу Коласу ў Мінску | Міхаіл Савіцкі |
| «Лічбы на сэрцы» | Заір Азгур |
| «Зорка Венера» | Юрый Семяняка |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1980-х — ПАЧАТКУ 1990-х ГАДОЎ

## 32. Чарнобыльская трагедыя

1. Што выпрацоўвае атамная электрастанцыя?
2. Ці ведаеце вы пра наступствы аварыі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі?
3. Што вы ведаеце пра радыенукліды?
4. На школьнай карце Еўропы знайдзіце тэрыторыю, дзе знаходзіцца Чарнобыльская атамная электрастанцыя. У якім напрамку ад Беларусі яна размешчана?

Нечаканая бяда прыйшла на беларускую зямлю 26 красавіка 1986 года. На Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі ва Украіне здарылася аварыя. На адным з **ядзерных рэактараў**[1] станцыі адбыўся выбух. У выніку рэактар быў амаль поўнасцю знішчаны. У паветра ўзнялося вялікае воблака пылу. Яно было забруджана радыеактыўнымі рэчывамі. Увесь гэты пыл асеў на зямлю. Прыкладна 70 % плошчы, забруджанай радыяцыяй, належала тэрыторыі Беларусі.



Чарнобыльская атамная электрастанцыя

[1] **Я́дзерны рэа́ктар** — найбольш небяспечнае месца на атамнай электрастанцыі, дзе выпрацоўваецца атамная энергія.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Радыеактыўнае забруджванне тэрыторыі Беларусі

У асабліва цяжкім становішчы апынулася насельніцтва паўднёвага ўсходу Беларусі. А гэта больш за 2 мільёны чалавек — прыкладна кожны пяты жыхар рэспублікі. Сярод іх было амаль 500 тысяч дзяцей і падлеткаў ва ўзросце да 17 гадоў. Пятая частка тэрыторыі рэспублікі аказалася забруджанай радыенуклідамі. Гэта было вельмі небяспечна для людзей. Каб выратаваць іх жыццё, было прынята рашэнне аб перасяленні жыхароў з найбольш забруджаных раёнаў. З гэтых тэрыторый на новае месца жыхарства за 1986—1992 гады пераехалі больш за 135 тысяч чалавек. Многія населеныя пункты Беларусі ў 30-кіламетровай зоне ад рэактара цалкам апусцелі. Там, дзе раней жылі людзі, працавалі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Пакінуты населены пункт

магазіны, бальніцы, школы, дзіцячыя садкі, розныя ўстановы і прадпрыемствы, цяпер стала бязлюдна і маўклівa.

Для перасяленцаў было пабудавана шмат жылля, сацыяльных аб’ектаў у чыстых раёнах краіны. На гэта дзяржава выдаткавала значныя грашовыя сродкі.

У выніку аварыі Беларусь панесла велізарныя матэрыяльныя страты. Эканамічнае становішча рэспублікі рэзка пагоршылася. З таго часу 20 % сельскагаспадарчых зямель і 22 % лясоў былі вельмі забруджаныя. На гэтай тэрыторыі нельга было вырошчваць сельскагаспадарчыя культуры, займацца жывёлагадоўляй, весці нарыхтоўку драўніны. Неабходна было праводзіць розныя мерапрыемствы па ліквідацыі вынікаў аварыі, у тым ліку аднаўляць забруджаную зямлю.

Чарнобыльская аварыя мела цяжкія наступствы для здароўя людзей. Неабходна было будаваць новыя ўстановы аховы здароўя. У іх размяшчаліся самыя сучасныя тэхнічныя сродкі для дыягностыкі і лячэння людзей, пацярпелых ад катастрофы.

У рэспубліцы ў 1989 годзе была прынята Дзяржаўная праграма па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэтая праграма была распрацавана на доўгі тэрмін. У 1991 годзе ўрад краіны прыняў спецыяльны закон, накіраваны на сацыяльную падтрымку людзей, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы.

Пераадольваць вынікі аварыі Беларусь вымушана была ў асноўным за кошт сваіх уласных сродкаў. Таму выдаткі на рэалізацыю чар-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нобыльскай праграмы ў 1991 годзе склалі больш за 22 % **дзяржаўнага бюджэту**[1] рэспублікі.

Сёння асаблівая ўвага надаецца медыцынскаму абслугоўванню і сацыяльнай абароне дзяцей. Распрацавана праграма аховы іх здароўя, дзейнічае Беларускі камітэт «Дзеці Чарнобыля» і іншыя грамадскія арганізацыі. За здароўем дзяцей пільна сочаць урачы. Пабудаваны сучасныя анкалагічныя цэнтры ў Гомелі, Бараўлянах пад Мінскам. Аднак для поўнага пераадолення наступстваў аварыі патрабуецца яшчэ шмат сродкаў і намаганняў з боку як кіраўніцтва Беларусі, так і ўсяго яе народа.

1. Калі адбылася аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі?
2. Якія страты панесла эканоміка краіны ў сувязі з аварыяй?
3. Раскажыце пра мерапрыемствы, здзейсненыя для абароны людзей ад уздзеяння радыяцыі.
4. Як аварыя адбілася на здароўі насельніцтва Беларусі?
5. Што было зроблена ў краіне для аховы здароўя людзей пасля аварыі?
6. Чаму асаблівая ўвага надаецца ахове здароўя дзяцей?

Разгледзьце картасхему радыеактыўнага забруджвання тэрыторыі Беларусі на с. 111. З дапамогай настаўніка прасачыце напрамак уздзеяння радыенуклідаў на тэрыторыю Беларусі.

Даведайцеся, якім чынам аварыя на Чарнобыльскай атамнай станцыі закранула тую мясцовасць, дзе вы жывяце. Ці пацярпела ваша сям’я або знаёмыя вам людзі ад чарнобыльскай бяды?

Полымя, якое ўзнікла на адным з блокаў Чарнобыльскай АЭС, змаглі стрымаць цаной самаадданай працы пажарнікаў. Непасрэдны ўдзел у тушэнні браў ратаўнік з горада Брагіна Васіль Ігнаценка. Ён атрымаў смяротную дозу радыяцыі і памёр. 25-гадовы герой быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Яму ўзведзены помнік у Брагіне.

[1] **Дзяржа́ўны бюджэ́т** — размеркаванне даходаў і выдаткаў дзяржавы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 33. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1980-х — 1990-х гадах

1. Як праходзілі выбары ў БССР у 1950—1970-х гадах?
2. Якое месца займала Камуністычная партыя ў грамадска-палітычным жыцці краіны?
3. Як насельніцтва ставілася да сітуацыі ў краіне? Чаму?
4. Што такое дэмакратычныя свабоды?

У 1985 годзе новым кіраўніком КПСС стаў Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў. Як ужо ўсталявалася ў СССР, кіраўнік партыі з'яўляўся кіраўніком дзяржавы. Партыяй быў абвешчаны курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і дэмакратызацыю грамадска-палітычнага жыцця. Гэты курс атрымаў назву **перабудовы**[1]. Народ падтрымаў намаганні партыі. Аднак вывесці краіну на шлях устойлівага развіцця, спыніць адмоўныя працэсы, якія адбываліся ў эканоміцы, не ўдавалася. Кіраўніцтва дзяржавы не спраўлялася з цяжкім становішчам, у якім апынулася краіна.

Нарастала палітычная актыўнасць людзей. Яны патрабавалі змен у грамадска-палітычным жыцці. Камуністычная партыя страчвала аўтарытэт у грамадстве і ўжо не магла, як раней, выконваць свае функцыі кіравання дзяржавай.

Каб пашырыць ролю людзей у жыцці грамадства, у лютым 1988 года быў прыняты Закон Беларускай ССР «Аб народным абмеркаванні важных пытанняў дзяржаўнага жыцця Беларускай ССР». У 1989 годзе адбыліся выбары народных дэпутатаў СССР. Грамадзяне ўпершыню ўдзельнічалі ў **свабодных і дэмакратычных выбарах**[2].

У сакавіку 1990 года згодна з новым выбарчым законам і ў Беларусі былі праведзены выбары народных дэпутатаў у Вярхоўны і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў. Прыхільнікі пераўтварэнняў арганізавалі ў Вярхоўным Савеце асобную групу людзей — **апазіцыю**[3]. Першапа-

[1] **Перабудо́ва** — назва перыяду ў гісторыі СССР і БССР з 1986 года, звязанага з маштабнымі пераўтварэннямі ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці.

[2] **Вы́бары свабо́дныя і дэмакраты́чныя** — магчымасць выбіраць з некалькіх кандыдатаў у дэпутаты аднаго, найбольш вартага.

[3] **Апазі́цыя** — група людзей (палітычных дзеячаў), якія супрацьстаяць уладзе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

чаткова яна актыўна падтрымала станоўчыя змены ў грамадска-палітычным жыцці.

Дасягненнем перабудовы, якая працягвалася з ***1986*** па ***1991 год,*** стала **галоснасць**[1]. З'явілася магчымасць адкрыта выказваць уласныя погляды на гісторыю краіны і яе сучаснасць.

У краіне пачаліся дэмакратычныя змены. З'явілася шмат новых грамадскіх і палітычных партый, аб'яднанняў, саюзаў. Такім чынам, сведчаннем дэмакратычных пераўтварэнняў у грамадстве стала **шматпартыйнасць**[2].

Камуністычная партыя, аднак, імкнулася захаваць сваё кіруючае становішча. Гэта яшчэ больш ускладніла развіццё Савецкай краіны ў канцы 1980-х гадоў. Пераадолець складанасці шляхам перабудовы не атрымалася.



1. Чаму ў краіне была абвешчана перабудова?
2. Як можна растлумачыць сэнс слова «перабудова»?
3. Кім быў распачаты курс на перабудову?
4. Якія змены адбыліся ў парадку правядзення выбараў у канцы 1980-х гадоў?
5. Як вы разумееце, што такое «галоснасць»?
6. Што азначае слова «шматпартыйнасць»?
7. Чаму кіраўнікі Камуністычнай партыі не хацелі стварэння новых палітычных партый?

**8*.** У чым асаблівасць свабодных і дэмакратычных выбараў?



З дапамогай схемы на с. 116 раскажыце пра кірункі дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1980-х гадоў.



У СССР народ быў фактычна пазбаўлены дэмакратычных правоў. Існавала толькі адна партыя — Камуністычная. У другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў грамадзяне атрымалі магчымасць рэалізаваць свае дэмакратычныя правы. Таму людзі пачалі ствараць розныя грамадскія аб'яднанні, рухі, саюзы, палітычныя партыі.



[1] **Гало́снасць** — адкрытасць у дзейнасці дзяржаўных устаноў і свабода інфармацыі для ўсіх членаў грамадства.

[2] **Шматпарты́йнасць** — існаванне розных грамадскіх і палітычных партый, аб'яднанняў, саюзаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Напрамкі дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця БССР у другой палове 1980-х гадоў**

- Абвяшчэнне перабудовы ў грамадскім жыцці
- Галоснасць
- Правядзенне свабодных і дэмакратычных выбараў
- З’яўленне апазіцыі і новых партый

Прыхільнікі Камуністычнай партыі выступалі супраць шматпартыйнасці. Грамадства таксама аказалася не зусім падрыхтаваным да такіх змен.

Нягледзячы на гэта, у Беларусі з сярэдзіны 1980-х да пачатку 1990-х гадоў узнікла больш за дзесяць палітычных партый. Сярод іх былі Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Аб’яднаная дэмакратычная партыя Беларусі, Нацыянальна-дэмакратычная партыя беларусаў, Хрысціянска-дэмакратычны выбар і іншыя.

## 34—35. Нарастанне цяжкасцяў у эканоміцы (1986—1991). Пошукі шляхоў пераходу Беларусі да рыначных адносін

1. Чаму пагаршалася эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове 1980-х гадоў?
2. Што такое «камандная эканоміка»? Праверце сябе па слоўніку.
3*. Што рабілася для пераадолення спаду ў эканамічным развіцці?
4. Як вы разумееце паняцці «гаспадарчы разлік» і «самафінансаванне»? Праверце сябе па слоўніку.
5. Што такое «рыначная эканоміка»? Праверце сябе па слоўніку.
6. Ці залежыць дабрабыт людзей ад стану эканомікі?

Стан эканомікі СССР у сярэдзіне 1980-х гадоў стаў пагаршацца. Многія вучоныя-эканамісты і передавыя палітыкі краіны разумелі неабходнасць карэнных пераўтварэнняў у эканоміцы і грамадстве. Аднак



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

канкрэтных шляхоў выйсця з цяжкага эканамічнага становішча не было распрацавана. Першапачаткова планавалася палепшыць кіраванне эканомікай. Разам з тым неабходна было павысіць самастойнасць і актыўнасць прадпрыемстваў і іх працоўных калектываў. Дзеля гэтага была распачата чарговая эканамічная рэформа. Яна пачалася ў 1987 годзе.

Аб пераходзе да рыначнай эканомікі пакуль нічога не гаварылася. Выйсце бачылася ў тым, каб прадпрыемствы самі зараблялі грошы і не мелі патрэбы ў падтрымцы з боку дзяржавы. Такім чынам адбыўся пераход да самафінансавання і гаспадарчага разліку. Гэта стала пачаткам эканамічнай рэформы.

Было вырашана стварыць новую сістэму кіравання эканомікай краіны. Яна павінна была стаць пераходнай: ад цэнтралізаванай, каманднай сістэмы кіравання да дэмакратычнай — кіравання з удзелам прадпрыемства. Гэта азначала, што будуць існаваць разам планавае цэнтралізаванае кіраўніцтва і самакіраванне прадпрыемстваў.

У канцы 1980-х гадоў у БССР на такіх умовах працавалі сельская гаспадарка, транспарт, гандаль, большасць будаўнічых арганізацый, уся прамысловасць. Распрацавана была і новая сістэма кіраўніцтва народнай гаспадаркай.

Асноўнай мэтай эканамічных змен з'яўлялася забеспячэнне выпуску прадукцыі высокай якасці і надзейнасці. Каб купляць яе маглі і за мяжой, патрэбна было своечасова абнаўляць яе ў адпаведнасці з патрабаваннямі спажыўцоў. Мусіла выпускацца **канкурэнтаздольная прадукцыя**[1]. Для гэтага была ўведзена кантрольная служба — **дзяржаўная прыёмка**[2]. Яна павінна была сачыць за тым, каб на прадпрыемстве выраблялася толькі якасная прадукцыя.

Аднак чаканых вынікаў эканамічная рэформа не дала. Спад тэмпаў вытворчасці працягваўся. Гэта адмоўна адбілася на дабрабыце людзей. Для забеспячэння насельніцтва харчовымі прадуктамі ў канцы 1980-х гадоў былі ўведзены талоны. Талоны са спісам неабходных прадуктаў харчавання выдаваліся па колькасці членаў сям'і. Для таго каб купіць прадукты, трэба было не толькі заплаціць грошы, але і аддаць адпа-

[1] **Канкурэнтаздóльная прадýкцыя** — прадукцыя, якая мае высокую якасць і лепей прадаецца спажыўцам.
[2] **Дзяржáўная прыёмка** — кантроль дзяржавы за якасцю прадукцыі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ведны талон. Апрача прадуктовых з’явіліся талоны і на некаторыя віды спажывецкіх тавараў.

У 1990 годзе эканамічнае развіццё ў СССР, а значыць і ў нашай рэспубліцы, яшчэ больш запаволілася. Таму Вярхоўны Савет і ўрад рэспублікі прынялі рашэнне аб паступовым пераходзе да рыначных адносін паміж вытворцамі. Больш за тое, пры гэтым у ролі рэгулятара рыначных адносін выступіла сама дзяржава.

Пры пераходзе да рыначнай эканомікі непазбежна адбываецца спад вытворчасці, паніжэнне ўзроўню жыцця людзей і іншыя негатыўныя з’явы. Каб вывесці эканоміку на шлях развіцця, іх неабходна спыніць. Таму пачалася распрацоўка праграмы, неабходнай для правядзення рыначнай эканамічнай рэформы ў Беларусі.

Былі прыняты законы аб **арэндзе**[1]**, індывідуальнай дзейнасці**[2]**, прыватызацыі**[3].

Паступова сталі развіваць дзейнасць **індывідуальныя прадпрымальнікі (ІП)**[4]. Яны пачалі прадаваць і нават вырабляць некаторыя тавары і аказваць паслугі насельніцтву. З’явілася таксама шмат банкаўскіх камерцыйных структур. Цяпер кіраўнікі сваімі ўказамі не стрымлівалі цэны на прадукты і тавары. Яны паступова павінны былі самі ўсталёўвацца згодна з патрабаваннямі рынку. Кіраўніцтва краіны было перакanana ў тым, што пераход да рыначных адносін — адзіная магчымасць ажыццявіць эканамічную рэформу.

Пачала праводзіцца прыватызацыя. Некаторыя дзяржаўныя прадпрыемствы пераходзілі ў прыватную ўласнасць. Уласнік быў зацікаўлены ў развіцці прадпрыемства, у працы кваліфікаваных спецыялістаў і выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі.

Даволі марудна ажыццяўляліся пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы. Яны былі накіраваны на змякчэнне кіравання калгасамі

[1] **Арэ́нда** — уладанне маёмасцю ці выкарыстанне яе за плату, устаноўленую дагаворам.

[2] **Індывідуа́льная дзе́йнасць** — грамадска карысная дзейнасць чалавека па вытворчасці тавараў ці аказанні платных паслуг, не звязаная з дзяржаўнымі прадпрыемствамі ці іншымі ўстановамі.

[3] **Прыватыза́цыя** — перадача ці продаж у прыватную ўласнасць часткі дзяржаўнай маёмасці.

[4] **Індывідуа́льны прадпрыма́льнік (ІП)** — асоба, якая афіцыйна займаецца індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасцю — гандлем, аказаннем паслуг і іншым.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

з боку дзяржавы. Але, нягледзячы на гэта, стан сельскай гаспадаркі пагаршаўся.



Фермерская гаспадарка

У гэтых умовах стаў неабходным пераход да разнастайных формаў і спосабаў гаспадарання на зямлі. У 1990 годзе ў Беларусі быў прыняты Закон «Аб уласнасці ў БССР». Паводле яго зямля ўжо магла знаходзіцца ў прыватнай уласнасці. Пачалі стварацца **фермерскія гаспадаркі**[1]. Але і іх развіццё ішло вельмі павольна.

1. Чаму ў сярэдзіне 1980-х гадоў з'явілася неабходнасць карэнных пераўтварэнняў у эканоміцы і грамадстве?
2. На якіх умовах у 1988 годзе ў БССР працавалі сельская гаспадарка, транспарт, гандаль, большасць будаўнічых арганізацый, уся прамысловасць? Адкажыце з дапамогай тэксту параграфа.
3. Што з'яўлялася асноўнай мэтай эканамічных змен?
4. Як вы разумееце словы «канкурэнтаздольная прадукцыя»? Праверце сябе па слоўніку.
5. Для чаго на прадпрыемствах быў уведзены кантроль за якасцю прадукцыі? Як ён называўся? Праверце сябе па слоўніку.
6. Як ажыццяўляліся пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы?
7. Што такое фермерская гаспадарка?

**8*.** Што азначае паняцце «рынчная эканоміка»? Праверце сябе па слоўніку.

**9*.** Калі пачаўся пераход да рынкавых адносін у эканоміцы БССР?

**10*.** Якую ролю адыгрывала дзяржава ў пераходзе да рынкавых адносін у эканоміцы? Знайдзіце адказ у тэксце параграфа.

З дапамогай схемы на с. 120 адкажыце, што змянілася ў эканамічным становішчы Беларусі ў другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў.

У пачатку 1990-х гадоў значна павялічыліся цэны на пераважную большасць тавараў і паслуг. Пры гэтым відавочным быў **спад вы-**

[1] **Фе́рмерская гаспада́рка** — прыватнае прадпрыемства, якое займаецца вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**творчасці**[1]. Акрамя гэтага ўзмацнілася **інфляцыя**[2]. Грошы абясцэньваліся, і за іх ужо нельга было купіць такую колькасць тавараў, як раней. У выніку жыццёвы ўзровень насельніцтва знізіўся ў некалькі разоў. Акрамя таго, у магазінах не хапала тавараў. Людзі былі вымушаны доўгі час стаяць у велізарных чэргах, каб набыць прадукты харчавання або іншыя неабходныя рэчы.

**Змены ў эканамічным становішчы Беларусі ў другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў**

- Выкарыстанне якасных паказчыкаў вытворчасці: паляпшэнне адносін да працы і яе вынікаў, замена абсталявання на больш сучаснае, укараненне навуковых дасягненняў і гэтак далей
- Перавод прадпрыемстваў на гасразлік і самафінансаванне
- Забеспячэнне апераджальнага росту вытворчасці прадметаў народнага спажывання для задавальнення патрэб людзей
- Спробы пераходу да разнастайных формаў гаспадарання на зямлі: фермерскай, калектыўнай
- Увядзенне арэнды, індывідуальнай працоўнай дзейнасці
- Правядзенне прыватызацыі
- З'яўленне недзяржаўных банкаўскіх і камерцыйных структур

[1] **Спад вытво́рчасці** — змяншэнне аб'ёму выпуску прадукцыі і паслуг, што аказваюцца насельніцтву.
[2] **Інфля́цыя** — абясцэньванне грошай, павелічэнне цэн і зніжэнне рэальнай заработнай платы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 36. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «Эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў» (параграфы 32—35)

**1.** Выберыце правільны варыянт адказу, карыстаючыся тэкстам вучэбнага дапаможніка. Праверце правільнасць адказу па слоўніку і табліцы «Асноўныя гістарычныя даты» ў канцы вучэбнага дапаможніка.

1) За кошт чаго планавалася дасягнуць росту вытворчасці?

а) Павелічэнне колькасці працоўных на прадпрыемствах;

б) паляпшэнне якасці тавараў і рост прадукцыйнасці працы.

2) Аварыя на Чарнобыльскай АЭС адбылася:

а) у 1985 годзе;

б) у 1986 годзе;

в) у 1990 годзе.

3) Курс на перабудову быў абвешчаны:

а) Міхаілам Сяргеевічам Гарбачовым;

б) Пятром Міронавічам Машэравым;

в) Кірылам Трафімавічам Мазуравым.

4) Дванаццатая пяцігодка ахоплівала:

а) 1981—1985 гады;

б) 1986—1990 гады;

в) 1991—1995 гады.

5) Што такое прыватызацыя?

а) Планавае цэнтралізаванае вядзенне гаспадаркі;

б) перадача ці продаж у прыватную ўласнасць часткі дзяржаўнай маёмасці;

в) узмацненне кантролю з боку дзяржавы за якасцю выпушчанай прадукцыі.

6) Свабодныя і дэмакратычныя выбары характарызуюцца:

а) наяўнасцю толькі аднаго кандыдата ў дэпутаты;

б) наяўнасцю некалькіх кандыдатаў у дэпутаты.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Расстаўце падзеі ў храналагічнай паслядоўнасці:

а) аварыя на Чарнобыльскай АЭС;

б) прыняцце Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС;

в) прыняцце Закона «Аб народным абмеркаванні важных пытанняў дзяржаўнага жыцця Беларускай ССР».

**3.** Суаднясіце паняцці і іх азначэнні.

| | |
|---|---|
| імпарт | вываз тавараў |
| экспарт | вытворчасць станкоў, машын і іншага |
| цяжкая прамысловасць | абясцэньванне грошай |
| лёгкая прамысловасць | прывоз тавараў |
| інфляцыя | вытворчасць прадметаў народнага спажывання |

**4.** Сярод пералічаных слоў выберыце тыя, якія звязаны з новымі формамі гаспадарання на зямлі: *калгас*, *арэнда*, *саўгас*, *індывідуальны прадпрымальнік*, *фермерская гаспадарка*.

**5.** Растлумачце наступныя тэрміны: *гаспадарчы разлік, самафінансаванне, лёгкая прамысловасць, цяжкая прамысловасць, прыватызацыя*. Праверце сябе па слоўніку.

**6.** Што такое шматпартыйнасць? Праверце сябе па слоўніку. Чым адрозніваецца шматпартыйнасць ад аднапартыйнасці?

**7.** Сярод пералічаных паняццяў назавіце тыя, якія сведчаць аб пачатку палітыкі перабудовы: *свабодныя і дэмакратычныя выбары*, *шматпартыйнасць*, *галоснасць*, *аднапартыйнасць*.

**8.** Як вы разумееце сэнс тэрмінаў і паняццяў: *галоснасць*, *перабудова*, *шматпартыйнасць*, *свабодныя і дэмакратычныя выбары*? Праверце сябе па слоўніку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# НЕЗАЛЕЖНАЯ РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

## 37. Абвяшчэнне незалежнасці і ўтварэнне Рэспублікі Беларусь

1. Што такое дзяржава? Праверце сябе па слоўніку.
2. Якія дзяржаўныя ўтварэнні існавалі на тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці?
3. У якія дзяржавы ўваходзілі беларускія землі на працягу свайго існавання?
4*. Як і калі ўвасобілася ў жыццё ідэя беларускай дзяржаўнасці?
5*. Ці з'яўлялася на самай справе БССР самастойнай у складзе СССР?
6. Што такое рэферэндум? Праверце сябе па слоўніку.

У канцы 1980-х гадоў Савецкі Саюз апынуўся ў цяжкім эканамічным і палітычным становішчы. СССР быў вялікай па тэрыторыі і колькасці насельніцтва дзяржавай. Яе складалі пятнаццаць саюзных рэспублік. Насялялі краіну звыш ста народаў. У гэты складаны час кожная з рэспублік стала імкнуцца да самастойнага развіцця. Першымі да практычнай рэалізацыі гэтай мэты прыйшлі рэспублікі Прыбалтыкі — Літва, Латвія і Эстонія. У сакавіку 1990 года Вярхоўны Савет Літвы абвясціў аб сваім поўным дзяржаўным **суверэнітэце**[1]. Іншымі словамі, Літва пажадала выйсці са складу СССР і стаць **незалежнай дзяржавай**[2]. Аб сваім суверэнітэце абвясцілі таксама Латвія і Эстонія. Затым і іншыя саюзныя рэспублікі аб'явілі аб сваёй незалежнасці.

У БССР таксама ўзмацніўся рух за нацыянальнае адраджэнне і незалежнасць. Але жаданнем большасці беларусаў было ператварэнне Саюза ССР у сапраўды дэмакратычную прававую дзяржаву. Асновай такой дзяржавы павінна было стаць добраахвотнае аб'яднанне раўнапраўных незалежных рэспублік.

***27 ліпеня 1990 года*** Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў **Дэкларацыю**[3] «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Са-

[1] **Суверэніто́т** — самастойнае, незалежнае ажыццяўленне дзяржавай сваёй знешняй і ўнутранай палітыкі.
[2] **Незале́жная дзяржа́ва** — дзяржава, якая валодае самастойнасцю ва ўнутраных і знешніх справах.
[3] **Дэклара́цыя** — урачыстае абвяшчэнне пэўных намераў дзяржавы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

цыялістычнай Рэспублікі». Такім чынам, Беларусь стала самастойнай дзяржавай. Аднак гэта не выключала магчымасці аб'яднання разам з іншымі рэспублікамі ў новы саюз.

У сакавіку 1991 года ў саюзных рэспубліках, у тым ліку і БССР, адбыўся **рэферэндум**[1]. На ім вырашалася пытанне аб захаванні СССР. Вялікая колькасць людзей выказалася ў падтрымку захавання Савецкага Саюза. Яны жадалі, каб аб'ядналіся ўжо свабодныя і самастойныя дзяржавы.

Аднак забяспечыць незалежнасць рэспублік і ў той жа час захаваць СССР не атрымалася. Гэтаму супрацьстаяла, з аднаго боку, палітычная апазіцыя, з другога — партыйнае кіраўніцтва Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Палітычная апазіцыя выступала за поўны суверэнітэт рэспублік. Партыйнае і дзяржаўнае кіраўніцтва настойвала на захаванні Савецкага Саюза як адзінай дзяржавы. Супрацьстаянне паміж імі прывяло да канфлікту. Перамогу атрымалі прыхільнікі пераўтварэнняў.

Гэта падштурхнула беларускія ўлады да хутчэйшага вырашэння пытання аб суверэнітэце. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР быў нададзены статус канстытуцыйнага закона.

25 жніўня 1991 года была прынята пастанова «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР». Згодна з ёю ўсе прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, што размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі, сталі ўласнасцю Беларускай ССР. У гэты лік увайшлі і тыя, што раней падпарадкоўваліся СССР. Такім чынам, прамое ўмяшанне былога кіраўніцтва СССР у жыццё нашай рэспублікі спынілася.

***19 верасня 1991 года*** Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб назве Беларускай ССР». У адпаведнасці з ім з гэтага дня яна пачала называцца Рэспубліка Беларусь, а ў скарочаным варыянце — Беларусь. Была зацверджана дзяржаўная сімволіка — герб і сцяг краіны.

1. З якіх рэспублік пачаўся шлях да атрымання незалежнасці былымі рэспублікамі СССР?
2. Якім чынам наша краіна стала незалежнай дзяржавай?
3. Калі была прынята Дэкларацыя «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»?

[1] **Рэферэ́ндум** — усенароднае галасаванне па найбольш значных пытаннях жыцця дзяржавы і грамадства.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Што такое суверэнітэт? Праверце сябе па слоўніку.
5. Што азначае выраз «незалежная дзяржава»? Праверце сябе па слоўніку.
6. Каму сталі належаць прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, што размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі, пасля абвяшчэння незалежнасці?
7*. Чаму ў межах СССР рэспублікі не валодалі сапраўдным дзяржаўным суверэнітэтам?
8*. Ці магчыма было атрыманне рэспублікай суверэнітэту ў складзе СССР? Сваю думку абгрунтуйце.
9. Калі Вярхоўны Савет прыняў Закон «Аб назве Беларускай ССР»? Як стала называцца наша краіна?
10. Што ўключае ў сябе дзяржаўная сімволіка?

**1.** Параўнайце паміж сабой тэрміны «дэкларацыя» і «канстытуцыя». Чым яны адрозніваюцца: які з іх з'яўляецца заканадаўчым дакументам, а які толькі выказвае намер нешта зрабіць? Праверце сябе па слоўніку.
**2.** З дапамогай схемы адкажыце, як была зацверджана дзяржаўная незалежнасць.

**Афармленне дзяржаўнай незалежнасці Беларусі**

- Дэкларацыя «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» 27 ліпеня 1990 года
- Пастанова «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР» 25 жніўня 1991 года
- Зацвярджэнне новай назвы нашай дзяржавы — Рэспубліка Беларусь — і яе дзяржаўных сімвалаў 19 верасня 1991 года

Вярхоўны Савет БССР у 1991 годзе прыняў пастанову «Аб канцэпцыі новага Саюзнага дагавора». Сярод іншага ў ёй прадугледжвалася наступнае.

1. Прызнаць мэтазгодным уваходжанне Беларускай ССР у склад Саюза ССР з улікам пераўтварэння яго ў сапраўды дэмакратыч-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ную прававую дзяржаву, заснаваную на добраахвотным аб'яднанні раўнапраўных суверэнных рэспублік.

2. Лічыць неабходным удзел Беларускай ССР у падрыхтоўцы Саюзнага дагавора.

## 38. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь. Палітыка-адміністрацыйная карта краіны

Разгледзьце палітыка-адміністрацыйную карту Рэспублікі Беларусь (гл. форзац). Назавіце краіны-суседкі нашай дзяржавы.

Наша краіна размяшчаецца ў самым цэнтры Еўропы. Яна займае плошчу больш за 207 тысяч квадратных кіламетраў. Працягласць з поўначы на поўдзень складае 560 кіламетраў, з захаду на ўсход працягласць большая — 650 кіламетраў.

Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх шляхоў. Такое размяшчэнне спрыяе развіццю гандлёвых і культурных зносін з іншымі дзяржавамі. А лёс нашага народа цесна пераплятаецца з лёсамі народаў суседніх краін. З Беларуссю мяжуюць Расія, Украіна, Польшча, Літва і Латвія. Самая працяглая мяжа ў нас з Расіяй, яна складае больш за тысячу кіламетраў.

Пасля дасягнення незалежнасці галоўным пытаннем стала вызначэнне дзяржаўнай мяжы. На працягу некалькіх гадоў вяліся перамовы з нашымі суседзямі, праводзіліся вылічэнні. Зараз наша краіна не мае спрэчак з суседнімі краінамі наконт тэрыторыі.

На палітыка-адміністрацыйнай карце нашай Радзімы (гл. форзац) адлюстраваны шэсць абласцей: Брэсцкая, Віцебская, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская. Кожная вобласць вылучаецца на карце асобным колерам.

Вобласці падзяляюцца на раёны, якія ўключаюць сельскія і гарадскія саветы. Кожны раён мае свае органы кіравання, якія клапоцяцца пра развіццё гаспадаркі, паляпшэнне ўмоў жыцця людзей і ўзрастанне дабрабыту дзяржавы.

Наша краіна славіцца сваімі працавітымі, таленавітымі людзьмі. Насельніцтва Беларусі складае крыху менш за 10 мільёнаў чалавек.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Большая частка з іх жыве ў гарадах. Гэта звязана з тым, што ў нашай дзяржаве добра развіта прамысловасць. Амаль у кожным горадзе ёсць якое-небудзь прадпрыемства. А каб яно добра працавала, патрабуецца дастатковая колькасць людзей.

Больш за 80 % насельніцтва Рэспублікі Беларусь складаюць беларусы. Акрамя іх у краіне жывуць рускія, палякі, украінцы і прадстаўнікі іншых народаў (гл. схему).




Нашу краіну можна назваць інтэрнацыянальнай, бо ў ёй камфортна жыць людзям розных нацыянальнасцей. Гэта абумоўлена тым, што ў нашай дзяржаве галоўную ролю адыгрывае грамадзянства, а не нацыянальная прыналежнасць. Людзі, якія насяляюць нашу краіну, у асноўным з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь.

**1.** Апішыце геаграфічнае становішча Беларусі.
**2.** З якімі краінамі мяжуе Беларусь?
**3.** Назавіце колькасць насельніцтва ў Беларусі.
**4.** Назавіце вобласці, на якія падзяляецца Рэспубліка Беларусь.
**5.** З чым звязана тое, што большая частка насельніцтва Беларусі жыве ў гарадах?
**6*.** У чым адрозненне паміж грамадзянствам і нацыянальнай прыналежнасцю?



**1.** На палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) пакажыце межы Беларусі з суседнімі краінамі.
**2.** Знайдзіце і пакажыце на карце Беларусі свой населены пункт, а таксама вобласць і раён, у якім вы жывяце.

Даведайцеся, колькі чалавек пражывае ў вашым населеным пункце. Прадстаўнікі якіх нацыянальнасцей жывуць у вашай мясцовасці? Да якой нацыянальнасці належаць вашы бацькі? Ці захоўваецца ў вашай сям'і культура вашых продкаў?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 39. Утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)

1. Калі быў утвораны СССР? Праверце па табліцы «Асноўныя гістарычныя даты».
2. Дзеля чаго ствараюцца саюзы дзяржаў?

Былыя саюзныя рэспублікі сталі незалежнымі. Але ў гэты час вельмі цяжка было наладжваць самастойнае жыццё. Адчуваўся недахоп эканамічных і гаспадарчых сувязяў. Таму ***8 снежня 1991 года*** кіраўнікі Беларусі, Расіі і Украіны падпісалі Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Такім чынам спынілася існаванне былой магутнай дзяржавы — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Кіраўнікі дзяржаў для падпісання пагаднення сустрэліся ў Беларусі. Гэтае пагадненне атрымала ў гісторыі назву Белавежскага, таму што было падпісана ў Віскулях, на тэрыторыі Белавежскай пушчы.

Тры дзяржавы аб'ядналіся ў СНД і запрасілі далучыцца да Садружнасці іншыя рэспублікі былога СССР. На запрашэнне адгукнуліся Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Туркменістан і Узбекістан. Пазней у Садружнасць увайшлі Азербайджан, Арменія, Грузія, Малдова. Штаб-кватэра (галоўнае месца збору сходаў) СНД знаходзіцца ў Мінску.



Падпісанне кіраўнікамі Беларусі, Расіі, Украіны Пагаднення аб стварэнні СНД



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Садружнасць Незалежных Дзяржаў з'яўляецца міжнароднай арганізацыяй і існуе на добраахвотнай аснове. Дзяржавы, якія туды ўваходзяць, маюць права выйсці. Напрыклад, Грузія зараз не ўваходзіць у СНД.

Садружнасць працягвае развівацца. Наладжваюцца найбольш прымальныя для ўсіх удзельнікаў узаемаадносіны. Распрацаваны і прыняты шэраг дакументаў, у тым ліку Статут СНД. Дзяржавы супрацоўнічаюць праз разнастайныя аб'яднанні. Створаны і дзейнічаюць Эканамічны савет, Эканамічны суд, Савет кіраўнікоў дзяржаў, Савет кіраўнікоў урадаў, Савет міністраў замежных спраў, Савет міністраў абароны, Міждзяржаўны банк і іншыя органы.

Дзяржавы — удзельніцы СНД зацікаўлены ў сумесным вырашэнні шматлікіх пытанняў. Таму яны ўтварылі некалькі арганізацый.

Напрыклад, для таго каб праводзіць адзіную палітыку ў галінах эканомікі, створаны Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС).

Адной з галоўных задач Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) з'яўляецца ўзмацненне барацьбы з міжнародным тэрарызмам.

Для таго каб рэгуляваць гандаль па адзіных правілах, існуе Мытны саюз.

Адначасова развіваюцца двухбаковыя адносіны паміж дзяржавамі, якія ўтварыліся пасля распаду былога Савецкага Саюза.

?

1. Чаму ўзнікла неабходнасць утварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў?
2. Дзе было падпісана Пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў?
3. Якія краіны ўвайшлі ў склад СНД? Адкажыце з дапамогай тэксту параграфа.
4. Назавіце горад, які з'яўляецца штаб-кватэрай СНД.
5. Якія аб'яднанні створаны і дзейнічаюць у рамках СНД? Знайдзіце адказ у тэксце параграфа.
6. Якая арганізацыя абараняе інтарэсы ўдзельнікаў СНД па барацьбе з міжнародным тэрарызмам?
7. Назавіце саюз дзяржаў СНД, у якім праводзіцца адзіная палітыка ў галінах эканомікі. Выкарыстайце тэкст параграфа.
8. Якая задача Мытнага саюза? Адкажыце словамі тэксту параграфа.

9*. Чаму дзяржавы маюць права выходзіць з СНД? Знайдзіце адказ у тэксце параграфа.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 40. Стварэнне органаў дзяржаўнага кіравання і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

1. Якія органы адыгрываюць найбольш значную ролю ў сістэме кіравання?
2. Навошта краіне ўзброеныя сілы?
3. Чым займаюцца суды?

Кожная самастойная краіна павінна мець свае органы дзяржаўнага кіравання. Пасля атрымання самастойнасці ў Рэспубліцы Беларусь галоўнымі органамі кіравання былі Вярхоўны Савет і Савет Міністраў. Паміж імі не было наладжана ўзаемадзеянне ў вырашэнні пытанняў развіцця краіны. Таму пераўтварэнні ў дзяржаве ішлі марудна. Узнікла патрэба рэфармаваць органы вышэйшай улады. Першы крок у гэтым напрамку быў зроблены ***15 сакавіка 1994 года***, калі Вярхоўным Саветам была прынята новая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Згодна з Канстытуцыяй была ўстаноўлена і новая форма дзяржаўнага кіравання, уведзена пасада Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь застаўся заканадаўчым органам: ён павінен быў прымаць законы. Савет Міністраў, у сваю чаргу, меў на мэце кіраванне выкананнем усіх планаў развіцця краіны.

Кожная дзяржава павінна ўмець абараняць сваю незалежнасць, але ў той жа час быць міралюбнай з іншымі дзяржавамі. Рэспубліка Беларусь пачала праводзіць змены ў арміі. У гэтым напрамку яна дзейнічала згодна з міжнароднымі пагадненнямі. Вялікія змены пачаліся ўжо ў 1992 годзе. Армія была значна скарочана. Вялікая колькасць ваеннай тэхнікі была знішчана. У гэты перыяд значна знізіўся прэстыж ваеннай службы, а жыццё ваенных пагоршылася.



Рота ганаровай варты

Але нельга было дапусціць аслабленне абараназдольнасці незалежнай дзяржавы. Таму з 1994 года пачалася рэформа арміі. Колькасны склад арміі зменшыўся, але, нягледзячы на гэта, яе абараназдольнасць пачала павялічвацца. У арміі з’явіліся новыя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**

| | |
|---|---|
| Заканадаўчая ўлада (распрацоўвае і прымае законы) | Вярхоўны Савет |
| Выканаўчая ўлада (кіруе выкананнем планаў развіцця краіны) | Урад — Савет Міністраў |
| Судовая ўлада (назірае за выкананнем Канстытуцыі і законаў) | Канстытуцыйны Суд, Вярхоўны Суд, Вышэйшы Гаспадарчы Суд |

Органы дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь да 1996 года

ўзоры ўзбраення. Палепшылася матэрыяльнае становішча вайскоўцаў — афіцэраў і салдат. Прэстыж ваеннай службы пачаў зноў расці.

Пераўтварэнні пачаліся і ў судовай сістэме. Упершыню ў краіне пачаў дзейнічаць **Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь**[1]. Ён быў створаны дзеля таго, каб усе законы Рэспублікі Беларусь адпавядалі Канстытуцыі. Стаў працаваць таксама **Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь**[2], якому падпарадкоўваліся абласныя і гарадскія (раённыя) суды. Акрамя таго, у рэспубліцы дзейнічаў і Вышэйшы Гаспадарчы Суд, які разглядаў важныя гаспадарчыя справы.

1. Калі была прынята новая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь?
2. Якімі былі галоўныя органы ўлады краіны?
3. У якім дакуменце замацавана ўвядзенне пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?
4. Якія пераўтварэнні адбыліся ў беларускай арміі?
5. Якія суды дзейнічаюць у Беларусі? Чым яны адрозніваюцца адзін ад аднаго? Адкажыце словамі тэксту вучэбнага дапаможніка.

Пацікаўцеся, хто з вашых родных і калі служыў ва ўзброеных сілах.

З дапамогай схемы ўверсе адкажыце, якія органы дзяржаўнага кіравання былі створаны ў нашай краіне.

[1] **Канстытуцы́йны Суд Рэспу́блікі Белару́сь** — судовы орган, які кантралюе, ці адпавядаюць Канстытуцыі нарматыўныя і прававыя акты, што прымаюцца ў краіне.
[2] **Вярхо́ўны Суд Рэспу́блікі Белару́сь** — суд, які ажыццяўляе правасуддзе і нагляд за судовай дзейнасцю агульных судоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 41. Канстытуцыя — асноўны закон Рэспублікі Беларусь

1. Што азначае паняцце «канстытуцыя»?
2. Што такое рэферэндум?

У замацаванні незалежнасці Рэспублікі Беларусь асаблівае месца належыць Канстытуцыі. Яна была прынята Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 года. Першая Канстытуцыя суверэннай Беларусі стала важным крокам на шляху стварэння **прававой дзяржавы**[1]. Прававой дзяржавай лічаць тую, у якой дзейнасць органаў улады, жыццё грамадства вызначаюцца Канстытуцыяй, адпаведнымі законамі і іншымі дзяржаўнымі дакументамі. Выкананне іх з'яўляецца абавязковым для ўсіх грамадзян краіны. У Канстытуцыі запісаны правы і свабоды чалавека.

Канстытуцыя — гэта асноўны закон дзяржавы. У адпаведнасці з Канстытуцыяй вышэйшая заканадаўчая ўлада ў краіне належыць Вярхоўнаму Савету. Дэпутаты Вярхоўнага Савета прымаюць законы, па якіх павінна жыць дзяржава. Кіраўніцтва дзяржавы выконвае дзеючыя законы. Кіраўніком дзяржавы з'яўляецца Прэзідэнт. Дзейнасць Прэзідэнта і **парламента**[2] павінна адпавядаць Канстытуцыі і законам. Кантроль за іх дзейнасцю ажыццяўляе Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь.



Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь адпавядае палажэнням канстытуцый іншых краін, якія развіваюцца па дэмакратычных правілах. Але разам з тым яна можа мець і недахопы. Таму ў Канстытуцыю ўносяцца змяненні (папраўкі). Для таго каб іх унесці, праводзяцца ўсенародныя рэферэндумы, у час якіх на галасаванне выносяцца пытанні аб унясенні змяненняў. Такім чынам, важныя рашэнні прымаюць, толькі параіўшыся з беларускім народам.

[1] **Прававáя дзяржáва** — дзяржава, у якой дзейнасць усіх органаў улады, жыццё грамадства вызначаюцца Канстытуцыяй, законамі, дзяржаўнымі дакументамі.
[2] **Парлáмент** — вышэйшы заканадаўчы орган улады ў дэмакратычных дзяржавах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Асноўнай мэтай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця чалавека з улікам яго інтарэсаў і запатрабаванняў. Правы чалавека, якія замацаваны ў нашай Канстытуцыі, разглядаюцца грамадствам і дзяржавай у якасці галоўных каштоўнасцяў. Таму нашу краіну можна лічыць сацыяльна арыентаванай дзяржавай.

1. Што з'яўляецца асноўным законам Рэспублікі Беларусь?
2. Калі Вярхоўным Саветам была прынята Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь?
3. Што запісана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? Адкажыце словамі тэксту параграфа.
4. Каму належыць вышэйшая заканадаўчая ўлада ў краіне?
5. Хто з'яўляецца кіраўніком нашай дзяржавы?
6. Як вы разумееце словы: «прававая дзяржава», «парламент»? Праверце сябе па слоўніку.
7. Чаму нашу краіну можна лічыць сацыяльна арыентаванай дзяржавай?

Вазьміце ў школьнай бібліятэцы Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. З дапамогай настаўніка пазнаёмцеся з ёю. Якія правы ў Рэспубліцы Беларусь гарантаваны дзецям?

## 42. Абранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі

1. Што такое выбары?
2. Якія выбары лічацца дэмакратычнымі?

У 1994 годзе ў выніку ўсенароднага галасавання на пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў абраны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка.

Першы тур выбараў першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбыўся 23 чэрвеня 1994 года. У ім удзельнічалі 6 **кандыдатаў**[1]. Паколькі ніхто з іх не набраў больш за палову галасоў выбаршчыкаў, ***10 ліпеня 1994 года*** адбыўся другі тур выбараў. У гэтым туры ўдзельнічалі два

[1] **Кандыда́т** — чалавек, які мае намер быць выбраным у кіруючы орган улады, заняць пасаду, атрымаць званне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка

кандыдаты, у тым ліку А. Р. Лукашэнка. Абсалютная большасць выбаршчыкаў (звыш 80 %) аддалі свае галасы за Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнку. 20 ліпеня 1994 года на сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь адбылася цырымонія прынясення прысягі і ўступлення Прэзідента на сваю пасаду.

Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь — Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка — нарадзіўся 30 жніўня 1954 года ў пасёлку Копысь Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў на гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута, які скончыў у 1975 годзе. А. Р. Лукашэнка служыў у Савецкай Арміі. Працаваў на камсамольскай і партыйнай рабоце. Займаў адказныя пасады ў аграпрамысловым комплексе. Без адрыву ад вытворчасці ў 1985 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію.

У выніку парламенцкіх выбараў 1990 года А. Р. Лукашэнка стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. У якасці дэпутата паказаў сябе прынцыповым прыхільнікам рэфармавання дзяржавы, але пры гэтым выступаў за памяркоўныя і разважлівыя пераўтварэнні.

У 2001, 2006, 2010 і 2015 гадах Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка зноў абіраўся Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

?

1. Калі адбыліся першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?
2. Дзе нарадзіўся Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка?
3. Якую адукацыю ён атрымаў?
4. Дзе працаваў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка да свайго абрання дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь?
5. Калі ён стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 43. Рэферэндум 24 лістапада 1996 года

1. Што азначае паняцце «рэферэндум»? Праверце сябе па слоўніку.
2. У якіх выпадках праводзіцца ўсенародны рэферэндум?
3. Калі святкуецца Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь?

На шляху будаўніцтва нашай маладой незалежнай дзяржавы ўзніклі розныя непрадбачаныя цяжкасці. Напрыклад, выявіліся недакладнасці ў новай Канстытуцыі. З мэтай вырашэння пэўных супярэчнасцяў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка прапанаваў правесці рэспубліканскі рэферэндум. На яго выносілася абмеркаванне важных дзяржаўных праблем. Самым галоўным пытаннем стала прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года са змяненнямі і дапаўненнямі (новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь).

Рэферэндум адбыўся ***24 лістапада 1996 года***. Яго вынікі сведчылі аб шырокай падтрымцы народам Беларусі курсу Прэзідэнта. Гэты курс быў накіраваны на ўсталяванне стабільнасці ў краіне. За прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, якую прапанаваў Прэзідэнт Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, прагаласавала больш за 70 % грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Грамадзяне рэспублікі павінны былі таксама вырашыць, калі святкаваць Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі). За яго перанос на ***3 ліпеня*** прагаласавала больш чым 80 % выбаршчыкаў. Гэта дзень вызвалення Мінска ад фашысцкіх захопнікаў у час Вялікай Айчыннай вайны.

У адпаведнасці з Канстытуцыяй новай вышэйшай заканадаўчай установай стаў Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Раней гэта быў Вярхоўны Савет.

Усе людзі ў нашай дзяржаве роўныя перад законам. Гэта значыць, што яны маюць роўныя правы і абавязкі. Усе дзяржаўныя органы, службовыя асобы, жыхары нашай краіны павінны выконваць законы.

1. Хто прапанаваў правесці рэспубліканскі рэферэндум?
2. Якія пытанні вырашаў рэферэндум, што адбыўся 24 лістапада 1996 года?
3. Які орган вышэйшай улады пачаў дзейнічаць замест Вярхоўнага Савета пасля рэферэндуму?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Як грамадзяне Рэспублікі Беларусь павінны ставіцца да прынятых законаў?
5*. Якім чынам рэферэндум пацвердзіў тое, што ўлада ў краіне належыць народу?

Даведайцеся, у якіх выбарах прымалі ўдзел вашы бацькі ці сваякі ў апошні час. Якія ў іх засталіся ўражанні аб магчымасці свабодна рэалізаваць свае грамадзянскія правы?

Рэспубліка Беларусь пачала развівацца як самастойная і незалежная краіна. Таму былі зацверджаны новыя дзяржаўныя ўзнагароды. Сярод іх — званне «Герой Беларусі», ордэны Айчыны, Воінскай Славы, Францыска Скарыны.

Першым Героем Рэспублікі Беларусь стаў ваенны лётчык Уладзімір Карват. Ён, не разважаючы, накіраваў свой палаючы самалёт убок ад вёскі Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна. Коштам свайго жыцця ён выратаваў жыцці многіх людзей. Дзяржава высока ацаніла мужнасць і гераізм, праяўленыя пры выкананні воінскага абавязку. Падпалкоўнік Уладзімір Карват Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пасмяротна быў узнагароджаны самым высокім званнем нашай Радзімы.

## 44. Улада ў Рэспубліцы Беларусь

1. У якім годзе быў прыняты асноўны закон нашай дзяржавы — Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь?
2. Якая пасада з’яўляецца вышэйшай у нашай дзяржаве?

У Канстытуцыі запісана, што ўлада ў Рэспубліцы Беларусь належыць народу, які праз выбары фарміруе шэраг органаў улады. Згодна з асноўным законам, наша краіна мае прэзідэнцкую форму дзяржаўнага кіравання. Кіраўніком нашай дзяржавы з’яўляецца Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Ён абіраецца ўсенародным галасаваннем.

Беларускі народ ажыццяўляе сваю ўладу праз выбранне дэпутатаў. Да вышэйшых органаў улады адносіцца Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. У Нацыянальным сходзе працуюць дзве Палаты дэпутатаў. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**

| | |
|---|---|
| Заканадаўчая ўлада (распрацоўвае і прымае законы) | Нацыянальны сход: 1. Верхняя палата — Савет Рэспублікі; 2. Ніжняя палата — Палата прадстаўнікоў |
| Выканаўчая ўлада (кіруе выкананнем планаў развіцця краіны) | Урад — Савет Міністраў |
| Судовая ўлада (дае ацэнку адпаведнасці Канстытуцыі) | Канстытуцыйны Суд; Вярхоўны Суд |

Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь пасля 1996 года

Беларусь распрацоўваюць і прымаюць праекты законаў, па якіх будуць жыць грамадзяне нашай рэспублікі. Акрамя таго, у Нацыянальным сходзе ёсць яшчэ адна палата — Савет Рэспублікі. У ёй працуюць людзі, выбраныя дэпутатамі саветаў раённага і абласнога ўзроўняў. Яны павінны сачыць за тым, каб рашэнні, якія былі прыняты Палатай прадстаўнікоў, адпавядалі інтарэсам грамадзян і своечасова выконваліся.

Ажыццяўляе выкананне прынятых законаў урад. Яго назва — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Урад з’яўляецца цэнтральным органам дзяржаўнага кіравання.

Прэзідэнт фарміруе вышэйшы выканаўчы орган улады — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Гэта азначае, што Прэзідэнт сам пры-



Пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

значае кіраўнікоў на адказныя пасады. Савет Міністраў нясе адказнасць за сваю дзейнасць перад Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

За тым, каб усе законы нашай дзяржавы адпавядалі асноўнаму закону — Канстытуцыі, сочыць Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь. Да органаў судовай улады акрамя Канстытуцыйнага Суда адносіцца Вярхоўны Суд.

Дзейнасць Прэзідэнта вызначаецца Канстытуцыяй і законамі. Галоўнымі напрамкамі дзейнасці Прэзідэнта і ўрада з'яўляюцца распрацоўка і ажыццяўленне праграм развіцця эканомікі і знешнепалітычнай дзейнасці. Кіраўніцтвам рэспублікі ў якасці галоўных задач разглядаюцца забеспячэнне росту вытворчасці, прадухіленне негатыўных з'яў у эканоміцы, павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

1. Каму належыць улада ў Рэспубліцы Беларусь?
2. Што такое Нацыянальны сход?
3. Колькі палат налічваецца ў складзе Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь?
4. Як называецца кожная з палат?
5. Чым займаюцца Верхняя і Ніжняя палаты?
6. Хто ажыццяўляе выкананне прынятых законаў?
7. Чым займаецца Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь?
8. Якія галоўныя задачы дзейнасці Прэзідэнта і ўрада?

Растлумачце, як вы разумееце паняцці «дэмакратыя», «сацыяльная дзяржава», «прававая дзяржава». Праверце сябе па слоўніку.

## 45. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь

1. Што такое дзяржаўныя сімвалы?
2. Для чаго яны патрэбны?
3. Які выгляд меў сцяг, зацверджаны ў 1951 годзе ў сувязі з уваходжаннем рэспублікі ў склад ААН?

Кожная дзяржава мае свае дзяржаўныя сімвалы. Імі з'яўляюцца сцяг, герб і гімн. Сярод дзяржаўных сімвалаў няма аднолькавых. Гісторыя многіх з іх пачынаецца ў глыбокай старажытнасці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ





Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь

На працягу ўсёй нашай гісторыі змяняліся і дзяржаўныя сімвалы. У 1919 годзе, пасля ўтварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, яе дзяржаўным сцягам стаў сцяг чырвонага колеру. Уверсе яго былі размешчаны выявы сярпа і молата. У 1945 годзе сцяг БССР узняўся ў амерыканскім горадзе Нью-Ёрку разам са сцягамі іншых краін — заснавальніц Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. З 1951 года на гэтым сцягу з’явілася ніжняя зялёная паласа, а таксама вертыкальная паласа з белым арнаментам (узор з геаметрычных элементаў) на чырвоным фоне.

На рэферэндуме ***14 мая 1995 года*** большасць насельніцтва прагаласавала за ўвядзенне новых дзяржаўных сімвалаў рэспублікі.

Сучасны дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы. Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца. Ён сімвалізуе роднасць і братэрства. Чырвоны колер звязаны з барацьбой за свабоду і справядлівасць. Гэта знак перамогі і шчаслівага жыцця.

Зялёны колер — колер дабра і міру. Гэта колер прыроды, зялёнай расліннасці палёў, лясоў, лугоў. Зеляніна заўсёды азначала вясновае абуджэнне прыроды пасля доўгага зімовага сну.

Белы колер — перш за ўсё колер свабоды. Ён пераклікаецца з назвай нашай краіны — Беларусь. Белы колер таксама азначае гасціннасць, згоду і мудрасць жыхароў Беларусі. Гэтыя якасці спрадвеку захоўваюцца ў кожнага жыхара нашай Бацькаўшчыны.

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь мае яшчэ адну важную дэталь — чырвоны арнамент на белым фоне. У яго аснове — народны


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ўзор, вышыты на ручніку. Гэты арнамент гаворыць пра любоў нашага народа да працы.

У цэнтры арнамента — ромб з кручкамі, якія сімвалізуюць вечнасць і рух. Ромб — гэта старажытная выява багіні зямлі і ўрадлівасці. Ён абазначае засеянае поле. Ромб таксама тлумачыцца як прадвеснік шчасця. У беларускіх вышывальшчыц такі ромб называўся сонейкам.

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь узняты над будынкамі, дзе размяшчаюцца органы дзяржаўнай улады. Ён сустракае нас на фабрыках і заводах, у воінскіх часцях і калгасах, у школах і вышэйшых навучальных установах. Дзяржаўны сцяг узнімаецца і ў час спартыўных спаборніцтваў.

У святочныя дні дзяржаўнымі сцягамі ўпрыгожваецца кожны населены пункт Беларусі. 9 Мая, у Дзень Перамогі, побач з імі лунаюць чырвоныя сцягі — сімвалы мужнасці нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Герб Рэспублікі Беларусь змяшчае абрыс нашай дзяржавы. Так яна абазначана на геаграфічнай карце. Гэта тэрыторыя асвечана ззяннем залатых сонечных прамянёў, якія ўзыходзяць над зямлёй. Яднанне зямлі і сонца — галоўны знак жыцця. Гэтыя выявы на гербе адлюстроўваюць традыцыі нашых продкаў, якія пакланяліся маці-зямлі і ранішняму сонцу. Сімвалы зямлі і сонца азначаюць надзею сучасных людзей на росквіт Беларусі.

Пяціканцовая зорка на гербе — знак бяспекі, мужнасці і высокіх памкненняў. Наяўнасць зоркі азначае гатоўнасць кожнага жыхара да абароны сваёй Радзімы.

Абрамляе наш герб вянок са спелых каласоў жыта. Вянок абвіты чырвона-зялёнай стужкай з надпісам «Рэспубліка Беларусь». З аднаго боку вянок пераплецены ружовымі кветкамі канюшыны, а з другога — блакітнымі кветкамі лёну. Вянок спрадвеку быў сімвалам узнагароды пераможцаў.

Такім чынам, герб нашай краіны апавядае пра беларускі народ і яго гісторыю.

Кожную другую нядзелю мая ў нашай краіне святкуецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга.

Да дзяржаўных сімвалаў адносіцца і Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь. Гэта ўрачыстая песня дзяржавы. Гімн павінен ведаць кожны



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

чалавек, які жыве ў Беларусі. Гэтая песня сімвалізуе адзінства грамадзян Рэспублікі Беларусь. Гімн гучыць на ўсіх дзяржаўных мерапрыемствах. Яго выконваюць і слухаюць стоячы.

Кожны грамадзянін краіны павінен паважаць яе дзяржаўныя сімвалы — герб, сцяг і гімн.

1. Якую ролю ў жыцці дзяржавы адыгрываюць дзяржаўныя сімвалы?
2. Што сімвалізуюць колеры Дзяржаўнага сцяга?
3. Што сімвалізуе арнамент Дзяржаўнага сцяга?
4. Што сімвалізуюць выявы Дзяржаўнага герба?
5. Калі святкуецца Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга краіны?

Пазнаёмцеся з сімволікай Рэспублікі Беларусь, што прадстаўлена ў вашай школе.

Разгледзьце Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг на с. 139. Складзіце расказ пра іх.

Вывучыце тэкст Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

*Словы Міхася Клімковіча і Уладзіміра Карызны*
*Музыка Несцера Сакалоўскага*

Мы, беларусы — мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Дружба народаў — сіла народаў —
Наш запаветны, сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў ясныя высі,
Сцяг пераможны — радасці сцяг!

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

***2 ліпеня 2013 года*** ў Мінску была ўрачыста адкрыта новая плошча. Гэта Плошча Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Яна знаходзіцца па праспекце Пераможцаў каля Палаца Незалежнасці.

Адзін з галоўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь — Дзяржаўны сцяг — падняты на вышыню 70 метраў. Плошча палотнішча складае каля 100 квадратных метраў, а вага — 25 кілаграмаў.

У сувязі са з’яўленнем такога месца пачалі складвацца і новыя традыцыі. На плошчы ва ўрачыстай абстаноўцы воіны прымаюць ваенную прысягу, моладзь атрымлівае пашпарты, дзяцей прымаюць у піянеры. Сюды з задавальненнем і пачуццём гонару прыходзяць беларусы. Шмат бывае на плошчы і гасцей нашай краіны.



Плошча Дзяржаўнага сцяга ў Мінску



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 46. Эканамічныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Беларусь

1. Як вы разумееце словы «камандная эканоміка»? Праверце сябе па слоўніку.
2. Якія падзеі адмоўна паўплывалі на развіццё эканомікі БССР у другой палове 1980-х гадоў?
3. Як адбіўся распад СССР на развіцці эканомікі Беларусі?

З пачатку 1990-х гадоў Беларусь пачала адчуваць цяжкасці ў сваім эканамічным жыцці. СССР больш не існаваў. Распаліся гаспадарчыя сувязі паміж рознымі прадпрыемствамі былога Савецкага Саюза. У выніку ў перыяд з 1991 па 1995 год вытворчасць прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі ў Рэспубліцы Беларусь зніжалася. Разам з гэтым падаў і ўзровень жыцця насельніцтва.

У такіх умовах кіраўніцтва дзяржавы прыняло рашучыя меры па вывадзе краіны з **крызісу**[1]. Дзеля спынення крызісных з'яў у эканоміцы былі выдаткаваны вялікія сродкі для падтрымкі вядучых прамысловых прадпрыемстваў. Падтрымку дзяржавы атрымалі і цэлы шэраг калгасаў і саўгасаў. Дзякуючы гэтаму яны змаглі пераадолець найбольш цяжкі перыяд пераходу да рыначнай эканомікі.

Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны была падтрымана на Першым Усебеларускім народным сходзе ў 1996 годзе. У якасці галоўнай яе мэты было вызначана пераадоленне крызісных з'яў у эканоміцы. Каб палепшыць становішча ў гаспадарцы, патрабаваліся намаганні ўсяго народа.

Эканоміка краіны справілася з пастаўленымі задачамі. Перш за ўсё было спынена падзенне вытворчасці. Па шэрагу напрамкаў эканоміка выйшла на больш высокія паказчыкі, чым у канцы 1980-х гадоў. Пачаў узрастаць узровень жыцця насельніцтва. Адной з галоўных задач на гэты момант стала харчовая бяспека краіны. Ужо да 2001 года Рэспубліка Беларусь у асноўным забяспечвала свае патрэбы ў галоўных прадуктах харчавання.

Трэба было далей вырашаць задачы развіцця эканомікі краіны. У 2001 годзе Другі Усебеларускі народны сход прыняў новую праграму эканамічнага развіцця на 2001—2005 гады.

[1] **Кры́зіс** — цяжкае становішча.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




У зале пасяджэнняў Усебеларускага народнага сходу

Станоўчыя змены ў эканамічным жыцці былі замацаваны ў рашэннях Трэцяга Усебеларускага народнага сходу ў 2006 годзе. Сход паставіў галоўную задачу — вывесці гаспадарку Беларусі на яшчэ больш высокі ўзровень. Садзейнічаць гэтаму павінна было выкарыстанне новых тэхналогій.

У Рэспубліцы Беларусь створаны Парк высокіх тэхналогій. Яго заказчыкамі на сённяшні час з'яўляюцца больш за 50 краін свету. Гэта дапамагло нашай краіне больш паспяхова развівацца, заняць месца сярод вядучых дзяржаў.

Па выніках Чацвёртага Усебеларускага народнага сходу была прынята Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011—2015 гады. Сход адбыўся ў снежні 2010 года.

Практыка кіравання, калі прадстаўнікі ўлады, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, вучоныя і працоўныя сумесна абмяркоўваюць планы развіцця краіны, дала добрыя вынікі.

1. Якія змены адбыліся ў эканоміцы рэспублікі на шляху рыначных рэформаў?
2. Якую праграму зацвердзіў Першы Усебеларускі народны сход?
3. Якія мэты былі пастаўлены на Другім і Трэцім Усебеларускіх сходах?
4. Назавіце дакумент, што прыняў Чацвёрты Усебеларускі народны сход. Пры адказе выкарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.
5*. Што дапамагае выводзіць гаспадарку краіны на больш высокі ўзровень?

## 47. Саюз Беларусі і Расіі. Стварэнне Саюзнай дзяржавы

1. Калі і дзеля чаго быў утвораны СССР?
2. Якое дзяржаўнае аб'яднанне было ўтворана пасля распаду СССР?

Пасля распаду СССР Рэспубліка Беларусь імкнулася падтрымліваць добрыя адносіны з суседзямі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У лютым 1995 года падпісаны дагавор аб дружбе, добрасуседстве і супрацоўніцтве паміж Расійскай Федэрацыяй і Рэспублікай Беларусь. Таксама было заключана пагадненне аб сумесных намаганнях па ахове дзяржаўных граніц Рэспублікі Беларусь.

Важнае значэнне ў аднаўленні і развіцці цесных сувязяў паміж Беларуссю і Расіяй, а таксама краінамі СНД меў праведзены ў маі 1995 года ўсебеларускі рэферэндум.

На рэферэндуме большасць насельніцтва, якое прыняло ў ім удзел, выказалася за паглыбленне ўзаемасувязяў з Расіяй. Быў абраны курс на паступовае збліжэнне эканомік Расіі і Беларусі і фарміраванне ўстойлівых сувязяў у асноўных галінах.

У 1996 годзе быў падпісаны чатырохбаковы дагавор паміж Расіяй, Беларуссю, Казахстанам і Кіргізіяй, які аб'яднаў намаганні краін у справе **інтэграцыі**[1]. Аднак асаблівае месца ў аднаўленні страчанага адзінства з прычыны распаду СССР меў падпісаны ў Маскве ***2 красавіка 1996 года*** Дагавор аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі.

Менавіта гэты дзень у Беларусі і Расіі стаў адзначацца як свята — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. У звароце А. Р. Лукашэнкі да беларускага народа з нагоды падпісання Дагавора аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі гаворыцца:

«2 красавіка 1996 года ўвойдзе ў гісторыю як дзень заснавання Супольнасці Суверэнных Рэспублік. Палітыка збліжэння з Расіяй — гэта




Святочныя мерапрыемствы ў Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

[1] **Інтэгра́цыя** — аб'яднанне, збліжэнне і ўсталяванне ўзаемасувязяў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Развіццё інтэграцыйнага працэсу паміж Беларуссю і Расіяй**

- Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў 8 снежня 1991 года
- Стварэнне Супольнасці Беларусі і Расіі 2 красавіка 1996 года
- Стварэнне Саюза Беларусі і Расіі 2 красавіка 1997 года
- Дагавор паміж Беларуссю і Расіяй аб утварэнні Саюзнай дзяржавы 8 снежня 1999 года

палітыка для народа, для кожнага з нас. Супольнасцю беларускім і расійскім грамадзянам гарантуюцца абсалютна роўныя правы.

Як і раней у Савецкім Саюзе, любы беларускі юнак, любая беларуская дзяўчына змогуць атрымаць адукацыю ў кожнай вышэйшай навучальнай установе Масквы і іншых цэнтрах навукі і адукацыі Расіі. Мы з вамі жывём у знамянальны час, калі пачынае здзяйсняцца мара народаў Савецкага Саюза, перш за ўсё славянскіх народаў, аб аб'яднанні».

Саюз Беларусі і Расіі быў заключаны ***2 красавіка 1997 года***. Наступны крок у адносінах паміж Беларуссю і Расіяй адбыўся ***8 снежня 1999 года***. Паміж нашымі краінамі быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы. Гэтае пагадненне прадугледжвала больш глыбокую інтэграцыю нашых краін. Зараз 2 красавіка адзначаецца як Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. Традыцыйна ў гэты дзень праходзяць святочныя мерапрыемствы ў Маскве і Мінску. Сустракаюцца лідары абедзвюх дзяржаў.

Кіраўніцтва нашай дзяржавы надае ўвагу сувязям з суседнімі краінамі, добразычлівым адносінам з **Еўрапейскім Саюзам (Еўрасаюзам)**[1] і іншымі дзяржавамі.

[1] **Еўрапéйскі Саю́з (Еўрасаю́з, ЕС)** — эканамічнае і палітычнае аб'яднанне еўрапейскіх дзяржаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як развіваліся адносіны паміж краінамі СНД?
2. Якое жаданне выказаў народ на ўсебеларускім рэферэндуме ў маі 1995 года?
3. Калі быў створаны Саюз Беларусі і Расіі?
4*. Якія перспектывы бачацца ў развіцці Саюзнай дзяржавы?

1. Разгледзьце схему на с. 146 і раскажыце пра развіццё ўзаемаадносін паміж Беларуссю і Расіяй.
2. Разам з настаўнікам вызначце:
   1) якія дзяржавы ўваходзяць у склад СНД;
   2) якія дзяржавы ўваходзяць у Еўрасаюз.

## 48. Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь. Міжнародныя сувязі на сучасным этапе

1. Калі БССР стала членам ААН? Праверце па табліцы «Асноўныя даты гісторыі Беларусі» ў канцы вучэбнага дапаможніка.
2. За што Беларусь атрымала міжнароднае прызнанне пасля Вялікай Айчыннай вайны?
3. У чым гэта прызнанне праявілася?
4. Колькі краін аб'ядноўвае Еўрасаюз? Праверце сябе па слоўніку.
5*. Ці ведаеце вы, з якімі краінамі свету Беларусь падтрымлівае гандлёва-эканамічныя сувязі?

Калі Беларусь знаходзілася ў складзе СССР, яе адносіны з іншымі краінамі ўзгадняліся з кіраўніцтвам Савецкага Саюза. Таму часцей за ўсё ўдзел рэспублікі ў шматлікіх міжнародных арганізацыях насіў фармальны характар. Атрымаўшы незалежнасць, Беларусь пачала самастойна наладжваць кантакты з замежнымі краінамі. Выхад з СССР паклаў пачатак новаму этапу ў міжнародным жыцці Беларусі. Тое, што Рэспубліка Беларусь стала незалежнай дзяржавай, было прызнана міжнароднай супольнасцю. Ужо ў сярэдзіне 1994 года Рэспубліку Беларусь прызналі больш за 100 краін свету. Паміж Беларуссю і краінамі, якія прызналі яе, усталяваліся дыпламатычныя адносіны. У Мінску пачалі працаваць **пасольствы**[1] замежных краін.

[1] **Пасóльства** — прадстаўніцтва замежнай краіны на тэрыторыі іншай дзяржавы для ажыццяўлення ўзаемных сувязяў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Асабліва пашырыліся дыпламатычныя адносіны з краінамі — удзельніцамі ААН. Наша краіна з'яўляецца актыўным членам гэтай міжнароднай арганізацыі. Пасля абвяшчэння незалежнасці ў 1991 годзе рэспубліка пастаянна ўдзельнічае ў рабоце Генеральнай Асамблеі ААН, яе камісій і камітэтаў. Беларусь бярэ актыўны ўдзел у распрацоўцы і прыняцці дакументаў ААН. Нашы дыпламаты вылучаюцца самастойнасцю ў сваёй дзейнасці і высокім прафесіяналізмам у выпрацоўцы новых міжнародных пагадненняў.

Беларусь прынята ў самыя буйны́я міжнародныя арганізацыі. У 1992 годзе наша краіна ўступіла ў Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця, Міжнародны валютны фонд. Беларусь наладжвае ўзаемаадносіны з Еўрапейскім супольніцтвам. Рэспубліка атрымала статус назіральніка ў Сусветнай гандлёвай арганізацыі, створанай у 1995 годзе. У сакавіку 1995 года Прэзідэнт Беларусі А. Р. Лукашэнка падпісаў у Брусэлі пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве паміж ЕС і Рэспублікай Беларусь. Яно прызнала намаганні па правядзенні эканамічных рэформаў, якія пачалі ажыццяўляцца ўрадам Беларусі. Таму Еўрапейскі Саюз пагадзіўся садзейнічаць іх правядзенню, у тым ліку ў выглядзе фінансавай дапамогі. На сённяшні час развіццё адносін з краінамі Еўрасаюза з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў знешняй палітыкі нашай краіны.

Згодна з рашэннем ААН 1995—2004 гады былі абвешчаны дзесяцігоддзем адукацыі ў галіне правоў чалавека. Яшчэ ў 1993 годзе ў Бела-



Візіт лідара Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусь



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

русі быў прыняты закон «Аб правах дзіцяці». Ён прадугледжвае паляпшэнне ўмоў жыцця і развіцця дзяцей.

Беларусь працягвае наладжваць узаемаадносіны з рознымі краінамі свету амаль на ўсіх кантынентах. Развіццю міжнародных сувязяў спрыяюць двухбаковыя візіты ўрадавых дэлегацый і кіраўнікоў дзяржаў.

Наша краіна стварае спрыяльныя ўмовы для ўмацавання сувязяў з краінамі Еўропы, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Наладжваецца плённы дыялог з ЗША, працягваецца ўзаемадзеянне ў розных міжнародных арганізацыях, у тым ліку па пытаннях дапамогі Беларусі ў ажыццяўленні чарнобыльскай праграмы.

Беларусь падтрымлівае цесныя сувязі з міратворчымі арганізацыямі. Таксама рэспубліка праводзіць актыўную дзейнасць у галіне міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі, раззбраення і кантролю над узбраеннямі. Наша краіна, напрыклад, на справе ажыццявіла дагавор аб скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў.

Беларусь добраахвотна адмовілася ад ядзернай зброі. Яшчэ ў 1996 годзе ядзерная зброя была поўнасцю вывезена за межы нашай краіны.

Другім крокам на шляху раззбраення стала падпісанне ў лютым 1995 года Канцэпцыі калектыўнай бяспекі краін СНД.

Такія пагадненні дапамагаюць забяспечваць права народаў на мірнае жыццё.

1. Як змяніліся міжнародныя адносіны Беларусі з іншымі краінамі пасля абвяшчэння дзяржаўнай незалежнасці?
2. З якімі буйны́мі міжнароднымі арганізацыямі ўзаемадзейнічае Беларусь?
3. З якімі краінамі Рэспубліка Беларусь умацоўвае свае эканамічныя сувязі?
4. Калі Рэспубліка Беларусь адмовілася ад ядзернай зброі? Адкажыце з дапамогай тэксту параграфа.
5. Як Беларусь удзельнічае ў раззбраенні і міратворчай дзейнасці? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.

Да пачатку 1990-х гадоў Беларусь была самай «узброенай» рэспублікай. На яе тэрыторыі знаходзілася амаль 30 % усіх ядзерных боепрыпасаў былога СССР.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вялікая колькасць ядзернай зброі пагражала не толькі былым праціўнікам СССР, але несла экалагічную небяспеку і для самой Беларусі. Ужо ў Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» было абвешчана, што Беларусь мае на мэце зрабіць сваю тэрыторыю бяз'ядзернай зонай, а рэспубліку — **нейтральнай дзяржавай**[1].

## 49. Перабудова гандлёва-эканамічных і навуковых сувязяў Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе

1. З якімі краінамі падтрымлівала эканамічныя сувязі Беларусь у савецкі перыяд?
2. Якія эканамічныя пераўтварэнні мелі месца ў СССР у перыяд перабудовы?

З 1992 года змяніліся гандлёва-эканамічныя сувязі рэспублікі з замежнымі краінамі. Створаныя ў рэспубліцы эканамічныя ўмовы, а таксама выгаднае геаграфічнае становішча садзейнічалі развіццю новых формаў знешнеэканамічных адносін. Пачалося стварэнне сумесных з замежнымі фірмамі прадпрыемстваў, усталяванне прамых вытворчых і навукова-тэхнічных сувязяў паміж партнёрамі розных краін. Так, адным з першых яшчэ ў 1988 годзе пачало выпускаць прадукцыю сумеснае прадпрыемства «Белвест», створанае Віцебскай абутковай фабрыкай і заходнегерманскай фірмай.

У далейшым вялікая колькасць прадпрыемстваў і аб'яднанняў рэспублікі ўсталявалі прамыя вытворчыя і навукова-тэхнічныя сувязі з замежнымі партнёрамі. У іх ліку — аб'яднанні «БелаўтаМАЗ», «Мінскі трактарны завод», «Палімір», «Атлант» і іншыя. Аднак да сярэдзіны 1990-х гадоў устойлівых вытворчых адносін дасягнута не было. Ва ўзаемаадносінах паміж рознымі прадпрыемствамі пераважаў тавараабмен. Прадпрыемствы замест продажу сваёй прадукцыі абменьваліся таварамі. Галоўнай перашкодай з'яўлялася няўстойлівасць эканамічнага становішча рэспублікі, адсутнасць рынычных адносін.

[1] **Нейтра́льная дзяржа́ва** — краіна, якая не ўмешваецца ў справы іншых дзяржаў свету і іх узброеныя канфлікты (войны). Спрэчныя пытанні з іншымі краінамі яна вырашае толькі мірнымі сродкамі (шляхам перагавораў).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Станоўчаму вырашэнню гэтых праблем паспрыяла ўзаемадзеянне з дзяржавамі СНД. Паступова паляпшаліся эканамічныя сувязі з краінамі далёкага замежжа.

Зараз Рэспубліка Беларусь падтрымлівае адносіны з замежнымі краінамі як у эканоміцы, так і ў галінах навукі і культуры. Вялікая колькасць інстытутаў Акадэміі навук Беларусі і даследчых установаў розных краін ажыццявілі за гэтыя гады сумесную навуковую працу. Штогод больш за 5 тысяч замежных студэнтаў навучаюцца ў ВНУ і каледжах рэспублікі. Праводзяцца дні нацыянальных культур, абмены прафесійнымі і самадзейнымі калектывамі, выставамі, кінафільмамі.

Сёння Беларусь працягвае работу па ўмацаванні эканамічнага ўзаемадзеяння краін СНД. Надаецца вялікая ўвага развіццю двухбаковых эканамічных адносін з рознымі дзяржавамі свету. Напрыклад, актыўна ўмацоўваюцца эканамічныя сувязі з Кітаем, рэалізуюцца важныя для нашай краіны сумесныя праекты. Наладжваюцца сувязі з краінамі Лацінскай Амерыкі, напрыклад, Венесуэлай, якая мае вялікія запасы нафты. Наша дзяржава атрымала правы на распрацоўку нафтавых радовішчаў у гэтай краіне. Рэспубліка Беларусь актыўна развівае свае зносіны з краінамі Афрыкі, куды яна пастаўляе сельскагаспадарчую тэхніку і мінеральныя ўгнаенні. Наладжваюцца гандлёва-эканамічныя адносіны з краінамі Азіі. Усё гэта спрыяе паляпшэнню стану эканомікі Беларусі.




Прадукцыя фабрыкі «Спартак» на міжнароднай выставе



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як змяніліся гандлёва-эканамічныя сувязі Рэспублікі Беларусь з 1992 года?
2. З якімі краінамі Рэспубліка Беларусь развівае свае адносіны? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
3. Як умацоўваюцца эканамічныя сувязі Рэспублікі Беларусь з краінамі замежжа?
4. Якім чынам развіваецца супрацоўніцтва нашай краіны з іншымі краінамі ў галінах навукі і культуры?

У 2000 годзе ўраджэнец Беларусі Жарэс Алфёраў атрымаў пачэсную міжнародную Нобелеўскую прэмію. Яго вынаходніцтвы ў галіне навукі далі магчымасць чалавеку карыстацца сёння якаснымі мабільнымі тэлефонамі, пультамі кіравання, сонечнымі батарэямі і многім іншым. Жарэс Алфёраў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Ён з'яўляецца ганаровым грамадзянінам горада Віцебска.

## 50. Паўсядзённае жыццё беларускага народа ў 1990-х — пачатку 2000-х гадоў

1. Як змянілася жыццё беларускага народа ў пасляваенны перыяд?
2. Якія падзеі адмоўна паўплывалі на ўзровень жыцця беларускага народа ў канцы 1980-х гадоў?

Распад СССР адбіўся на многіх аспектах жыцця беларускага народа, у тым ліку і на грашовай сістэме. У 1992 годзе беларускі Нацыянальны банк увёў у абарачэнне беларускі рубель.

Краіны былога СССР таксама перайшлі да рэфармавання эканомікі. Але перыяд пераходу да рыначных адносін меў вельмі цяжкія наступствы для людзей. Напрыклад, у Расіі з магазінаў зніклі прадукты харчавання першачарговага значэння — хлеб, малако, крупы. На той момант жыхары Рэспублікі Беларусь былі забяспечаны гэтымі таварамі ў дастатковай колькасці. Аднак спадзяванне палепшыць сваё матэрыяльнае становішча прывяло да таго, што людзі скуплялі розныя тавары і вывозілі іх на продаж у суседнія краіны. У выніку ў рэспубліцы хуткімі тэмпамі нарастаў дэфіцыт спажывецкіх тавараў. Найбольш яскрава ён праявіўся ў 1993—1994 гадах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сучасны жылы комплекс «Вівальдзі» ў Мінску

Сітуацыя пачала выпраўляцца з сярэдзіны 1990-х гадоў. Перш за ўсё быў умацаваны кантроль за рэалізацыяй спажывецкай прадукцыі. Уводзіліся абмежаванні на вываз прадуктаў харчавання за межы рэспублікі.

Заработная плата была не вельмі вялікай, але дзяржава гарантавала яе выплату. На кожным Усебеларускім народным сходзе ставілася задача спрыяць павышэнню ўзроўню жыцця насельніцтва. Перад урадам паўстала пытанне садзейнічання павелічэнню заработнай платы.

З пачатку 2000-х гадоў пачаўся рост дабрабыту народа. Пра гэта можна меркаваць перш за ўсё па пакупках, якія робяць грамадзяне нашай краіны. Усё больш набываецца аўтамабіляў, бытавой тэхнікі. Аднак па-ранейшаму значную частку выдаткаў у сем'ях беларусаў складаюць траты на прадукты харчавання.

Яшчэ адной праблемай, якая не да канца вырашана, з'яўляецца жыллёвая. У Беларусі амаль не засталося сем'яў, якія жывуць у непрыстасаваных для жылля памяшканнях. Аднак пры гэтым вялікая колькасць людзей мае патрэбу ў паляпшэнні сваіх жыллёвых умоў. Дзеля гэтага ў дзяржаве распрацаваны цэлы шэраг праграм. Дзякуючы ім людзі маюць, напрыклад, магчымасць узяць у банку пазыку, каб пабудаваць сабе кватэру альбо дом.

?

1. Якія наступствы для людзей меў пераход да рыначнай эканомікі ў пачатку 1990-х гадоў?
2. Якім чынам кіраўніцтва рэспублікі ў сярэдзіне 1990-х гадоў спрабавала навесці парадак у гандлі спажывецкімі таварамі?
3. Раскажыце, як палепшыліся ўмовы жыцця нашага народа з 2000-х гадоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 51. Родная мова

1. Назавіце перыяды ў гісторыі нашай краіны, калі беларуская мова з'яўлялася дзяржаўнай.
2. Каму са знакамітых людзей належаць словы: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі»? Як вы разумееце гэтыя словы?

Беларускі народ заўсёды імкнуўся да адраджэння роднай мовы і культуры. Рэальная магчымасць вяртання да гістарычных каранёў з'явілася з набыццём Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту.

Важнае значэнне ў культурна-нацыянальным адраджэнні належыць стварэнню спрыяльных умоў для развіцця і ўжывання роднай мовы. Але гэты шлях быў таксама няпросты.

Пасля ўсенароднага абмеркавання Вярхоўны Савет БССР у студзені 1990 года прыняў Закон «Аб мовах у Беларускай ССР». У ім было вызначана, што дзяржаўнай мовай Беларусі з'яўляецца беларуская мова. Разам з тым закон прадугледжваў права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін. Не забаранялася таксама свабоднае развіццё і ўжыванне іншых нацыянальных моў.

У гэтым жа годзе была прынята Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР.

Так быў пакладзены пачатак адраджэнню беларускай мовы і набыццю ёю статусу дзяржаўнай. Найбольш істотныя вынікі ў выкананні Закона «Аб мовах у Беларускай ССР» былі дасягнуты ў адукацыі. Да сярэдзіны 1990-х гадоў на беларускую мову навучання перайшлі многія школы, вышэйшыя навучальныя ўстановы і тэхнікумы. Беларуская мова з'явілася і ў дзяржаўным справаводстве.

Аднак паскораны ўвод беларускай мовы прывёў да росту незадаволенасці значнай часткі насельніцтва. Яна ўспрымала гэта як уціск у дачыненні рускай мовы. Таму пытанне аб статусе рускай мовы ў Беларусі было вынесена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкам на ўсебеларускі рэферэндум.

На рэферэндуме 14 мая 1995 года большасць насельніцтва, якое прымала ў ім удзел, выказалася за наданне ў Беларусі статусу дзяржаўнай мовы не толькі беларускай, але і рускай мове. Палажэнне аб існаванні дзвюх раўнапраўных моў у Беларусі замацавана ў новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Дзень беларускага пісьменства ў горадзе Хойнікі

Дзяржава актыўна падтрымлівае працэсы развіцця беларускай мовы. У нацыянальнай сістэме адукацыі больш увагі надаецца вывучэнню роднай мовы. Штогод, пачынаючы з 1994 года, у нашай краіне адзначаецца Дзень беларускага пісьменства. Ён стаў нацыянальным святам і значнай з'явай культурнага жыцця краіны. Гэта, у сваю чаргу, служыць захаванню і развіццю беларускай мовы, абуджэнню нацыянальнай свядомасці беларусаў.

Намаганні дзяржавы спрыяюць працэсам нацыянальнага адраджэння, у тым ліку пашырэння ўжывання беларускай мовы і аднаўлення традыцый беларускага народа. З 1997 года прысуджаецца нацыянальная прэмія «За духоўнае адраджэнне». У сувязі з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2009 год быў абвешчаны ў нашай краіне Годам роднай зямлі. Ужо на працягу некалькіх гадоў аднаму з беларускіх гарадоў надаецца статус культурнай сталіцы Беларусі. Гэтага звання ўдастоены гарады Полацк, Гомель, Нясвіж, Магілёў, Гродна, Брэст.

**?**

1. Якія змены адбыліся ў развіцці беларускай мовы пасля 1990 года?
2. Чаму ў Беларусі існуюць дзве дзяржаўныя мовы?
3. Які дзяржаўны закон падтрымлівае развіццё беларускай мовы?
4*. Як вы лічыце, чаму беларуская мова ў сябе на Радзіме мае патрэбу ў падтрымцы з боку дзяржавы?
5*. Чаму адраджэнне беларускай мовы займае першараднае месца ў нацыянальным адраджэнні Беларусі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Як ставяцца да беларускай мовы ў вашай сям'і? Прывядзіце прыклады захоўвання вашай сям'ёй беларускіх традыцый. Паразважайце з бацькамі ці іншымі сваякамі на гэты конт.

**З Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі)**

Артыкул 17. Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы.

<...>

Артыкул 50. Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, таксама як ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання нацыянальнай прыналежнасці…

Кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання.

## 52—53. Нацыянальна-культурнае развіццё суверэннай Беларусі

1. Што такое нацыянальна-культурнае адраджэнне? Праверце сябе па слоўніку.
2. Калі і ў сувязі з якімі падзеямі пачынаецца нацыянальна-культурнае адраджэнне? Прывядзіце вядомыя вам прыклады.
3. Назавіце прозвішчы знакамітых людзей, якія актыўна садзейнічалі нацыянальна-культурнаму адраджэнню.
4*. Які ўплыў на нацыянальна-культурнае развіццё мае адраджэнне беларускай мовы?

Пасля набыцця Рэспублікай Беларусь незалежнасці пачала фарміравацца нацыянальная сістэма адукацыі. У агульнаадукацыйнай, прафесійнай і вышэйшай школах адбыліся змены. Іх мэтай было палепшыць стан адукацыі. У школах уводзіліся новыя вучэбныя прадметы, напрыклад, асновы інфарматыкі. Былі створаны новыя навучальныя ўстановы — ліцэі і гімназіі. У прафесійна-тэхнічных вучылішчах разам з атрыманнем агульнай сярэдняй адукацыі навучэнцы праходзілі падрыхтоўку па шматлікіх прафесіях. З'явіліся вышэйшыя прафесійныя вучылішчы, дзе навучэнцы атрымоўвалі адначасова прафесійна-тэхнічную і сярэднеспецыяльную падрыхтоўку.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Частка тэхнікумаў была пераўтворана ў каледжы для падрыхтоўкі спецыялістаў больш высокай кваліфікацыі. У вышэйшых навучальных установах быў створаны шэраг новых сучасных спецыяльнасцяў. З 1990-х гадоў сталі адкрывацца недзяржаўныя навучальныя ўстановы, у якіх навучанне ажыццяўлялася на платнай аснове. Яны сталі існаваць паралельна з дзяржаўнымі ўстановамі. З 1997 года праходзілі з'езды настаўнікаў, на якіх вырашаліся задачы далейшага развіцця адукацыі. З 2011 года ў галіне адукацыі пачаў дзейнічаць агульны дакумент — «Кодэкс аб адукацыі».

На сённяшні дзень Беларусь з'яўляецца краінай з высокаадукаваным грамадствам. Гэтаму спрыяе дзейнасць больш чым 7 тысяч бібліятэк. Толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі налічваецца каля 9 мільёнаў кніг.

Беларуская літаратура развіваецца і радуе сваіх чытачоў цікавымі і разнастайнымі творамі.

Важнае месца ў творчасці шэрагу пісьменнікаў атрымала мінулае Беларусі. Выйшлі раманы Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды». У іх расказваецца пра падзеі з гісторыі беларускага народа ў часы існавання Полацкага княства і Вялікага Княства Літоўскага.

Беларускія пісьменнікі закранаюць тэму жыцця беларусаў у даваенны перыяд і ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Гэта творы Вячаслава Адамчыка «Голас крыві брата твайго», народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава «Не ўсе мы згінем» і іншыя.

У творах Івана Шамякіна («Злая зорка»), Святланы Алексіевіч («Чарнобыльская малітва») асэнсоўваюцца мінулае і сённяшнія дні, у тым ліку чарнобыльская трагедыя.

Кнігі вершаў «Зямля ў мяне адна» Пімена Панчанкі і «Незалежнасць» Ніла Гілевіча прысвечаны беларусам і іх імкненню да свабоды і самабытнасці.

Сучасная беларуская літаратура высока ацэньваецца ва ўсім свеце. Прыклад таму — уганараванне пісьменніцы Святланы Алексіевіч у кастрычніку 2015 года высокай міжнароднай узнагародай — Нобелеўскай прэміяй. Яе творы «Апошнія сведкі», «У вайны не жаночы твар» і іншыя сталі сусветна вядомымі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З набыццём незалежнасці ў беларускім выяўленчым мастацтве з’явіліся новыя мастацкія творы і новыя імёны. У Мінску і абласных цэнтрах краіны сталі актыўна праводзіцца выставы. Значная частка мастакоў Беларусі звяртаецца да гістарычных вобразаў. Напрыклад, мастак Уладзімір Стэльмашонак стварыў галерэю партрэтаў Радзівілаў, палатно «Славутасці Беларусі. Вялікія князі Літоўскія».

Знакаміты «Габелен стагоддзя» беларускага мастака Аляксандра Кішчанкі ўнесены ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Гэты самы вялікі ў свеце габелен вытканы ўручную. Плошча яго складае 266 квадратных метраў, а вага — 286 кілаграмаў.

Беларускае мастацтва напоўнена любоўю да роднага краю і свайго народа. Нацыянальным духам прасякнуты творы вядомага графіка і жывапісца Мікалая Селешчука, а таксама ўшанаваных ордэнам Францыска Скарыны мастакоў Леаніда Шчамялёва, Гаўрылы Вашчанкі, Міхаіла Савіцкага.

Па праектах беларускіх скульптараў быў створаны шэраг помнікаў гістарычным асобам: Рагнедзе і Ізяславу ў Заслаўі, Ефрасінні Полацкай у Полацку, Міколу Гусоўскаму і іншым знакамітым асобам у Мінску, у дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У апошнія гады ўстаноўлены манументы, прысвечаныя многім вядомым творцам, якія праславілі нашу краіну. Сярод іх — помнікі аднаму з першых беларускіх друкароў Сымону Буднаму ў Нясвіжы, асветніку 12 стагоддзя Кірылу Тураўскаму ў Тураве. У гонар польскага і беларускага паэта Адама Міцкевіча ўзведзены манументы ў Навагрудку і Мінску. Бела-




Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рускаму першадрукару Францыску Скарыне ўстаноўлены помнікі на яго радзіме ў Полацку і ў Мінску каля Нацыянальнай бібліятэкі.

Развіваецца тэатральнае мастацтва Беларусі. Плённа працуюць нацыянальныя акадэмічныя Вялікі тэатр оперы і балета, тэатр імя Янкі Купалы, драматычны тэатр імя Максіма Горкага ў Мінску. Карыстаюцца вялікай папулярнасцю пастаноўкі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску. Цікавыя музычныя спектаклі можна паглядзець на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. Радуюць дзяцей сваімі пастаноўкамі Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача, Дзяржаўны тэатр лялек і іншыя.

У рэпертуарах многіх тэатраў вядучае месца занялі спектаклі на гістарычную і нацыянальную тэматыку. Сярод іх — «Князь Вітаўт», «Чорная панна Нясвіжа» Аляксея Дударава, «Звон — не малітва» Івана Чыгрынава, «Тутэйшыя» Янкі Купалы. Выклікае вялікую цікавасць опера Уладзіміра Солтана «Дзікае паляванне караля Стаха» і іншыя тэатральныя пастаноўкі, прысвечаныя мінуламу нашай краіны.

Шырокую вядомасць у Беларусі і за яе межамі набыў Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Вялікай заслугай гэтага аркестра з'яўляецца папулярызацыя беларускай музыкі.

Рэспубліка Беларусь мае высокапрафесійныя калектывы. Сярод іх — Акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі, дзяржаўныя акадэмічныя харавая капэла імя Рыгора Шырмы і сімфанічны аркестр. Традыцыі фальклору працягваюць нацыянальныя акадэмічныя народныя



Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Нацыянальны акадэмічны народны аркестр імя Іосіфа Жыновіча



Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі»

аркестр імя Іосіфа Жыновіча і хор імя Генадзя Цітовіча, Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» і іншыя.

Вялікую ролю ў жыцці рэспублікі адыгрываюць разнастайныя фестывалі. Стаў традыцыйным Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. Папулярныя сярод насельніцтва і гасцей Беларусі міжнародныя музычныя фестывалі «Славянскі базар» у Віцебску і «Магутны Божа» ў Магілёве. Яны спрыяюць адкрыццю новых таленавітых імёнаў у мастацтве.

Міжнародны ўзровень набыў кінафестываль «Лістапад». На апошнім фестывалі ў лістападзе 2015 года свае мастацкія стужкі прадставілі 60 краін свету. У Мінск з'ехаліся знакамітыя рэжысёры і зоркі сусветнага кіно. Сярод гледачоў павялічваецца колькасць прыхільнікаў мастацкіх і дакументальных стужак, якія створаны на кінастудыі «Беларусьфільм». У 2010 годзе выйшаў на экран фільм «Брэсцкая крэпасць» — першы сумесны творчы праект Саюзнай дзяржавы. У 2012 годзе зняты фільм «У тумане» паводле аднайменнай аповесці Васіля Быкава. Кінастужка была адзначана прызамі на кінафестывалях «Лістапад» у Мінску і ў Канах (Францыя).

Вялікую справу захавання і папулярызацыі мастацкіх каштоўнасцяў робяць музеі. Іх колькасць за апошнія гады значна павялічылася. Самай буйной скарбонкай твораў выяўленчага мастацтва з'яўляецца Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь. Немалую зацікаўленасць у жыхароў і гасцей Беларусі выклікае Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Вікторыя Азаранка і Максім Мірны — пераможцы Алімпійскіх гульняў 2012 года

Значных поспехаў дасягнула наша краіна ў развіцці фізічнай культуры і спорту. Пацвярджэнне гэтаму — вынікі выступленняў беларускіх спартсменаў на міжнародных спаборніцтвах. Дзяржава надае ўвагу развіццю розных відаў спорту: хакея, футбола, тэніса, біятлона. Сярод беларускіх спартсменаў шмат алімпійскіх чэмпіёнаў і чэмпіёнаў свету. Сусветна вядомымі сталі спартсмены Віталь Шчэрба, Іван Іванкоў (спартыўная гімнастыка), Яніна Карольчык (штурханне ядра) і Юлія Несцярэнка (бег). Алімпійскія медалі прынеслі Радзіме Аляксей Грышын, Ала Цупер (фрыстайл), Аляксандра Герасіменя (плаванне), Дар'я Домрачава (біятлон) і іншыя. Неаднаразова атрымлівалі перамогу на міжнародных турнірах беларускія тэнісісты Вікторыя Азаранка і Максім Мірны. У краіне адкрываюцца сучасныя спартыўныя комплексы, у якіх праходзяць падрыхтоўку спартсмены, праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы. У фізкультурна-аздараўленчых комплексах жыхары рэспублікі таксама могуць умацаваць сваё здароўе ў вольны час.

?

1. Якія змены адбыліся ў адукацыі пасля набыцця нашай краінай незалежнасці? Пры адказе выкарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.
2. Чым адрозніваюцца дзяржаўныя і недзяржаўныя ўстановы адукацыі?
3. Аб чым пішуць беларускія пісьменнікі і паэты? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
4. Назавіце імёны беларускіх мастакоў і іх творы. Скарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Каму са знакамітых беларусаў устаноўлены помнікі ў апошні час? Адкажыце, абапіраючыся на тэкст параграфа.
6. Як развіваецца тэатральнае мастацтва Беларусі? Пры адказе выкарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.
7. Якую назву мае кінастудыя, дзе здымаюць беларускія фільмы?
8. Назавіце вядомыя музычныя калектывы. Выкарыстайце тэкст параграфа.
9. Якія фестывалі праходзяць у Беларусі? Знайдзіце адказ у тэксце вучэбнага дапаможніка.
10. У якім музеі можна пазнаёміцца з творамі вядомых мастакоў?
11. Якія поспехі маюць спартсмены Беларусі? Пры адказе выкарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.
12*. Што спрыяла нацыянальна-культурнаму развіццю сучаснага беларускага грамадства?

Разам з бацькамі ці класам пабывайце на канцэртах беларускіх калектываў і дзеячаў мастацтваў. Раскажыце пра свае ўражанні.

Дзяржава надае вялікую ўвагу захаванню помнікаў айчыннай гісторыі і культуры. Сёння на тэрыторыі Беларусі налічваецца больш за 15 тысяч такіх помнікаў. Іх колькасць магла быць і значна большай, калі б не шматлікія войны, ад якіх пацярпела беларуская зямля. Падчас гэтых войнаў значная частка нацыянальных каштоўнасцяў загінула або была вывезена за межы Беларусі.

Дзяржава робіць вялікія намаганні, каб вярнуць на радзіму тую спадчыну, што апынулася за мяжой. Фінансуецца аднаўленне помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Беларусі. Напрыклад, былі выдаткаваны значныя сродкі для рэстаўрацыі Мірскага замка — помніка архітэктуры 16 стагоддзя. Сёння гэта не толькі гістарычны помнік, але і важны турыстычны аб'ект. У шматлікіх залах замка — цудоўныя ўзоры старажытнай мэблі, музычных інструментаў. Ёсць таксама калекцыі рыцарскай зброі, адзення, твораў жывапісу і прадметаў побыту.

Пасля сур'ёзных аднаўленчых работ адчыніўся ва ўсёй сваёй прыгажосці Нясвіжскі замак. У цяперашні час ён з'яўляецца нацыянальным гісторыка-культурным музеем-запаведнікам.

Каля стэлы «Мінск — горад-герой» у Мінску адкрыўся новы будынак музея Вялікай Айчыннай вайны. Жыхары і госці сталіцы, што наведваюць музей, маюць магчымасць адпачыць у парку Перамогі, які раскінуўся ля музея.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 54. Паўтарэнне і абагульненне па тэме «Незалежная Рэспубліка Беларусь» (параграфы 37—53)

**1.** Выберыце правільны варыянт адказу, карыстаючыся тэкстам вучэбнага дапаможніка. Праверце сябе па слоўніку ці табліцы «Асноўныя гістарычныя даты» (у канцы вучэбнага дапаможніка).

1) Суверэнітэт — гэта:

а) саюз паміж дзяржавамі;

б) незалежнае і самастойнае ажыццяўленне дзяржавай сваёй знешняй і ўнутранай палітыкі.

2) Пастанова «Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР» была прынята:

а) у 1989 годзе;

б) у 1990 годзе;

в) у 1991 годзе.

3) Наданне нашай краіне назвы Рэспубліка Беларусь адбылося:

а) 27 ліпеня 1989 года;

б) 19 верасня 1991 года;

в) 25 жніўня 1991 года.

4) Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) адзначаецца:

а) 3 ліпеня;

б) 27 ліпеня;

в) 25 жніўня.

5) Сучасная дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь прынята:

а) 19 верасня 1991 года;

б) 14 мая 1995 года.

6) Штаб-кватэрай СНД з'яўляецца горад:

а) Масква;

б) Кіеў;

в) Мінск.

7) Новая рэдакцыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь была прынята:

а) 15 сакавіка 1994 года;



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

б) 24 лістапада 1996 года.

8) Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца:

а) беларуская;

б) руская;

в) беларуская і руская.

**2.** Аднавіце правільную храналагічную паслядоўнасць падзей:

а) Усесаюзны рэферэндум аб захаванні СССР;

б) Дагавор аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі;

в) Дэкларацыя «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі»;

г) стварэнне Саюза Беларусі і Расіі.

**3.** Правільна суаднясіце даты і гістарычныя падзеі. Выкарыстайце табліцу «Асноўныя гістарычныя даты» (у канцы вучэбнага дапаможніка).

| | |
|---|---|
| стварэнне Супольнасці Беларусі і Расіі | 1996 год |
| стварэнне Саюза Беларусі і Расіі | 1997 год |
| падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы | 1994 год |
| першыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | 1999 год |

**4.** Растлумачце, як вы разумееце паняцці: «прававая дзяржава», «сацыяльная дзяржава», «рэферэндум», «дэпутат», «кандыдат». Выкарыстайце слоўнік тэрмінаў і паняццяў у канцы вучэбнага дапаможніка.

**5.** Дапоўніце сказ назвамі гарадоў.

*Скульптурныя помнікі дзеячам культуры Беларусі пабудаваны:*

*Кірылу Тураўскаму ў ... ,*

*Францыску Скарыну ў ... .*

Дапоўніце спіс вядомых вам знакамітых людзей Беларусі і назавіце месцы, дзе ім узведзены помнікі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# СТАЛІЦА І АБЛАСНЫЯ ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ

## 55. Мінск — сталіца нашай дзяржавы. Гістарычнае мінулае Мінска

1. Ад чаго ўтварылася назва горада?
2. На беразе якой ракі знаходзіцца Мінск?
3. Калі горад упершыню згадваецца ў летапісе?
4. З якой падзеяй звязана такое ўпамінанне?



Сучасны герб горада Мінска

Горад Мінск — сталіца нашай краіны. Як вы памятаеце, упершыню Мінск згадваецца ў летапісе ў 1067 годзе. Мінску больш за 900 гадоў. Назва горада, на думку вучоных, паходзіць ад назвы ракі Менка.

У далёкую мінуўшчыну на беразе ракі з'явіліся першыя паселішчы людзей. Праз некаторы час на Замкавай гары вырасла гарадзішча, абнесенае земляным валам. Археалагічныя раскопкі дапамаглі даведацца аб тым, якім быў Мінск у старажытнасці.

Горад, размешчаны на скрыжаванні дарог, хутка рос і мацнеў. Спачатку Мінск уваходзіў у склад Полацкага княства. Падчас войнаў паміж княствамі горад некалькі разоў быў разбураны. У пачатку 12 стагоддзя ён стаў галоўным горадам Мінскага княства. У ім існавалі свае веча і дружына. Горадам правілі многія знакамітыя князі. Так, у 1418 годзе ён перайшоў да вялікага князя літоўскага Вітаўта. У грамаце 1444 года Мінск названы ў ліку 15 найбольш развітых гарадоў Вялікага Княства Літоўскага. Зручнае геаграфічнае становішча садзейнічала развіццю і ператварэнню яго ў буйны́ цэнтр рамяства і гандлю. Гандлёвыя сувязі з іншымі гарадамі і землямі не прыпыняліся ні частымі войнамі, ні сутычкамі мясцовай знаці. У Мінск з поўдня прывозілі шкляныя вырабы, аліўкавы алей, з Прыбалтыкі — бурштын. Разам з гандлем аснову жыцця горада складала рамяство. Сярод мінскіх рамеснікаў былі ганчары, кавалі, шаўцы, гарбары, цесляры, сталяры, ювеліры, збройнікі і іншыя. Гара-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Мінская ратуша



Траецкае прадмесце

джане займаліся таксама рыбнай лоўляй, бортніцтвам, паляваннем, вырошчваннем сельскагаспадарчых культур, жывёлагадоўляй і іншым.

У 1499 годзе горад атрымаў права на самакіраванне. Была пабудавана гарадская ратуша. У 1591 годзе ў Мінска з'явіўся герб — на блакітным полі Божая Маці паміж двума анёламі і херувімамі. Амаль такім ён застаўся і па сённяшні дзень.

Гісторыя горада багатая і трагічная. Шмат разоў яго спусташалі і разбуралі ворагі. Гэта было і ў часы Старажытнай Русі, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, і ў перыяд уваходжання ў склад Расійскай дзяржавы.

Не застаўся Мінск убаку і ад рэвалюцыйных падзей 1905—1907 гадоў. У горадзе дзейнічала мноства актыўных членаў партыі бальшавікоў. Першая сусветная вайна зрабіла Мінск горадам, праз які прайшлі наступаючыя і адступаючыя войскі абодвух бакоў. Насельніцтва горада ў гэты час павялічылася ў шмат разоў за кошт бежанцаў. На вуліцах Мінска праходзілі мітынгі і дэманстрацыі незадаволеных сваім становішчам працоўных. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года аж да жніўня 1920 года Мінск і яго жыхары не мелі магчымасці займацца мірнай працай. У 1918 годзе горад быў акупаваны германскімі войскамі, у 1919 годзе — польскімі.

Цяжкімі выдаліся першыя гады савецкай улады: горад быў амаль разбураны, панавалі голад, холад, не хапала паліва. Але ўжо ў 1921 годзе пачалі выпускаць прадукцыю першыя аднаўленыя мінскія заводы і фабрыкі. Жыццё паступова наладжвалася. У тым жа годзе быў засна-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ваны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У Мінск за «навукай» пачалі прыязджаць юнакі і дзяўчаты з усёй Беларусі. Сталіца БССР ператварылася ў цэнтр творчай дзейнасці шматлікіх прадстаўнікоў навукі і культуры. Адчыніў свае дзверы для гледачоў драматычны тэатр. За гады першых пяцігодак Мінск стаў моцным прамысловым і культурным цэнтрам Савецкага Саюза.

1. Якім быў Мінск у мінулым?
2. Што садзейнічала развіццю горада і ператварэнню яго ў буйны цэнтр рамяства і гандлю?
3. Як развіваліся гандлёвыя сувязі горада?
4. Чым займаліся гараджане?
5. Калі горад атрымаў права на самакіраванне?
6. Апішыце герб горада Мінска.
7. Якія войны перажыў наш горад?
8. Узгадайце, якія падзеі перажыў Мінск у час рэвалюцыі 1905—1907 гадоў.
9. Якія змены адбыліся ў горадзе за гады Савецкай улады?

**1.** Разгледзьце выяву герба Мінска на с. 165. Апішыце яго. Дзе яго можна ўбачыць?
**2.** Разам з настаўнікам падрыхтуйце план расказу пра горад Мінск. Раскажыце пра сталіцу Беларусі з дапамогай гэтага плана.

Пакажыце горад Мінск на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац).

**1.** У гісторыі Мінска многа старонак, якія апавядаюць пра славу і цяжкія часы. Больш як 200 гадоў горад меў права на самакіраванне. Гарадская ратуша была сімвалам гэтага права. У ёй праходзілі пасяджэнні, на якіх разглядаліся важныя пытанні жыцця горада. Пасля ўваходжання ў склад Расійскай дзяржавы ў 1795 годзе Мінск страціў права на самакіраванне. Каб гэта падкрэсліць, была знесена і Мінская ратуша. Такі загад даў расійскі цар.

Гэтая памылка была выпраўлена толькі ў наш час. У 2004 годзе адбылося ўрачыстае адкрыццё адноўленай прыгажуні-ратушы. На вежы — гадзіннік і герб Мінска. Кожную гадзіну гучыць мелодыя з «Песні пра Мінск», якую напісаў народны кампазітар Беларусі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Дом-музей
Першага з'езда РСДРП

Ігар Лучанок. У ратушы ёсць музей горада, зала пасяджэнняў для прыёму важных гасцей і правядзення гарадскіх урачыстых мерапрыемстваў. Захапляе мінчан і гасцей сталіцы таксама месца вакол ратушы. Тут ладзяцца канцэрты, выставы і шмат іншых мерапрыемстваў.

**2.** На беразе ракі Свіслач сярод пышнай зеляніны дрэў стаіць аднапавярховы невялікі па памеры дом. Некаторыя здзіўляюцца, як ён мог захавацца ў цэнтры такога сучаснага горада. Бадай, добры гаспадар дом даглядае.

На самай справе аказваецца, што гэта музей, і ён незвычайны. Ён — сведка далёкіх часоў, калі да Беларусі дакаціліся рэвалюцыйныя хваляванні. У гэтым доме праходзіў Першы з'езд РСДРП (Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі).

## 56. Мінск — галоўны гаспадарчы, палітычны і культурны цэнтр краіны

1. Што вы ведаеце пра сучасны Мінск?
2. Галоўным горадам якой вобласці ён з'яўляецца? Пакажыце яе на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац).

У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны горад Мінск адным з першых быў заняты фашыстамі. Амаль адразу тут былі створаны канцлагеры і гета. Туды траплялі не толькі ваеннапалонныя, але і мірныя жыхары. Ворагі сутыкнуліся з адважным супраціўленнем гараджан.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Сярод мінскіх падпольшчыкаў былі Мікалай Герасіменка, Мікалай Шугаеў, Ісай Казінец, Мікалай Кедышка, Іван Кабушкін і іншыя. «Страляючы горад», як яго называлі фашысты, не скарыўся ворагу. Сёння імёнамі падпольшчыкаў, партызан, абаронцаў і вызваліцеляў Мінска названы вуліцы і іншыя месцы горада.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Мінск быў амаль увесь зруйнаваны. Але горад падняўся з попелу і руін. У ***1974 годзе*** нашай сталіцы было прысвоена званне «Горад-герой» за гераізм і мужнасць, праяўленыя мінчанамі ў час вайны. Мінск быў узнагароджаны ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка». За нядоўгі пасляваенны час сталіца ператварылася ў адзін з буйнейшых і прыгажэйшых гарадоў Еўропы. Мінчане любяць і шануюць свой горад, захоўваюць яго славутую гісторыю.

Мінск — старажытны і адначасова малады.

«Брамай» сталіцы называюць Прывакзальную плошчу. Пасля Вялікай Айчыннай вайны тут былі пабудаваны два дамы, якія нагадваюць вежы. Насупраць іх на плошчы — будынак чыгуначнага вакзала. Непадалёку размясціўся і прасторны сучасны аўтавакзал.

Сёння ў Мінску больш за 600 вуліц і праспектаў.

Праспект Незалежнасці — цэнтральная магістраль горада. Уздоўж яе размешчаны Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Нацыянальная акадэмія навук, Беларускі дзяржаўны цырк, кінастудыя «Беларусьфільм».

Ёсць у горадзе яшчэ адна важная магістраль — Партызанскі праспект. Непадалёк ад яго пабудаваны буйны́я заводы — аўтамабільны, трактарны, маторны, велазавод.

Упрыгажэннем горада стаў праспект, названы ў гонар пераможцаў у Вялікай Айчыннай вайне, — праспект Пераможцаў. Побач з ім — аздобленае гранітам узбярэжжа Свіслачы. А пасярод ракі — востраў «Мужнасці і смутку» з капліцай. Гэта памяць пра нашых землякоў, што загінулі ў афганскай вайне. Непадалёк ад вострава, на беразе ракі — аздоба сённяшняга Мінска, гістарычнае Траецкае прадмесце.

На праспекце Пераможцаў узведзены Палац Незалежнасці. Каля яго высока ў неба ўздымаецца Дзяржаўны сцяг Беларусі на аднайменнай плошчы — плошчы Дзяржаўнага сцяга.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Гасцей, якія наведваюць нашу сталіцу, прыемна ўражвае прыгажосць яе плошчаў. Самая старажытная — плошча Свабоды. Вакол яе захаваліся помнікі 17—19 стагоддзяў, у тым ліку адноўлены будынак Мінскай ратушы.

Самая вялікая і ўрачыстая — плошча Незалежнасці. Тут знаходзяцца Дом урада, буйнейшыя навучальныя ўстановы краіны — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка.

А далей па праспекце Незалежнасці — Кастрычніцкая плошча. Тут узведзены велічны Палац Рэспублікі. Ёсць на плошчы Знак пачатку дарог Беларусі. Пачэснае месца заняла на праспекце Нацыянальная бібліятэка. Гэтыя прыгожыя месцы сталі любімымі ў мінчан і гасцей сталіцы. Тут праводзяцца шматлікія гарадскія мерапрыемствы. Адно з самых улюбёных і цікавых святаў — Дзень горада.

Беларускі народ захоўвае памяць аб тых, хто аддаў сваё жыццё за нашу свабоду. Гэтая памяць — у назве Партызанскага праспекта і праспекта Пераможцаў, у мануменце «Танк-вызваліцель» каля Дома афіцэраў. Каля манумента на плошчы Перамогі ў гонар загінуўшых запалены Вечны агонь.

Плошча Якуба Коласа раней называлася Камароўскай. А зараз так называюць вялікі рынак. Цэнтральнае месца на плошчы займае помнік паэту — песняру роднай зямлі Якубу Коласу. Побач з ім — постаці герояў яго твораў, увасобленыя ў граніце. Недалёка ад плошчы — будынак філармоніі, цэнтральны ўнівермаг «Мінск» (ЦУМ). Назвы гарадскіх вуліц захоўваюць для нас памяць і пра беларускіх паэтаў Янку Купалу і Максіма Багдановіча.



Плошча Якуба Коласа



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Спартыўна-забаўляльны комплекс «Мінск-Арэна»

На праспекце Незалежнасці знаходзіцца прыборабудаўнічы завод, дзе да вайны працаваў вядомы вам герой Вялікай Айчыннай вайны Трыфан Лук'яновіч. Зараз адна з мінскіх вуліц носіць яго імя. У гонар удзельніка партызанскага руху дзеда Талаша і юнага разведчыка Марата Казея таксама названы вуліцы.

Мінск прыгожы не толькі ў цэнтры. Жыхарам горада патрэбны новае жыллё, школы, магазіны, зоны адпачынку. Таму на месцы былых вёсак узводзяцца новыя прыгожыя мікрараёны, пракладваюцца новыя вуліцы. Будуюцца і новыя станцыі Мінскага метрапалітэна, першая лінія якога была ўведзена ў эксплуатацыю ў ***1984 годзе***.

Мінск прыгожы ў розныя поры года, але асабліва ў час, калі расцвітаюць мільёны кветак, пасаджаных руплівымі рукамі мінчан. Любімым месцам адпачынку жыхароў горада з'яўляюцца зялёныя зоны: Батанічны сад, парк Чалюскінцаў і іншыя.

На беразе Камсамольскага возера знаходзяцца парк Перамогі, манумент «Мінск — горад-герой», будынак музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Каля іх у святочныя дні праходзяць парады, дэманстрацыі, канцэрты.

Мінск — гэта і спартыўная сталіца. У горадзе пабудавана і адноўлена мноства стадыёнаў, спартыўных пляцовак, басейнаў. У 2014 годзе горад прыняў чэмпіянат свету па хакеі, які адбыўся на пляцоўках «Мінск-Арэны» і «Чыжоўка-Арэны».

Мінск з'яўляецца галоўным прамысловым цэнтрам краіны. У ім дзейнічае вялікая колькасць прадпрыемстваў. Яны выпускаюць мата-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

цыклы, веласіпеды, тралейбусы, халадзільнікі і маразільнікі, трактары, аўтамабілі і іншае. Прадукцыя беларускай вытворчасці карыстаецца вялікім попытам у краінах блізкага і далёкага замежжа.

1. Чаму горад заўсёды аднаўляўся пасля войнаў?
2. Чым праславіўся Мінск у часы Вялікай Айчыннай вайны?
3. Назавіце імёны слаўных абаронцаў горада.
4. Чаму пра Мінск можна сказаць, што ён — старажытны і адначасова малады горад?
5. Раскажыце пра галоўныя праспекты і плошчы сталіцы. Пры адказе выкарыстайце тэкст вучэбнага дапаможніка.
6. Якія цікавыя месцы адпачынку вам вядомы ў Мінску?
7. У якіх з іх вам даводзілася пабываць?
8. Якая прадукцыя выпускаецца на прадпрыемствах горада Мінска?

Складзіце кароткія апавяданні пра тых гістарычных асоб, імёны якіх носяць мінскія вуліцы.

Пабывайце ў Мінску. Наведайце краязнаўчы музей і музей Вялікай Айчыннай вайны.

## 57. Брэст. Гістарычнае мінулае

1. Што вы ведаеце пра гістарычнае мінулае Брэста?
2. Якое паданне аб назве горада дайшло да нашых дзён?
3. На якіх рэках узнік Брэст?
4. Калі горад упершыню згадваецца ў старажытным летапісе?
5. Якія падзеі звязаны з Брэсцкай крэпасцю? Раскажыце пра іх.

Летапісная назва горада Брэста — Бярэсце. Яна паходзіць ад слоў «бяроста», «бераст». Існуе легенда пра ўзнікненне горада. У далёкія часы багаты купец са сваімі таварышамі вёз тавар на продаж. Нечакана шлях абозу прыпыніла дрыгва, і жыццё падарожнікаў апынулася ў небяспецы. Падарожнікі ссеклі бярозы, якія раслі вакол, і па гэтым насціле сталі пераходзіць дрыгву. Так яны выйшлі на востраў, што быў між вялікай ракой і малым яе прытокам. А праз пэўны час, вяртаючыся пасля ўдалага гандлю, падарожнікі пабудавалі на гэтым востраве



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дамы. Так быў заснаваны горад. Яго назвалі Бярэсце. Першая згадка пра горад адносіцца да 1019 года. Па «ўзросце» гэта трэці горад пасля беларускіх гарадоў Полацка і Турава.



Сучасны герб горада Брэста

Старажытнае Бярэсце знаходзілася на гандлёвым шляху. Гэта спрыяла яго развіццю. У 1390 годзе першым з беларускіх гарадоў Бярэсце атрымала права на самакіраванне. Найбольш раннія гарадскія пячаткі захавалі выяву герба ў наступным выглядзе: нацягнуты лук са стралой, накіраванай уверх. У канцы 18 — пачатку 20 стагоддзя горад меў назву Брэст-Літоўск. З 1921 па 1939 год ён называўся Брэстам над Бугам. Толькі з верасня 1939 года пачаў называцца Брэстам.

Горад мае багатую гісторыю. Неаднаразова ў ім прымаліся важныя рашэнні аб пачатку і спыненні войнаў. У ваеннае ліхалеццe Брэст быў шмат разоў спалены і разбураны. У розныя часы горад знаходзіўся ў складзе розных дзяржаў. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (у 1795 годзе) Брэст увайшоў у склад Расійскай дзяржавы. Дзякуючы стратэгічнаму размяшчэнню горада ў ім была пабудавана Брэсцкая крэпасць. Аднак дзеля гэтага стары горад перанеслі на новае месца. Ужо ў нашы часы на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці археолагі адшукалі рэшткі старажытнага Бярэсця. На глыбіні 4 метраў было знойдзена каля 30 жылых і гаспадарчых пабудоў. Плошча раскапанага паселішча склала 1000 квадратных метраў. У 10—11 стагоддзях гэтыя тэрыторыі



Брэсцкі вакзал



Археалагічны музей «Бярэсце»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

былі заселены ўсходнеславянскім племенем дрыгавічоў. На месцы археалагічнай знаходкі створаны музей «Бярэсце».

Брэсцкі чыгуначны вузел звязваў паміж сабой розныя гарады: Варшаву, Маскву, Кіеў, Гомель. У 1886 годзе было завершана будаўніцтва Брэсцкага вакзала, аднаго з найпрыгажэйшых на той час. У Першую сусветную вайну ў 1915 годзе горад акупавалі германскія войскі. А ў 1921 годзе ён адышоў да Польшчы (паводле Рыжскага мірнага дагавора). І толькі ў верасні 1939 года, калі Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу, Брэст зноў стаў беларускім горадам. Са снежня 1939 года ён з’яўляецца абласным цэнтрам БССР.

1. Якія назвы меў горад Брэст у розныя часы?
2. Што ўвасабляе сабой герб горада?
3. Да якіх дзяржаў належаў горад?
4. Чаму была пабудавана Брэсцкая крэпасць?
5. Калі Брэст увайшоў у склад БССР?

Разгледзьце герб горада Брэста на с. 173. Паразважайце, чаму ён выглядае менавіта так.

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Брэст і раку, на якой ён стаіць.

Час і падзеі не захавалі для нас усе старажытныя помнікі архітэктуры горада. Між тым прыкладам вялікай павагі і любові да свайго горада з’яўляецца тое, як жыхары Брэста аберагаюць помнікі.



Царква Святога Мікалая
на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці

Брэсцкая крэпасць з’яўляецца не толькі прыкладам абарончага збудавання, але і непаўторным па сваёй архітэктуры творам. Яна была пабудавана ў 1842 годзе. На тэрыторыі крэпасці знаходзяцца збудаванні, якія моцна пацярпелі ў час абароны Брэсцкай крэпасці. Кранае сваёй прыгажосцю царква Святога Мікалая, пабудаваная ў крэпасці ў 1876 годзе. У царкве ўжо ў асноўным праведзены



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

рэстаўрацыйныя работы. Застаўся разбураным Белы палац, у якім у 1918 годзе быў падпісаны Брэсцкі мір паміж Савецкай Расіяй і Германіяй.

## 58. Сучасны Брэст

Што вы ведаеце пра сучасны Брэст?

У Вялікую Айчынную вайну Брэст адным з першых гарадоў Савецкага Саюза прыняў на сябе моцны ўдар нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Горад быў вызвалены ў ліпені 1944 года. Мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» і сёння нагадвае нам пра мужнасць абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

Сучасны Брэст з’яўляецца буйны́м прамысловым цэнтрам Беларусі. У ім дзейнічае шмат прамысловых прадпрыемстваў. Сярод іх — Брэсцкія электрамеханічны і электралямпавы заводы, завод газавай апаратуры «Брэстгазаапарат», Брэсцкі завод сельскагаспадарчага машынабудавання, Брэсцкі машынабудаўнічы завод, Брэсцкі радыётэхнічны завод, Брэсцкі завод «Цветатрон» і іншыя.

Вырабы лёгкай прамысловасці горада вядомыя не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Прадпрыемства «Брэсцкі панчошны камбінат», швейная фірма «Надзея», аб’яднанне «Дываны Брэста» выпускаюць якасную запатрабаваную прадукцыю. Сярод буйны́х прадпры-



Вуліца Савецкая ў Брэсце



Спартыўны комплекс «Вікторыя» ў Брэсце



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Брэсцкі абласны цэнтр алімпійскага рэзерву па грэблі (Грабны канал)

емстваў — Брэсцкі завод бытавой хіміі, прадпрыемствы будаўнічых матэрыялаў, дрэваапрацоўкі, паліграфіі.

Вядучыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці — «Савушкін прадукт», «Санта-Брэмар». Хто з беларусаў не каштаваў іх цудоўную прадукцыю? Сёння ёю частуюцца ў розных краінах за межамі Беларусі.

У горадзе пабудаваныя сучасныя спартыўныя комплексы сусветнага ўзроўню. Сярод іх — Лядовы палац, Палац водных відаў спорту, лёгкаатлетычны манеж, Грабны канал. Працуюць шматлікія культурныя ўстановы: музеі, тэатры, бібліятэкі. У Брэсце з 1996 года праводзіцца Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа».

Брэст з'яўляецца значным культурным і адукацыйным цэнтрам Беларусі. Тут адкрыты некалькі вышэйшых навучальных устаноў. Гэта Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, тэхнічны ўніверсітэт і іншыя.



1. Як змагаўся за сваё вызваленне Брэст у час Вялікай Айчыннай вайны?
2. Якая прамысловасць існуе ў сучасным Брэсце?
3. Назавіце буйны́я прадпрыемствы, што працуюць у горадзе.
4. Якія вядомыя маркі прадукцыі, што выпускаецца ў Брэсце, вы можаце назваць?
5. Чым знакаміты Брэст у галіне культурнага жыцця краіны?



Разгледзьце фотаздымкі на с. 173—176. Складзіце расказ пра Брэст па наступным плане.

1. Першае ўпамінанне пра горад.
2. Адкуль пайшла назва горада.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

3. Чым быў адметны горад у старажытнасці?
4. Гераічныя старонкі і імёны мінуўшчыны.
5. Брэст у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.
6. Чым слаўны сучасны горад Брэст?

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Брэст. Галоўным горадам якой вобласці ён з'яўляецца? У якім напрамку ад сталіцы ён размешчаны?

Знайдзіце дадатковую літаратуру пра славутасці Брэста. Зрабіце ўяўнае падарожжа па гэтым горадзе.

У сучасным Брэсце ўдала спалучаецца мінулае і сённяшнія дні. Напрыклад, вуліца Савецкая. На ёй мы сустрэнем будынкі пачатку 20 стагоддзя. У 1925 годзе была збудавана аптэка, якая працуе на тым жа месцы і да гэтага часу. Людзі кажуць, што ім прыемна прыходзіць сюды па лекі. Яны здзіўляюцца, што тут нават адчуваюць сябе лягчэй. Вось што значыць захаванне традыцыі!

Зачароўвае і алея ліхтароў. Штовечар сюды прыходзіць ліхтаршчык і запальвае ліхтары. Да кожнага з іх ён прыстаўляе лесвіцу, уздымаецца па ёй, і вось яно — святло! Шмат гараджан і гасцей Брэста збіраюцца ў азначаны час, каб папрысутнічаць на гэтай падзеі.

## 59. Віцебск у далёкім мінулым

1 На беразе якой ракі знаходзіцца Віцебск?
2. Як утварылася назва горада?
3. Калі горад упершыню ўпамінаецца ў летапісе?
4. Што такое дзяцінец?
5. Што ўяўляў сабой замак?

З даўніх часоў Віцебск з'яўляецца галоўным горадам віцебскай зямлі. У мінулыя часы пабываць у ім было пачэсна і самім каралям. Існуе некалькі меркаванняў наконт часу заснавання горада. Аднак згодна са старажытным летапісам Віцебск быў заснаваны ў 974 годзе.

Пачынаўся горад з драўлянага замка, узведзенага на гары на беразе Заходняй Дзвіны і невялічкай ракі Віцьбы. Менавіта ад яе і пайшла назва горада. У хуткім часе на гэтым жа месцы з'явіліся дзве царквы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Сучасны герб горада Віцебска

Адну з іх, Благавешчанскую, называлі сапраўдным цудам. У час археалагічных даследаванняў у ёй былі знойдзены дзівосныя роспісы. Першыя збудаванні ў старадаўнім горадзе адносяцца да 10—13 стагоддзяў. Старажытны горад складаўся з дзяцінца на Замкавай гары, Верхняга і Ніжняга замкаў. Яны былі абнесены каменнымі сценамі з вежамі.

Ужо ў 16 стагоддзі Віцебск меў сваё гарадское праўленне і суд. У 1597 годзе была пабудавана драўляная ратуша. Значна пазней з'явілася гандлёвая плошча, прыгожыя цэрквы і касцёлы. У гэты час горад быў значным цэнтрам гандлю і рамёстваў.

На старажытным гербе Віцебска — выява Хрыста, размешчаная над мячом. І гэта нездарма. Не адзін раз нашым продкам даводзілася браць у рукі зброю, каб бараніць сваю зямлю ад ворага. Горад часта быў цэнтрам ваенных дзеянняў. Ён перажыў незлічоныя разбурэнні і пажары.

Да нашых дзён з помнікаў мінуўшчыны дайшло няшмат. Дзівам уцалеў знакаміты Пакроўскі сабор. Ён і сёння прываблівае сваёй велічнасцю і хараством. Хаця лёс яго быў нялёгкім. У розныя часы сабор зачынялі, у ім размяшчалі іншыя ўстановы. У нашы часы ім валодаюць вернікі, як і павінна быць.



Свята-Пакроўскі кафедральны сабор



Віцебская ратуша



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Уражвае адбудаваная Віцебская ратуша. Зараз у ёй размешчаны гістарычны музей.

У перыяд рэвалюцыйных хваляванняў у Віцебску назіралася актыўнае палітычнае жыццё. У красавіку 1917 года быў утвораны Віцебскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У лістападзе 1917 года ўлада перайшла ў рукі працоўных.

Да сакавіка 1924 года Віцебск знаходзіўся ў складзе Расійскай Федэрацыі, пасля гэтага быў уключаны ў склад БССР. Са студзеня 1938 года горад з’яўляецца цэнтрам Віцебскай вобласці.

1. Што вы даведаліся пра гісторыю ўзнікнення старажытнага Віцебска?
2. Як развіваўся Віцебск?
3. У які час у Віцебску з’явіліся сваё праўленне і суд?
4. Калі ў горадзе была пабудавана ратуша?
5. Што ўяўляе сабой герб Віцебска?
6. Што адбывалася ў горадзе ў час рэвалюцыйных хваляванняў?
7. У якім годзе Віцебск быў уключаны ў склад БССР?

**1.** Разгледзьце фотаздымкі на с. 178. Складзіце расказ пра старажытны Віцебск.
**2.** Разгледзьце герб горада на с. 178. Апішыце яго.

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) Віцебск і раку, на якой ён знаходзіцца.

## 60. Сучасны Віцебск

1. Што вы ведаеце пра сучасны Віцебск?
2. Галоўным горадам якой вобласці ён з’яўляецца?
3. Якія знакамітыя помнікі архітэктуры Віцебска вы ведаеце?
4. Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Віцебск.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны горад быў заняты нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У гэты час у Віцебску дзейнічалі падпольныя арганізацыі. За перыяд акупацыі горад амаль цалкам быў знішчаны. Савецкія войскі вызвалілі Віцебск у чэрвені 1944 года падчас правя-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

дзення аперацыі «Баграціён». Пасля вайны горад зноў адбудавалі. Імёнамі герояў вайны названы яго вуліцы і плошчы.

Віцебск з'яўляецца буйны́м прамысловым цэнтрам Беларусі. У горадзе дзейнічаюць каля сотні прамысловых прадпрыемстваў. Яны вырабляюць металарэзныя і дрэваапрацоўчыя станкі, вымяральныя прыборы, медыцынскае абсталяванне, разнастайныя будаўнічыя матэрыялы, тэлевізары, дываны, абутак, мэблю і іншае.

Да машынабудаўнічай і металаапрацоўчай галін прамысловасці адносяцца завод радыёдэталяў, завод трактарных запасных частак, прыборабудаўнічы завод, станкабудаўнічы завод, прадпрыемства па выпуску тэлевізараў «Віцязь» і многія іншыя.

У горадзе ёсць прадпрыемствы дрэваапрацоўчай, лясной і цэлюлознай галін прамысловасці. Сярод найбуйнейшых з іх — «Віцебскдрэў» і «Віцебскмэбля». Таксама ў Віцебску вырабляюцца будаўнічыя матэрыялы.

Вядучае месца ў эканоміцы Віцебска займае лёгкая прамысловасць. Сярод значных прадпрыемстваў вылучаюцца «Белвест» і «Марка», якія займаюцца вытворчасцю абутку. Высакаякасную прадукцыю выпускаюць «Віцебскія дываны», панчошная фабрыка «Васіліна», панчошна-трыкатажнае прадпрыемства «КІМ», льнопрадзільная фабрыка «Дзвіна».

Добра працуе харчовая прамысловасць. Вядучымі прадпрыемствамі гэтай галіны з'яўляюцца кандытарскі камбінат «Віцьба», маслазавод, мясакамбінат і іншыя.



Летні Амфітэатр у Віцебску



Цэх прадпрыемства «Віцязь»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прадпрыемствы падтрымліваюць знешнеэканамічныя сувязі з некалькімі дзясяткамі краін свету. Віцебск гандлюе сваім абуткам, трыкатажнымі і швейнымі вырабамі, дыванамі, металаапрацоўчымі і дрэваапрацоўчымі станкамі, мэбляй, вылічальнымі прыборамі і тэлевізарамі.

Дзякуючы зручнаму геаграфічнаму становішчу праз Віцебск праходзяць міжнародныя шляхі ў краіны Прыбалтыкі, Заходняй Еўропы, Расію. Акрамя аўтамабільнага транспарту і чыгункі ў Віцебску адкрыты параходны рух па Заходняй Дзвіне. Віцебскі аэрапорт прымае сучасныя самалёты.

З даўніх часоў Віцебск славіцца як адукацыйны і культурны цэнтр. У горадзе на сённяшні час дзейнічаюць некалькі вышэйшых навучальных установ. Гэта Віцебскі медыцынскі ўніверсітэт, адзіная ў краіне Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны, тэхналагічны ўніверсітэт і іншыя. Плённа працуюць Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа, беларускі лялечны тэатр «Лялька».

На сучасных пляцоўках — у Летнім Амфітэатры, Віцебскай абласной філармоніі — адбываюцца шматлікія культурныя мерапрыемствы.

Горад Віцебск стаў месцам правядзення вядомага міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». У час святочных мерапрыемстваў гараджане і госці знаёмяцца з народнымі беларускімі рамёствамі, наведваюць краязнаўчы музей, дом-музей Марка Шагала.

**?**

1. Як змагаліся жыхары Віцебска ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны?
2. Калі горад быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?
3. Якая прамысловасць існуе ў сучасным Віцебску?
4. Якія буйны́я прадпрыемствы працуюць у горадзе?
5. Назавіце маркі прадукцыі, што выпускаецца ў Віцебску.
6. Якія віды транспарту існуюць у горадзе?
7. Чым слаўны Віцебск у культурным жыцці?
8. Назавіце міжнародны фестываль, што праводзіцца ў горадзе.
9. Якія музеі ёсць у Віцебску?

Разгледзьце фотаздымкі на с. 178, 180. Складзіце расказ пра Віцебск па наступным плане.

1. Першае ўпамінанне пра горад.
2. Адкуль пайшла назва горада.
3. Горад у старажытнасці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

4. Гераічныя старонкі і імёны мінуўшчыны.
5. Віцебск у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.
6. Чым слаўны сучасны горад Віцебск?

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Віцебск. Галоўным горадам якой вобласці ён з'яўляецца? У якім напрамку ад сталіцы ён размешчаны? Пакажыце раку, на якой стаіць горад.

Знайдзіце дадатковую літаратуру пра славутасці Віцебска. Зрабіце ўяўнае падарожжа па гэтым горадзе.

На сцэне «Славянскага базара ў Віцебску» выступаюць самыя знакамітыя артысты краін СНД і нават сусветныя зоркі. Гэтаму спрыяюць і ўмовы летняй канцэртнай залы. Яна з самага пачатку была пабудавана ў зручным месцы. Канцэртная сцэна размясцілася ў адпаведных прыродных умовах — вялікім яры. Гарадскі шум не пранікае сюды і не шкодзіць слухачам атрымліваць асалоду ад мастацтва.

Пасля некалькіх рэканструкцый канцэртная зала змяшчае больш за 6 тысяч гледачоў. Дзякуючы пабудаванаму над глядацкімі месцамі даху людзям не перашкаджаюць нават неспрыяльныя ўмовы надвор'я.

Спецыяльнай узнагародай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» адзначаюцца вядомыя артысты, якія ўдзельнічаюць у фестывалі.

## 61. Гомель у далёкім мінулым

1. Якое паданне пра паходжанне назвы горада дайшло да нашых дзён?
2. На беразе якой ракі знаходзіцца Гомель?
3. Калі горад упершыню ўпамінаецца ў летапісе?
4. Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Гомель.

Гомель, як і іншыя беларускія гарады, мае багатую гісторыю. Ён узнік на беразе ракі Сож.

Першы летапісны ўспамін пра яго адносіцца да 1142 года. Ужо ў 9—10 стагоддзях Гомель быў буйны́м умацаваным паселішчам. Жы-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лі тут людзі з племені радзімічаў. Археолагі знайшлі ў курганах прадметы быту і прылады працы. Знойдзены былі таксама прылады для пісання на драўляных дошчачках і бяросце.



Сучасны герб горада Гомеля

У сакавіку 1560 года была зацверджана гарадская пячатка. Яна прыраўноўвалася да герба. Пячатка складалася з выявы чырвонага шчыта, на якім быў размешчаны срэбны крыж. Сучасны герб Гомеля выглядае інакш. На лазурным полі знаходзіцца выява залатой рысі. Такіх звяроў у даўнейшыя часы было многа ў ваколіцах горада. Акрамя таго, рысь — жывёла спрытная і свабодалюбівая.

Горад на працягу існавання належаў да розных дзяржаў. Ёсць звесткі, што Гомель увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага да 1335 года. За валоданне горадам Гомелем змагаліся войскі Рэчы Паспалітай. У розныя перыяды ён належаў то Рэчы Паспалітай, то Расійскай імперыі.

У 1772 годзе расійская царыца перадала горад Гомель ва ўладанне аднаму са сваіх фельдмаршалаў.

Рэвалюцыі і войны ў пачатку 20 стагоддзя не абмінулі Гомель і яго жыхароў. У Першую сусветную вайну горад быў акупаваны германскімі войскамі. Працоўныя горада толькі пачалі будаўніцтва новага жыцця, але здзяйсненне іх планаў не было лёгкім. Варожыя сілы распраўляліся з мірнымі жыхарамі, знішчалі маёмасць, перашкаджалі рабоце савецкіх устаноў. Амаль да пачатку 1921 года працоўныя горада



Панарама горада Гомеля



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Палацава-паркавы ансамбль князёў Румянцавых-Паскевічаў



Лебядзіная сажалка ў палацава-паркавым ансамблі

Гомеля змагаліся з ворагамі савецкай улады, каб перайсці да мірнага будаўніцтва. Нарэшце ў горадзе ўсталявалася мірнае жыццё. У 1922—1924 гады ў ім былі пабудаваны абутковая фабрыка «Праца», хлебакамбінат, паліграфічнае прадпрыемства. У 1923 годзе ў Гомелі быў адкрыты рабочы факультэт, які рыхтаваў працоўную моладзь да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

З 1926 года Гомель увайшоў у склад БССР. З гэтага часу пачалі ўзводзіцца буйны́я прадпрыемствы: «Гомсельмаш», станкабудаўнічы завод імя Кірава, фабрыкі «Камінтэрн», «8 Сакавіка», «Спартак» і іншыя. Гомель рос імклівымі тэмпамі. Акрамя прамысловых прадпрыемстваў хутка ішло будаўніцтва новых школ, бальніц, аб'ектаў культуры і іншых неабходных для жыцця чалавека ўстаноў.

1. Як развіваўся старадаўні Гомель?
2. Што з'яўляецца сведчаннем старажытнасці горада?
3. У склад якіх дзяржаў уваходзіў Гомель у розныя часы?
4. Што адбывалася ў горадзе ў час рэвалюцыйных хваляванняў?
5. Калі Гомель увайшоў у склад БССР?
6. Як развіваўся горад пасля ўваходу ў склад БССР?

Разгледзьце выяву сучаснага герба горада Гомеля на с. 183. Паразважайце, чаму ён так выглядае. Апішыце герб.

**1.** Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Гомель.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Што вы ведаеце пра раку, на якой знаходзіцца горад? Пакажыце яе на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац).

**1.** Адна з найпрыгажэйшых мясцін Гомеля — палацава-паркавы ансамбль князёў Румянцавых-Паскевічаў. Ён з’яўляецца помнікам гісторыі, прыроды і архітэктуры 18—19 стагоддзяў. Аснову ансамбля складае палац, залы якога маюць прыгожае ўбранства. У палацы размешчаны партрэты, а таксама іншыя творы мастацтва.

Палацава-паркавы ансамбль выконвае мноства функцый. Ён з’яўляецца музеем. У ім праводзяцца шматлікія культурныя мерапрыемствы, выставы, канцэрты, сустрэчы на міжнародным узроўні.

Утульны парк вабіць да сябе сваім хараством. Ён распасціраецца на 34 гектары. У парку расце 5 тысяч дрэў, многія з якіх рэдкія для нашых мясцін. Гэта лістоўніцы, сібірскія кедры, чорная сасна, чырвоны дуб і іншыя. Два дубы парку налічваюць па 200 гадоў, ёсць дрэвы па 150—160 гадоў. Гэтыя доўгажыхары яшчэ памятаюць гаспадароў палаца — фельдмаршалаў расійскай арміі Мікалая Пятровіча Румянцава і Івана Фёдаравіча Паскевіча. Румянцаву ў парку пастаўлены помнік. Паскевіч разам з сям’ёй пахаваны ў капліцы на тэрыторыі парка.

**2.** Ёсць яшчэ адно рамантычнае месца, што вабіць наведвальнікаў. Гэта Лебядзіная сажалка. Яна ўтворана на месцы рачулкі Гамяюкі. Дарэчы, у тым месцы, дзе яна ўпадае ў раку Сож, і ўзнік старажытны горад Гомель.

## 62. Сучасны Гомель

1. Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Гомель.
2. Галоўным горадам якой вобласці ён з’яўляецца?
3. У якім напрамку ад сталіцы ён размешчаны? Пакажыце раку, на якой ён знаходзіцца.
4. Што вам вядома пра сучасны Гомель?

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Гомель працяглы час заставаўся не занятым фашыстамі. Таму да сярэдзіны жніўня 1941 года ў Гомелі знаходзіліся кіраўніцтва партыі і ўрад краіны. Жыхары горада



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Камбайн «Палессе» вытворчасці завода «Гомсельмаш»

кожны дзень працавалі на будаўніцтве абарончых умацаванняў. Людзі прыходзілі цэлымі сем'ямі, незалежна ад узросту. Праца была цяжкай, нярэдка пад абстрэлам праціўніка. На прадпрыемствах Гомеля рамантавалі пашкоджаныя танкі, машыны і іншую тэхніку. Працоўныя суткамі не адыходзілі ад рабочых месцаў. У лепшых будынках горада адкрываліся шпіталі для лячэння параненых. Тым часам пачаліся жорсткія баі за горад. Савецкія войскі разам з насельніцтвам праявілі вялікую мужнасць у баях за Гомель.

Са жніўня 1941 па лістапад 1943 года горад быў акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. За гэты час у лагерах смерці і гета былі знішчаны больш за 100 тысяч чалавек. На тэрыторыі горада дзейнічала антыфашысцкае падполле. Пасля вызвалення ў 1943 годзе горад пачаў падымацца з руін. За 1950—1960-я гады былі адноўлены ўсе прадпрыемствы, якія існавалі да вайны, і пачалося будаўніцтва новых.

Сучасны Гомель з'яўляецца значным прамысловым цэнтрам Беларусі. У ім дзейнічае вялікая колькасць прадпрыемстваў і арганізацый. Вядучымі галінамі прамысловасці Гомеля з'яўляюцца машынабудаванне і металаапрацоўка. А буйнейшымі прадпрыемствамі — Гомельскі станкабудаўнічы завод, «Гомсельмаш», вагонарамонтны завод. Выпускаюць неабходную прадукцыю шмат іншых заводаў і прадпрыемстваў. У харчовай галіне прамысловасці вылучаецца кандытарская фабрыка «Спартак». Лясную і дрэваапрацоўчую прамысловасць прадстаўляюць «Гомельшпалеры», «Гомельдрэў», мэблевая фабрыка «Прагрэс» і іншыя. Карыстаецца вялікім попытам адзенне, якое выпускае сучаснае прадпрыемства «Камінтэрн».

Шматлікія навучальныя ўстановы дазваляюць вялікай колькасці юнакоў і дзяўчат Беларусі атрымліваць адукацыю.

Гомель з'яўляецца адным з культурных цэнтраў Беларусі. У ім працуе некалькі тэатраў, краязнаўчы музей, цырк, мастацкая галерэя.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як змагаўся за сваё вызваленне Гомель у час Вялікай Айчыннай вайны?
2. Якая прамысловасць існуе ў сучасным Гомелі?
3. Назавіце буйны́я прадпрыемствы, што працуюць у горадзе.
4. Чаму Гомель можна назваць адным з культурных цэнтраў Беларусі? Пры адказе выкарыстайце тэкст параграфа.

Разгледзьце фотаздымкі на с. 184—186. Складзіце расказ пра Гомель па наступным плане.

1. Першае ўпамінанне пра горад.
2. Адкуль пайшла назва горада.
3. Горад у старажытнасці.
4. Геаічныя старонкі і імёны мінуўшчыны.
5. Гомель у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.
6. Сучасны горад. Чым ён слаўны?

Знайдзіце дадатковую літаратуру пра славутасці Гомеля. Зрабіце ўяўнае падарожжа па гэтым горадзе.

Духмяны летні дзень. Каласіцца жытнёвае поле. Залаты колас зліваецца з сонечным святлом. Па гэтым хлебным полі, быццам па моры, ідзе камбайн. Сёння ён гаспадар на полі. Зробіць сваю работу адмыслова: ніводнае зярнятка не павінна застацца на полі. Людзі чакаюць добрага ўраджаю.

Пазнаёмімся з гэтым гаспадаром. Зернеўборачны камбайн носіць прыгожае імя «Палессе». І гэта нездарма, бо яго зрабілі на заводзе «Гомсельмаш», што знаходзіцца ў Гомелі, на палескай зямлі.

Завод мае даўнюю і слаўную гісторыю. Свой дзень нараджэння ён адзначае з 15 кастрычніка 1930 года. У пасляваенны час завод стаў галоўным вытворцам сельскагаспадарчых машын. Без іх савецкія людзі не здолелі б апрацаваць зямлю і атрымаць ураджай.

З самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны завод быў эвакуіраваны ў расійскі горад Курган. Разам з абсталяваннем туды накіравалі кваліфікаваных спецыялістаў і інжынераў. Завод атрымаў заданне выпускаць неабходную для фронту ваенную прадукцыю. І ўжо ў жніўні 1941 года яна пачала адпраўляцца на фронт.

У самім жа Гомелі цэхі завода былі знішчаны акупантамі. Спатрэбілася 3 гады, каб пасля вызвалення Гомеля завод зноў пачаў



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

выпуск сельскагаспадарчай тэхнікі. Камбайны насілі розныя назвы: «Ніва», «Дон» і цяпер «Палессе».

Зернеўборачныя, кормаўборачныя камбайны і іншыя сельгасмашыны працуюць не толькі на палях Беларусі, але і далёка за яе межамі.

## 63. Гродна ў далёкім мінулым



1. Якія летапісныя імёны горада дайшлі да нашых дзён?
2. На беразе якой ракі знаходзіцца Гродна?
3. Калі ўпершыню горад згадваецца ў старажытных летапісах?


Сучасны герб горада Гродна

Датай нараджэння Гродна лічыцца 1127 год. І назва яго была спачатку Гарадзень або Гародня. Паходзіць назва ад слоў «агароджа», «гарадзіць». У тыя далёкія часы гродзенскія князі разам з іншымі славянскімі князямі не раз вадзілі свае дружыны на поўнач, захад і поўдзень, перамагаючы ворагаў. Нашым сучаснікам пра былую магутнасць горада нагадваюць рэшткі старадаўняга замка і сцены крэпасці. Горад Гродна быў цэнтрам рамесніцтва, вядомым і за межамі краю. Гэтаму дапамагала выгаднае геаграфічнае становішча. Яно забяспечвала эканамічныя сувязі з краінамі Балтыі і Маскоўскай дзяржавай.

З сярэдзіны 13 стагоддзя горад уваходзіў у склад Вялікага Княства Літоўскага.

У 1379 годзе ў ім княжыў вялікі князь Вітаўт. Нядоўгі час у 1390 годзе Гроднам валодаў князь Ягайла. Але Вітаўт зноў вярнуў горад. Да пачатку 15 стагоддзя Гродна вытрымлівала вялікае мноства нападаў з боку крыжакоў. У 15 стагоддзі яно ўваходзіла ў лік найбуйнейшых гарадоў Вялікага Княства Літоўскага. Адным з першых Гродна атрымала правы на самакіраванне. Гэтае права было яму нададзена ў 1496 годзе. Тады ж тут была пабудавана драўляная ратуша.

Горад меў свой герб. У 1845 годзе герб выглядаў так: на чырвоным полі шчыта размяшчалася выява зубра. Зубр — гэта ўвасабленне моцы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Панарама Гродна

і багацця. На сучасным гербе знаходзіцца іншая выява. На блакітным полі шчыта — алень з залатым крыжам паміж рагамі, які пераскоквае цераз агароджу.

Горад хутка мацнеў і развіваўся. У ім працавалі некалькі мануфактур: палатняная, збройная, панчошная, карэтная і іншыя. Былі адкрыты тэатр, медыцынская школа.

Да канца 18 стагоддзя ў Гродне праходзілі соймы Рэчы Паспалітай. Так, на Гродзенскім сойме ў 1793 годзе быў зацверджаны другі падзел Рэчы Паспалітай. З лютага 1795 года горад увайшоў у склад Расійскай імперыі.

Гродна прымала на сябе навалу войнаў і рэвалюцыйных хваляванняў. У 1794 і 1863 гадах горад закранулі паўстанні Тадэвуша Касцюшкі і Кастуся Каліноўскага.

У жніўні 1915 года горад быў заняты германскімі войскамі. З красавіка 1919 года — польскімі войскамі. З 1921 года Гродна належала Польшчы.

Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 годзе горад увайшоў у склад БССР. За першы год савецкай улады ў Гродне было ўведзена ў дзеянне звыш 20 прамысловых прадпрыемстваў. Былі пабудаваныя хлебазавод, абутковая і швейная фабрыкі. Жыхары Гродна старанна працавалі. Яны лічылі сябе гаспадарамі сваіх прадпрыемстваў, таму поспехі ў развіцці прамысловасці горада былі вялікімі. У 1941 годзе ў Гродне была адкрыта першая вышэйшая навучальная ўстанова. Яна рыхтавала настаўнікаў. З'явіліся таксама музычная школа, драматычны тэатр і шмат іншых устаноў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як развіваўся старадаўні горад Гродна?
2. Што з’яўляецца сведчаннем старажытнасці горада?
3. У склад якіх дзяржаў у розныя часы ўваходзіла Гродна?
4. Калі Гродна ўвайшло ў склад БССР?
5. Як развіваўся горад пасля ўваходу ў склад БССР?

Разгледзьце сучасны герб горада Гродна на с. 188. Паразважайце, чаму ён так выглядае. Што ўвасабляе сабой герб горада?

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Гродна і раку, на якой ён стаіць.

Старажытны горад мае незвычайную гісторыю. Яе можна прасачыць, напрыклад, па гербе Гродна.

Алень на шчыце з’явіўся на гербе беларускай крэпасці яшчэ ў 16 стагоддзі, калі Гродна было ў складзе Рэчы Паспалітай. Ён апынуўся на выяве герба невыпадкова. Алень як сімвал горада вельмі адпавядае Гродну. Яго называюць аленем Святога Губерта, абаронцам паляўнічых. Паляванне было адным з галоўных заняткаў жыхароў. Непадалёк знаходзіцца Белавежская пушча, і агароджа на гербе якраз дарэчы. Як вам вядома, назва горада Гродна пайшла ад слоў «агароджа», «гарадзіць». А алень вольны і горды, вось ён і скача праз агароджу.

## 64. Сучаснае Гродна

Што вы ведаеце пра сучаснае Гродна?

У ліпені 1941 года Гродна было акупавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Фашысты ўключылі яго ў склад Германіі пад назвай Гартэн. За перыяд акупацыі ў Гродне і яго ваколіцах было знішчана больш за 50 тысяч чалавек. Але патрыёты горада не здаваліся. Яны арганізоўвалі дыверсіі на дарогах і прадпрыемствах, дапамагалі партызанам зброяй і медыкаментамі. Горад быў вызвалены ў ліпені 1944 года. З верасня 1944 года ён з’яўляецца цэнтрам Гродзенскай вобласці.

Сучаснае Гродна — буйны́ прамысловы цэнтр. У горадзе дзейнічае вялікая колькасць прадпрыемстваў, якія выпускаюць мінеральныя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Панарама прадпрыемства «Гродна Азот»

ўгнаенні, сінтэтычныя валокны, абутак, адзенне, запчасткі для аўтамабіляў, вырабы са скуры і воўны, будаўнічыя матэрыялы, медтэхніку, мэблю, шкло, прадукты харчавання і іншае.

Буйнейшымі прадпрыемствамі з'яўляюцца аб'яднанні «Гродна Азот», «Гродна Хімвалакно», абутковая фабрыка «Нёман» і іншыя.

Гродна хутка забудоўваецца. Узнікаюць новыя мікраранёны, вуліцы, праспекты. У горадзе шмат зялёных зон, лесапаркаў. Прыгожы магутны Нёман — любімае месца адпачынку жыхароў Гродна. Акрамя таго, па Нёмане перавозіцца шмат грузаў.

Гродна з'яўляецца значным адукацыйным і культурным цэнтрам Беларусі. У ім працуюць школы, гімназіі, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, тэхнікумы, вышэйшыя навучальныя ўстановы, у тым ліку тры ўніверсітэты. Гэта Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт і Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. У горадзе дзейнічаюць драматычны і лялечны тэатры, два рэспубліканскія музеі, выдатны спартыўны комплекс.

Гродна багатае на помнікі архітэктуры і культуры. Да такіх помнікаў адносяцца Каложская царква, Пакроўскі сабор, Фарны касцёл, Стары і Новы замкі і іншыя.

З кожным годам, нягледзячы на свой узрост, горад маладзее, развіваецца і прыгажэе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Як змагалася за сваё вызваленне Гродна ў час Вялікай Айчыннай вайны?
2. Якая прамысловасць існуе ў сучасным горадзе?
3. Назавіце буйны́я прадпрыемствы, што працуюць у Гродне.

Разгледзьце фотаздымкі на с. 189, 191—193. Складзіце расказ пра Гродна па наступным плане.

1. Першае ўпамінанне пра горад.
2. Адкуль пайшла назва горада.
3. Горад у старажытнасці.
4. Гераічныя старонкі і імёны мінуўшчыны.
5. Гродна ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.
6. Чым слаўны сучасны горад Гродна?

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Гродна. Галоўным горадам якой вобласці ён з'яўляецца? У якім напрамку ад сталіцы ён знаходзіцца?

Знайдзіце дадатковую літаратуру пра славутасці Гродна. Зрабіце ўяўнае падарожжа па гэтым горадзе.

Старажытныя старонкі гісторыі Гродна даюць падставу з вялікай павагай адносіцца да яго і ў наш час.

Горад быў прывабным для многіх знакамітых гістарычных асоб. Захаваліся і сведкі тых падзей — дзівосныя замкі, касцёлы, цэрквы.

У даўнія часы ў Гродне быў збудаваны прыгожы велічны замак. Зараз ён носіць назву Стары замак. У перыяд росквіту Вялікага Княства Літоўскага ён быў галоўнай рэзідэнцыяй князя Ві-



Гродзенскі Стары замак



Новы замак у Гродне



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Фарны касцёл



Каложская царква

таўта. Затым замак спадабаўся і польскаму каралю. У часы Рэчы Паспалітай у ім праводзіліся пасяджэнні соймаў, прымаліся важныя рашэнні. Пасля розных перабудоў Стары замак захаваўся да сённяшніх дзён.

Новы замак — каралеўскі палац — быў рэзідэнцыяй польскіх каралёў. З ім звязана многа падзей, што адбыліся ў часы Рэчы Паспалітай. У палацы знаходзіліся пакоі караля. Тут таксама праходзілі соймы. У гэтым жа палацы, калі адбыўся апошні падзел Рэчы Паспалітай, кароль адрокся ад сваёй улады. Замак перажыў мноства перабудоў. Але ў Гродне клапоцяцца пра вяртанне замку гістарычнага выгляду.

Выдатным помнікам архітэктуры з'яўляецца Фарны касцёл. У даўнейшыя часы ён быў самы багаты сярод касцёлаў у Рэчы Паспалітай. Убранне яго складаюць фрэскі, скульптуры, жывапіс і іншае. Касцёл упрыгожвае самы старажытны дзеючы вежавы гадзіннік у Еўропе. Механізм гэтага гадзінніка зроблены ў канцы 15 стагоддзя. Спачатку гадзіннік аздабляў гарадскую ратушу. А пасля яе разбурэння яго перанеслі на вежу Фарнага касцёла.

Барысаглебская (Каложская) царква — помнік архітэктуры 12 стагоддзя. Яна стаіць на высокім крутым беразе Нёмана. У 1853 годзе будынак пацярпеў ад апоўзня, таму захаваўся не цалкам. Зачароўвае майстэрства старажытных будаўнікоў. У фасад царквы ўстаўлены апрацаваныя і адпаліраваныя валуны. Рознакаляровыя плітачкі ў форме крыжоў і ромбаў зіхацяць ад святла. У сцены царквы ўмураваны керамічныя гаршкі (галаснікі). Таму ў час службы ў царкве гучанне робіцца асабліва ўрачыстым.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 65. Магілёў. Гісторыя мінуўшчыны



1. Якое паданне аб назве горада дайшло да нашых дзён?
2. На беразе якой ракі знаходзіцца Магілёў?
3. Калі ўпершыню горад упамінаецца ў летапісе?



Сучасны герб горада Магілёва

Магілёў з’яўляецца адным з найстарэйшых беларускіх гарадоў. Заснаваны ён быў у 1267 годзе. Адна з легендаў звязана з імем князя Льва Могія, які пабудаваў замак. Гэты замак і стаў пачаткам горада Магілёва.

Археалагічныя знаходкі сведчаць аб тым, што Магілёў хутка развіваўся. У час раскопак у курганах былі знойдзены часткі зброі, ювелірныя ўпрыгожанні з апрацаваных касцей і камянёў, кераміка. Рэшткі стрэл і спаленых пабудоў нагадваюць, што ў 13 стагоддзі Магілёў быў захоплены і спалены мангола-татарамі ў час іх набегаў. У 16 стагоддзі Магілёў па сваім гаспадарчым значэнні займаў адно з першых месцаў у Вялікім Княстве Літоўскім. Горадам кіравалі многія знатныя асобы. Магілёўскія купцы гандлявалі з усімі гарадамі Беларусі, з краінамі Прыбалтыкі, Польшчай, Расіяй.

Калі Магілёў у 1577 годзе атрымаў права на самакіраванне, яму быў прызначаны першы герб. У 1661 годзе паводле граматы караля ў горада з’явіўся новы герб, які дайшоў да нашых дзён. Ён уяўляе сабой блакітны шчыт. На ім размешчаны тры срэбныя вежы. У адкрытых варотах сярэдняй з іх — рыцар у даспехах з паднятым над галавою мячом. Зверху на чырвоным шчыце пад дахам цэнтральнай вежы знаходзіцца выява ўзброенага конніка з мячом і шчытом.

У 16 стагоддзі Магілёў часта станавіўся арэнай баявых дзеянняў. Так, у час Лівонскай вайны 1558—1583 гадоў была спалена і цалкам знішчана вялікая колькасць дамоў горада. Не абышла Магілёў і Паўночная вайна, падчас якой ён цярпеў ад шведскіх і расійскіх войскаў. Нягледзячы на значныя разбурэнні, горад аднаўляўся і хутка рос.

З 1772 года Магілёў па першым падзеле Рэчы Паспалітай увайшоў у склад Расійскай імперыі. Была створана Магілёўская губерня.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вайна з Напалеонам таксама паўплывала на развіццё горада. Французы ўсталявалі жорсткі акупацыйны рэжым. Многія магілёўскія дваране пайшлі на службу да французаў. Аднак народ не скарыўся ворагу. Партызанскія атрады дзейнічалі па ўсёй губерні. У вёсцы Салтанаўка паблізу горада Магілёва ў гонар знакамітай бітвы пастаўлены манумент.


Магілёўская ратуша

Сярод архітэктурных помнікаў Магілёва вылучаюцца гарадская ратуша, Мікольская царква і іншыя. Магілёўскія майстры неаднаразова запрашаліся ў Маскву.

Не абышлі Магілёў таксама рэвалюцыйныя падзеі пачатку 20 стагоддзя. У Магілёве ў той час знаходзілася Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага войскаў Расійскай імперыі. Толькі ў лістападзе 1917 года горад перайшоў у рукі бальшавікоў. Пры падтрымцы Стаўкі ворагі бальшавікоў перашкаджалі ўсталяванню савецкай улады, аб'яднанню рабочых і салдат. Таму дзеля ліквідацыі Стаўкі ў горад накіраваліся рэвалюцыйныя ўзброеныя атрады. У 1918 годзе Магілёў быў акупаваны спачатку польскімі войскамі, а затым германскімі. У кастрычніку 1918 года ў Магілёў увайшла Чырвоная Армія. Пры адыходзе з Магілёва германскія войскі разрабавалі горад, вывезлі каштоўнасці, знішчылі гарадскую гаспадарку. У такіх цяжкіх умовах працягвалася ўсталяванне савецкай улады, наладжванне мірнага жыцця. Улада ў першую чаргу ўзялася за аднаўленне прамысловасці. З лютага 1919 года ў Магілёве пачалі працаваць хатычытальні, дзе дарослыя людзі навучаліся грамаце, адчыніліся школы. Аднавілі сваю дзейнасць і вышэйшыя навучальныя ўстановы.

У сакавіку 1924 года Магілёў увайшоў у склад БССР. З 1938 года горад стаў цэнтрам Магілёўскай вобласці. За гады першых пяцігодак Магілёў зрабіўся адным з буйны́х прамысловых цэнтраў рэспублікі.

?

1. Як развіваўся старадаўні Магілёў?
2. Якія войны адбіліся на развіцці горада?
3. У склад якіх дзяржаў уваходзіў Магілёў у розныя часы?
4. Што адбывалася ў горадзе ў час рэвалюцыйных хваляванняў?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разгледзьце сучасны герб горада Магілёва на с. 194. Паразважайце, чаму ён так выглядае.

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Магілёў. На якой рацэ стаіць горад?

## 66. Сучасны Магілёў

1. Што вы ведаеце пра сучасны Магілёў?
2. Галоўным горадам якой вобласці ён з’яўляецца?
3. Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Магілёў.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны магілёўскае народнае апалчэнне разам з Чырвонай Арміяй вялі гераічную абарону Магілёва. Яна працягвалася 23 дні і мела велізарнае значэнне менавіта ў пачатку вайны, бо падарвала вераломныя планы ворага. Абаронцы Магілёва прынялі на сябе ўдар адборных войскаў фашыстаў. Найбольш упартыя баі разгарнуліся на Буйніцкім полі. Але Магілёў усё ж быў акупаваны нямецка-фашысцкімі войскамі. Каля 30 тысяч жыхароў горада былі вывезены на прымусовыя работы ў Германію. Акупанты загубілі ў Магілёве 70 тысяч чалавек, знішчылі ўсе прамысловыя прадпрыемствы і культурныя ўстановы. Горад быў зруйнаваны. Ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў савецкія войскі вызвалілі Магілёў у чэрвені 1944 года. Гараджане пры падтрымцы ўсёй краіны ўзяліся за аднаўленне горада. Праз



Мемарыяльны комплекс «Буйніцкае поле» пад Магілёвам



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

некалькі пяцігодак у горадзе за суткі выраблялася прадукцыі больш, чым за ўвесь 1945 год. На Буйніцкім полі, дзе ў час вайны праходзіла адна з найбольш жорсткіх бітваў, пастаўлены помнік усім абаронцам горада.




Магілёўскі абласны драматычны тэатр

У горадзе працуе адно з буйнейшых у Еўропе прадпрыемстваў — «Магілёўхімвалакно». Вядучымі прадпрыемствамі з'яўляюцца Магілёўскі завод ліфтавага машынабудавання, завод «Строммашына», завод «Электрарухавік» і іншыя. Не толькі ў Беларусі вядомыя вырабы такіх вытворцаў, як «Вяснянка», «Стужка». Многія прадпрыемствы харчовай прамысловасці таксама выпускаюць запатрабаваную не толькі ў краіне, але і за яе межамі прадукцыю. Сярод іх — вядомая кожнаму з беларусаў «Бабуліна крынка». Гэта кампанія за адны толькі суткі перапрацоўвае амаль 2000 тон малака.

Магілёў з'яўляецца адным з культурных цэнтраў Беларусі. У ім праходзяць канцэрты, Міжнародны хрысціянскі фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа», працуе абласны драматычны тэатр.

Захоўваецца і вывучаецца гістарычная спадчына Магілёва. У 2008 годзе адноўлены будынак гарадской ратушы. У ім зараз працуе музей гісторыі горада.

**1.** Як змагаўся за сваё вызваленне Магілёў у час Вялікай Айчыннай вайны? Выкарыстайце фотаздымак на с. 196.
**2.** Якая прамысловасць існуе ў сучасным Магілёве?
**3.** Назавіце буйны́я прадпрыемствы, што працуюць у горадзе.
**4.** Чым адметны Магілёў у культурным жыцці?

Складзіце расказ пра Магілёў па наступным плане.
1. Першае ўпамінанне пра горад.
2. Адкуль пайшла назва горада Магілёва.
3. Горад у старажытнасці.
4. Гераічныя старонкі і імёны мінуўшчыны.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5. Магілёў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.
6. Сучасны горад. Чым ён слаўны?

Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац) горад Магілёў. Галоўным горадам якой вобласці ён з’яўляецца? У якім напрамку ад сталіцы знаходзіцца Магілёў?

Разгледзьце фотаздымкі на с. 195—198. Зрабіце ўяўнае падарожжа па Магілёве.

У 1914 годзе ў Магілёве быў пабудаваны асабняк, у якім размясцілася два банкі. Адзін з іх аказваў дапамогу сялянам, а другі — памешчыкам.

У пачатку 20 стагоддзя гэта быў не толькі самы прыгожы будынак, але і самы камфортны. Знешне ён выглядаў як шыкоўны палац. Унутры працавала паравое ацяпленне, электраасвятленне, тэлефон.

Пасля рэвалюцыі 1917 года банкаў у будынку больш не было. Тут пачаў працаваць музей, у памяшканні з бранiраванымі дзвярамі захоўваліся каштоўнасці агульнадзяржаўнай важнасці.



Магілёўскі абласны мастацкі музей імя Паўла Масленікава

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны, пры эвакуацыі, яны зніклі. Сярод іх — Крыж Ефрасінні Полацкай, залаты і срэбны ключы ад горада Магілёва, а таксама шмат іншых каштоўнасцей. На жаль, яны страчаны незваротна.

З 1991 года ў будынку размяшчаецца абласны мастацкі музей Магілёва. Жыхары і госці горада маюць магчымасць пазнаёміцца са старадаўнімі абразáмі, а таксама з творамі беларускіх мастакоў — Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, Паўла Масленікава і многіх іншых.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАЎТАРЭННЕ І АБАГУЛЬНЕННЕ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ ЗА 10 КЛАС

## 67. Багацце нашай краіны

Працавіты і мужны беларускі народ любіць сваю краіну, ганарыцца ёю і рупіцца пра яе дабрабыт. Колькі ведаў, намаганняў прыклалі людзі пасля ваеннага ліхалецця, каб аднавіць прамысловыя прадпрыемствы, пабудаваць новыя жылыя дамы і вырасціць хлеб!

Галоўным кірункам развіцця прамысловасці стала машынабудаванне. У нашай краіне выпускаецца самая разнастайная тэхніка. Гэта грузавыя аўтамабілі, станкі, прыборы, трактары, тэхніка для сельскай гаспадаркі. На дарогах можна ўбачыць шматтонныя грузавікі — прадукцыю беларускіх заводаў. Магутныя самазвалы аўтамабільнага завода ў Жодзіне — БелАЗы — працуюць у кар'ерах па здабычы карысных выкапняў далёка за межамі рэспублікі. А беларускія МАЗы перавозяць грузы па шматлікіх дарогах свету.

У многіх краінах вядомы трактар «Беларус», які выпускае Мінскі трактарны завод. Ён універсальны, бо здольны выконваць розныя віды работ: араць, баранаваць, сеяць, збіраць ураджай. А спатрэбіцца — перавязе ў сваім прычэпе любы груз. Выпускаецца і міні-трактар. Ён дапамагае вяскоўцам апрацоўваць зямлю і перавозіць невялікія грузы. Добра ведаюць у свеце і гомельскія камбайны, якія збіраюць з палёў ураджай.

Падтрымліваць сучасны ўзровень прамысловасці, сельскай гаспадаркі і жыцця насельніцтва дапамагаюць беларускія вучоныя. У краіне створаны ўсе ўмовы для таго, каб кожны беларус мог атрымаць сучасную адукацыю, займацца грамадскай дзейнасцю, весці здаровы лад жыцця.

Наша краіна актыўна ўдзельнічае ў асваенні касмічнай прасторы, а таксама ў развіцці атамнай энергетыкі.

Зараз у краіне будуецца першая беларуская атамная электрастанцыя (АЭС). Будучая АЭС размесціцца ў горадзе Астравец Гродзенскай вобласці. Яе праца значна палепшыць эканоміку Беларусі.

А колькі розных айчынных тавараў вакол нас — на працы, дома, у школе! Гэта тэлевізары, халадзільнікі, гадзіннікі, вылічальная і элект-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ронная тэхніка. Шмат тавараў вырабляецца з натуральнай драўніны: мэбля, будаўнічыя матэрыялы, папера і іншае.

Гаспадарка нашай краіны не можа існаваць без транспарту. Па чыгунцы, шашэйных дарогах, рэках, трубаправодах і паветры дастаўляецца сыравіна для прадпрыемстваў, перавозяцца выробленыя з яе тавары і прадукты. Людзі ездзяць цягнікамі, машынамі, тралейбусамі і аўтобусамі, лятаюць па ўсім свеце самалётамі. Многія з вас карыстаюцца веласіпедамі, дарослыя — матацыкламі. Іх выпускаюць у Мінску на Мінскім мотавелазаводзе. А метро дапамагае мінчанам скараціць час на дарогу ва ўсе канцы горада.

У рэспубліцы маюцца запасы карысных выкапняў: бурага вугалю, торфу, калійнай солі. Залежы торфу знаходзяцца ў многіх раёнах Беларусі, але больш за ўсё — на Палессі. Усе багацці нетраў зямлі здабываюцца і перапрацоўваюцца на карысць чалавека.

Беларусь славіцца сваімі льнянымі, ваўнянымі тканінамі, абуткам. Карыстаюцца вялікім попытам хімічныя валокны, мінеральныя ўгнаенні, пластмасы, будаўнічыя матэрыялы.

Сельская гаспадарка забяспечвае насельніцтва разнастайнымі прадуктамі харчавання. З чаго пякуць смачны духмяны хлеб? Вядома, з жыта. Яно — галоўная збожжавая культура ў краіне. Вялізныя плошчы пасеву займае таксама пшаніца, з якой вырабляюць муку для булак і пячэння. Кожны год працаўнікамі сяла назапашваецца неабходная колькасць збожжа і для насельніцтва краіны, і на продаж за мяжу.

Развіваецца ў краіне льнаводства. Блакітныя хвалі квітнеючага лёну не толькі прыгожа выглядаюць. Лён выкарыстоўваецца для вытворчасці высакаякасных тканін, праз гэта яго называюць паўночным шоўкам. З валокнаў лёну вырабляюць ніткі, тканіны, абрусы, ручнікі, пасцельную бялізну і шмат чаго іншага. З семя лёну выціскаюць алей.

Жыхары краіны разводзяць кароў, свіней, авечак, свойскіх птушак. На корм жывёле вырошчваюць канюшыну, кукурузу, буракі. Сучасныя сельскагаспадарчыя комплексы вырабляюць неабходныя прадукты харчавання, якія вылучаюцца высокай якасцю. Яны карыстаюцца попытам у беларусаў і ў жыхароў іншых краін.

Значнае месца на нашых палях займае бульба. Яе нездарма завуць другім хлебам. З бульбы гатуюць мноства страў. Хто з вас не любіць,



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

напрыклад, дранікі, чыпсы, крэкеры? Бульба таксама з'яўляецца добрым кормам для жывёлы і сыравінай для іншых прадуктаў. Нацыянальныя беларускія стравы палюбіліся шматлікім гасцям нашай краіны.

Самае ж галоўнае багацце Беларусі — гэта яе народ, працавіты, мужны, добразычлівы.

## 68. Наш край (гісторыя Беларусі на аснове краязнаўчага матэрыялу)

**1.** Прасачыце па плане гісторыю свайго населенага пункта (горада, вёскі).

1) Родны край — неад'емная частка нашай Радзімы.
2) Тэрыторыя вашай вобласці, раёна на карце.
3) Назва вашага населенага пункта.
4) Звесткі пра старажытны час:
   - першае ўпамінанне (дата ўзнікнення);
   - паходжанне назвы;
   - герб.
5) Насельніцтва і яго асноўныя заняткі ў мінулым.
6) Змены, якія адбываліся ў родным краі на працягу яго гісторыі.
7) Гераічныя старонкі з гісторыі роднага краю.
8) Знакамітыя землякі.
9) Помнікі гісторыі і культуры на тэрыторыі вашага краю.
10) Стан гаспадаркі ў сучасны перыяд.
11) Перспектывы развіцця.
12) Роля кожнага грамадзяніна ва ўзбагачэнні і паляпшэнні жыцця роднага краю.

**2.** Раскажыце паводле плана пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны ў вашай мясцовасці. Выкарыстайце краязнаўчы матэрыял.

1) Пачатак вайны ў вашай мясцовасці.
2) Баі з акупантамі.
3) Партызанскі рух.
4) Падпольнае супраціўленне.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

5) Стаўленне акупантаў да насельніцтва.

6) Вызваленне вашай мясцовасці.

7) Імёны землякоў-герояў.

Наведайце музей або выставу, прысвечаную падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Апішыце адну з падзей.

**3.** Пацікаўцеся гісторыяй сваёй сям'і і звесткамі пра сваіх родных. Падрыхтуйце паведамленне ў 2 частках.

1. Ці быў хтосьці з вашых родных удзельнікам падзей Вялікай Айчыннай вайны? Раскажыце пра гэта.

2. Чым займаюцца члены вашай сям'і зараз? Як складваецца лёс вашай сям'і?

## 69. Паўтарэнне і абагульненне за 10 клас

Адкажыце на наступныя пытанні. Пры адказе выкарыстоўвайце тэкст адпаведных параграфаў, ілюстрацыйны матэрыял. Калі патрэбна, звярніцеся да слоўніка ў канцы вучэбнага дапаможніка.

**1.** Якія страты панесла прамысловасць Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны? Пры адказе выкарыстайце табліцу 1 на с. 12.

**2.** У якім становішчы апынулася сельская гаспадарка пасля вайны? Пры адказе выкарыстайце табліцу 1 на с. 12.

**3.** Якія страты панесла насельніцтва Беларусі ў час вайны? Пры адказе выкарыстайце табліцу 1 на с. 12.

**4.** Якія дзяржавы ўнеслі галоўны ўклад у агульную перамогу над фашысцкай Германіяй? Пры адказе выкарыстайце тэкст параграфа 2. Уключыце ў свой адказ словы: *дзяржавы-саюзнікі*, *Вялікая тройка*.

**5.** Якая міжнародная арганізацыя спрыяла выхаду Беларусі на міжнародную арэну? Выберыце правільны адказ:

а) Арганізацыя Аб'яднаных Нацый;

б) ЮНЕСКА;

в) Савет Бяспекі ААН.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**6.** Растлумачце скарачэнне *ААН*. Як вы разумееце словы «Арганізацыя Аб’яднаных Нацый»?

**7.** У якім стане знаходзілася пасля вайны школьная адукацыя? Пры адказе выкарыстайце словы і словазлучэнні: *знішчаны, разбураны, школьныя будынкі, школьнае абсталяванне, недахоп настаўнікаў*.

**8.** Як аднаўлялася разбураная пасля вайны гаспадарка? Пры адказе выкарыстайце схемы на с. 36, 39.

**9.** Які быў узровень жыцця насельніцтва БССР у першыя пасляваенныя гады? Выкарыстайце пры адказе наступныя словы: *картачная сістэма, аблігацыі, працадні*.

**10.** Як вы разумееце выраз «працоўны подзвіг»? Чаму працу людзей па аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі можна параўнаць з подзвігам?

**11.** Чаму ўдалося хутка аднавіць прамысловасць БССР у пасляваенныя гады? Пры адказе выкарыстайце схему на с. 36.

**12.** Назавіце новыя гарады, якія з’явіліся на карце нашай Радзімы пасля Вялікай Айчыннай вайны. Раскажыце пра іх асаблівасці.

**13.** Якія буйны́я прадпрыемствы ўзніклі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў? Выкарыстайце картасхему на с. 67 і табліцу 2 на с. 68—69.

**14.** Якія гаспадарчыя сувязі існавалі паміж БССР і саюзнымі рэспублікамі? Дапоўніце сказы.

*БССР атрымлівала з іншых рэспублік ... .*

*БССР пастаўляла ў саюзныя рэспублікі ... .*

**15.** Якія ўстановы пачалі рыхтаваць рабочых розных спецыяльнасцей? Выберыце правільны адказ:

а) вышэйшыя навучальныя ўстановы;

б) прафесійныя тэхнічныя вучылішчы;

в) сярэднія школы.

**16.** Якой установе належала вядучая роля ў развіцці навукі? Дапоўніце сказ.

*Вядучая роля ў развіцці навукі належала ... .*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**17.** Назавіце імёны беларускіх касманаўтаў.

**18.** Раскажыце, хто з беларускіх пісьменнікаў асвятляў падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

**19.** Што азначаюць словы «рэформа» і «эканоміка»? Праверце сябе па слоўніку. Для чаго праводзяць рэформу эканомікі?

**20.** Як вы разумееце словы «ўсеагульная сярэдняя адукацыя»?

**21.** Якія наступствы мела аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі?

**22.** Як вы разумееце словы «рыначная эканоміка»? Праверце сябе па слоўніку.

**23.** У выніку чаго наша краіна стала незалежнай дзяржавай? Выберыце правільны адказ:

а) перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне;

б) прыняцця Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце БССР».

**24.** Назавіце адміністрацыйныя адзінкі, на якія падзяляецца Рэспубліка Беларусь. Пакажыце іх на палітыка-адміністрацыйнай карце Рэспублікі Беларусь (гл. форзац). Якія гарады ў іх галоўныя?

**25.** Што з’яўляецца асноўным законам Рэспублікі Беларусь?

**26.** Якія краіны ўвайшлі ў склад Садружнасці Незалежных Дзяржаў?

**27.** Назавіце Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**28.** Каму належыць улада ў Рэспубліцы Беларусь?

**29.** Які выгляд маюць Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг краіны?

**30.** Калі і чаму Рэспубліка Беларусь адмовілася ад ядзернай зброі?

**31.** Калі быў утвораны Саюз Беларусі і Расіі? Праверце па табліцы «Асноўныя даты гісторыі Беларусі» ў канцы вучэбнага дапаможніка.

**32.** Якія меры сёння прымаюцца ўладамі Рэспублікі Беларусь для паляпшэння ўмоў жыцця народа?

**33.** Якія змены адбыліся ў развіцці беларускай мовы?

**34.** Што вы ведаеце пра нацыянальна-культурнае развіццё Беларусі?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Слоўнік тэрмінаў і паняццяў

**Аблiга́цыя** — пазыковая каштоўная папера, якая дазваляе праз пэўны перыяд часу атрымаць яе вартасць грашыма.

**Аграпрамысло́вы ко́мплекс (АПК)** — група прадпрыемстваў, якія займаюцца вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі і яе перапрацоўкай.

**Апазі́цыя** — група людзей (палітычных дзеячаў), якія супрацьстаяць уладзе.

**Арганіза́цыя Аб'ядна́ных На́цый (АА́Н)** — міжнародная арганізацыя, створаная для ўмацавання міру.

**Арэ́нда** — уладанне маёмасцю ці выкарыстанне яе за плату, устаноўленую дагаворам.

**Вы́бары свабо́дныя і дэмакраты́чныя** — магчымасць выбіраць з некалькіх кандыдатаў у дэпутаты аднаго, найбольш вартага.

**Вярхо́ўны Суд Рэспу́блікі Белару́сь** — суд, які ажыццяўляе правасуддзе і нагляд за судовай дзейнасцю агульных судоў.

**Гало́снасць** — адкрытасць у дзейнасці дзяржаўных устаноў і свабода інфармацыі для ўсіх членаў грамадства.

**Гаспада́рчы разлі́к (гасразлі́к)** — спосаб вядзення гаспадаркі, пры якім усе выдаткі на вытворчасць прадукцыі акупляюцца. Прадугледжваў зацікаўленасць працаўнікоў прадпрыемства ў павелічэнні аб'ёму і паляпшэнні якасці прадукцыі.

**Генера́льная Асамбле́я АА́Н** — заснаваны ў 1945 годзе галоўны дарадчы орган Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

**Дзяржа́ва** — саюз грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды, маёмасці.

**Дзяржа́ўная прыёмка** — кантроль дзяржавы за якасцю прадукцыі.

**Дзяржа́ўны бюджэ́т** — размеркаванне даходаў і выдаткаў дзяржавы.

**Дзяржа́ўныя пазы́кі** — атрыманне дзяржавай у доўг грошай.

**Дзяржа́ўныя сі́мвалы** — герб, сцяг і гімн дзяржавы.

**Дыплама́т** — прадстаўнік дзяржавы, які прымае ўдзел у вырашэнні міжнародных спраў ад імя сваёй краіны.

**Дэклара́цыя** — урачыстае абвяшчэнне пэўных намераў дзяржавы.

**Дэмакраты́чныя свабо́ды** — сукупнасць правоў, якія гарантуюцца грамадзянам у дэмакратычнай дзяржаве. Уключаюць свабоду слова, свабоду



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

друку, свабоду сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый, свабоду сумлення і іншае.

**Дэмакра́тыя** — палітычны рэжым, пры якім народ шляхам выбараў фарміруе вышэйшыя органы ўлады.

**Дэпута́т** — асоба, якая выбрана групай грамадзян у органы ўлады.

**Дэфіцы́т** — адсутнасць альбо недастатковая колькасць тавараў ці паслуг.

**Еўрапе́йскі Саю́з (Еўрасаю́з, ЕС)** — эканамічнае і палітычнае аб'яднанне еўрапейскіх дзяржаў.

**Індустрыялізá́цыя** — пераход да буйной машыннай вытворчасці, стварэнне высокапрадукцыйнай тэхнікі.

**Індывідуа́льная дзе́йнасць** — грамадска карысная дзейнасць чалавека па вытворчасці тавараў ці аказанні платных паслуг, не звязаная з дзяржаўнымі прадпрыемствамі ці іншымі ўстановамі.

**Індывідуа́льны прадпрыма́льнік (ІП)** — асоба, якая афіцыйна займаецца індывідуальнай прадпрымальніцкай дзейнасцю — гандлем, аказаннем паслуг і іншым.

**Інтэгра́цыя** — аб'яднанне, збліжэнне і ўсталяванне ўзаемасувязяў.

**Інтэрнацыянalі́ст** — чалавек, які выступае за сяброўства і ўзаемадапамогу паміж нацыямі.

**Інфля́цыя** — абясцэньванне грошай, павелічэнне цэн і зніжэнне рэальнай заработнай платы.

**Кама́ндная экано́міка** — эканамічная сістэма, у якой кіраванне народнай гаспадаркай ажыццяўляецца ўрадам дзяржавы ў адпаведнасці з цэнтралізаваным планаваннем.

**Камуні́зм** — грамадства, у якім усе людзі роўныя і няма прыватнай уласнасці.

**Кандыда́т** — чалавек, які мае намер быць выбраным у кіруючы орган улады, заняць пасаду, атрымаць званне.

**Канкурэнтаздо́льная праду́кцыя** — прадукцыя, якая мае высокую якасць і лепей прадаецца спажыўцам.

**Канстытуцы́йны Суд Рэспу́блікі Белару́сь** — судовы орган, які кантралюе, ці адпавядаюць Канстытуцыі нарматыўныя і прававыя акты, што прымаюцца ў краіне.

**Канстыту́цыя** — асноўны закон дзяржавы.

**Кры́зіс** — цяжкае становішча.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Культ асо́бы** — узвялічванне ролі аднаго чалавека ў гістарычным развіцці краіны.

**Лёгкая прамысло́васць** — галіны прамысловасці, прадпрыемствы якіх перапрацоўваюць розную сыравіну для вырабу тавараў народнага спажывання (адзення, абутку і іншага).

**МАГАТЭ́ (Міжнаро́днае аге́нцтва па а́тамнай эне́ргіі)** — міжнародная арганізацыя, якая мае на мэце развіццё супрацоўніцтва ў галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі.

**Машы́нна-тра́ктарная ста́нцыя (МТС)** — дзяржаўнае прадпрыемства ў СССР, якое забяспечвала тэхнікай калгасы і саўгасы.

**Меліяра́цыя** — мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне якасці зямель. У Беларусі прадугледжвала асушэнне забалочаных месцаў.

**Міжнаро́дная канферэ́нцыя** — сход афіцыйных прадстаўнікоў некалькіх дзяржаў. На ёй абмяркоўваюцца важныя пытанні жыцця краін, што ўдзельнічаюць у сходзе.

**Нацыяна́льнае бага́цце** — матэрыяльныя даброты, якімі валодае краіна. Звычайна вымяраецца колькасцю грошай у дзяржаве.

**Нацыяна́льна-культу́рнае адраджэ́нне** — імкненне людзей да адраджэння мовы і культуры свайго народа.

**Незале́жная дзяржа́ва** — дзяржава, якая валодае самастойнасцю ва ўнутраных і знешніх справах.

**Нейтра́льная дзяржа́ва** — краіна, якая не ўмешваецца ў справы іншых дзяржаў свету і іх узброеныя канфлікты (войны). Спрэчныя пытанні з іншымі краінамі яна вырашае толькі мірнымі сродкамі (шляхам перагавораў).

**Парла́мент** — вышэйшы заканадаўчы орган улады ў дэмакратычных дзяржавах.

**Пасо́льства** — прадстаўніцтва замежнай краіны на тэрыторыі іншай дзяржавы для ажыццяўлення ўзаемных сувязяў.

**Перабудо́ва** — назва перыяду ў гісторыі СССР і БССР з 1986 года, звязанага з маштабнымі пераўтварэннямі ў сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным жыцці.

**Правава́я дзяржа́ва** — дзяржава, у якой дзейнасць усіх органаў улады, жыццё грамадства вызначаюцца Канстытуцыяй, законамі, дзяржаўнымі дакументамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Прамысло́васць** — найважнейшая галіна народнай гаспадаркі, прадпрыемствы якой вырабляюць станкі, машыны, адзенне, абутак і іншае.

**Працадзе́нь** — форма ўліку выкананай калгаснікамі працы. За кожны працадзень у канцы года плацілі заробак збожжам, гароднінай і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі.

**Прыватыза́цыя** — перадача ці продаж у прыватную ўласнасць часткі дзяржаўнай маёмасці.

**Пяціго́дка** — пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі.

**Ры́начная экано́міка** — гаспадаранне, пры якім змяншаецца ўплыў дзяржавы на справы прадпрыемстваў, павялічваецца асабістая зацікаўленасць працоўных у выніках сваёй дзейнасці.

**Рэканстру́кцыя** — карэнная перабудова прадпрыемства, будынка, памяшкання і іншага.

**Рэпрэ́сіі** — карныя меры, якія ўжываюцца ўладай.

**Рэферэ́ндум** — усенароднае галасаванне па найбольш значных пытаннях жыцця дзяржавы і грамадства.

**Рэфо́рма** — мерапрыемствы, накіраваныя на станоўчыя змены ў дзяржаве.

**Саве́т Бяспе́кі АА́Н** — орган ААН, які дзейнічае паміж сесіямі Генеральнай Асамблеі. На яго ўскладзена галоўная адказнасць за падтрыманне міжнароднага міру і бяспекі.

**Саве́ты наро́дных дэпута́таў** — органы савецкай улады.

**Самафінансава́нне** — незалежнае існаванне прадпрыемства за кошт самастойнага кіравання сваімі грашовымі сродкамі.

**Сацыялі́зм** — грамадскі лад, пры якім у найбольшай ступені абараняюцца правы працоўных людзей.

**Сацыя́льная дзяржа́ва** — дзяржава, якая клапоціцца пра дабрабыт сваіх грамадзян.

**Свабо́да сло́ва** — права публічна выказваць сваё меркаванне.

**Се́сія Генера́льнай Асамбле́і АА́Н** — сход прадстаўнікоў краін — удзельніц ААН, на якім вырашаюцца найбольш важныя пытанні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Спад вытво́рчасці** — змяншэнне аб'ёму выпуску прадукцыі і паслуг, што аказваюцца насельніцтву.

**Старшыня́ Прэзі́дыума Вярхо́ўнага Саве́та СССР** — вышэйшая дзяржаўная пасада ў Савецкім Саюзе. З 1977 года яе займаў кіраўнік Камуністычнай партыі.

**Старэ́нне насе́льніцтва** — павелічэнне колькасці пажылых непрацаздольных людзей у складзе насельніцтва.

**Суверэнітэ́т** — самастойнае, незалежнае ажыццяўленне дзяржавай сваёй знешняй і ўнутранай палітыкі.

**Фе́рмерская гаспада́рка** — прыватнае прадпрыемства, якое займаецца вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі.

**«Хало́дная вайна́»** — супрацьстаянне без непасрэдных ваенных дзеянняў паміж ЗША і СССР і іх саюзнікамі ў 1946—1980-я гады.

**Харчо́вая прагра́ма** — праграма 1982 года, якая прадугледжвала забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання.

**Цаліна́** — урадлівыя, але неапрацаваныя землі.

**Ця́жкая прамысло́васць** — галіны прамысловасці, прадпрыемствы якіх заняты вытворчасцю станкоў, машын, абсталявання, металаапрацоўкай, электраэнергетыкай і іншым.

**Шматпарты́йнасць** — існаванне розных грамадскіх і палітычных партый, аб'яднанняў, саюзаў.

**Экано́міка** — усе галіны народнай гаспадаркі (прамысловасць, сельская гаспадарка, транспарт, гандаль і іншыя), якія забяспечваюць насельніцтва неабходнымі таварамі і паслугамі.

**ЮНЕ́СКА (Арганіза́цыя Аб'ядна́ных На́цый па пыта́ннях адука́цыі, наву́кі і культу́ры)** — установа Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая садзейнічае развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў галінах адукацыі, навукі і культуры.

**Я́дзерны рэа́ктар** — найбольш небяспечнае месца на атамнай электрастанцыі, дзе выпрацоўваецца атамная энергія.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# АСНОЎНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАТЫ

| | |
|---|---|
| **26 чэрвеня 1945 года** | Падпісанне БССР Статута ААН. Уваходжанне БССР у склад ААН |
| **1947 год** | Выпуск першых грузавых аўтамабіляў МАЗ-205 на Мінскім аўтамабільным заводзе |
| **1950 год** | Пачатак серыйнага выпуску трактароў на Мінскім трактарным заводзе |
| **1958 год** | Выпуск першых самазвалаў на Беларускім аўтамабільным заводзе ў Жодзіне |
| **1960 год** | Выпуск першай беларускай ЭВМ на Мінскім заводзе электронных вылічальных машын |
| **1963 год** | Заснаванне Салігорскага калійнага камбіната |
| **1969 год** | Адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Хатынь» |
| **1971 год** | Адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» |
| **1974 год** | Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Мінску ганаровага звання «Горад-герой». Узнагароджанне сталіцы ордэнам Леніна і медалём «Залатая Зорка» |
| **1982 год** | Прыняцце Харчовай праграмы |
| **1984 год** | Увод у эксплуатацыю першай лініі Мінскага метрапалітэна |
| **1986—1991 год** | Правядзенне ў СССР палітыкі перабудовы |
| **27 ліпеня 1990 года** | Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі |
| **19 верасня 1991 года** | Змена назвы «БССР» на назву «Рэспубліка Беларусь» |
| **8 снежня 1991 года** | Падпісанне ў Віскулях (Белавежская пушча) дагавора аб спыненні існавання СССР. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| **15 сакавіка 1994 года** | Прыняцце Канстытуцыі (асноўнага закону) Рэспублікі Беларусь, абвяшчэнне дзяржавы прэзідэнцкай рэспублікай |
| **10 ліпеня 1994 года** | Выбранне першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі |
| **14 мая 1995 года** | Правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму. Зацвярджэнне дзяржаўнай сімволікі. Наданне рускай мове статусу дзяржаўнай разам з беларускай |
| **2 красавіка 1996 года** | Падпісанне Дагавора аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі |
| **24 лістапада 1996 года** | Правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму. Унясенне дапаўненняў і змяненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Абвяшчэнне Дня Незалежнасці (Дня Рэспублікі) **3 ліпеня** |
| **2 красавіка 1997 года** | Падпісанне Дагавора аб Саюзе Беларусі і Расіі |
| **8 снежня 1999 года** | Падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі |
| **2 ліпеня 2013 года** | Адкрыццё Плошчы Дзяржаўнага сцяга ў Мінску |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# Змест

**Прадмова** ........ 3
Паўтарэнне вучэбнага матэрыялу за 9 клас ........ 4
**Беларусь у пасляваенныя гады (1945—1953)** ........ 9
1. Страты Беларусі ў Вялікай Айчыннай вайне ........ 9
2. Дзяржавы — пераможцы ў Другой сусветнай вайне ........ 12
3. Стварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). БССР — член ААН ........ 16
4. Дзейнасць БССР на міжнароднай арэне ў пасляваенныя гады ........ 20
5. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у пасляваенны час (1945—1953) ........ 25
6. Культурнае жыццё беларускага народа (1945—1953) ........ 29
7. Аднаўленне разбуранай вайной прамысловасці ........ 32
8. Аднаўленне разбуранай вайной сельскай гаспадаркі ........ 36
9. Матэрыяльнае становішча насельніцтва ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ........ 41
10. Працоўны подзвіг беларускага народа. Уклад народаў СССР у аднаўленне БССР у пасляваенны перыяд ........ 43
11. Вынікі развіцця БССР у пасляваенны перыяд (1945—1953) ........ 47
12. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «Беларусь у пасляваенныя гады (1945—1953)» (параграфы 1—11) ........ 50
**БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў** ........ 53
13. Грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў ........ 53
14. Развіццё сельскай гаспадаркі БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў ........ 56
15. Развіццё прамысловасці БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў ........ 59
16. З'яўленне на карце Беларусі новых гарадоў ........ 61
17. Буйны́я прадпрыемствы ў Беларусі сярэдзіны 1950-х — першай паловы 1960-х гадоў ........ 65
18. Сувязі БССР з іншымі рэспублікамі СССР ........ 70
19. Пераўтварэнні ў галіне народнай адукацыі ........ 72
20. Развіццё навукі ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў 74
21. Развіццё культуры ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў ........ 77
22. Паўсядзённае жыццё беларускага народа ў сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў ........ 80



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

23. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «БССР у сярэдзіне 1950-х — першай палове 1960-х гадоў» (параграфы 13—22) ........ 83
**БССР у другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў** ........ 86
24. Кіраўнікі рэспублікі ў другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў ........ 86
25. Развіццё прамысловасці ў другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў ........ 88
26. Змены ў развіцці сельскай гаспадаркі ў другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў ........ 92
27. Дасягненні і недахопы ў развіцці народнай гаспадаркі рэспублікі ў другой палове 1960-х — пачатку 1980-х гадоў ........ 95
28. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гадоў ........ 98
29. Развіццё народнай адукацыі (1965—1985) ........ 101
30. Літаратура і мастацтва (1965—1985) ........ 104
31. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «БССР у другой палове 1960-х — сярэдзіне 1980-х гадоў» (параграфы 24—30) ........ 108
**Асаблівасці развіцця БССР у другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў** 110
32. Чарнобыльская трагедыя ........ 110
33. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў другой палове 1980-х — 1990-х гадах ........ 114
34—35. Нарастанне цяжкасцяў у эканоміцы (1986—1991). Пошукі шляхоў пераходу Беларусі да рыначных адносін ........ 116
36. Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу па тэме «Эканамічнае становішча Беларусі ў другой палове 1980-х — пачатку 1990-х гадоў» (параграфы 32—35) ........ 121
**Незалежная Рэспубліка Беларусь** ........ 123
37. Абвяшчэнне незалежнасці і ўтварэнне Рэспублікі Беларусь ........ 123
38. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел Рэспублікі Беларусь. Палітыка-адміністрацыйная карта краіны ........ 126
39. Утварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) ........ 128
40. Стварэнне органаў дзяржаўнага кіравання і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь ........ 130
41. Канстытуцыя — асноўны закон Рэспублікі Беларусь ........ 132
42. Абранне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ........ 133



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

43. Рэферэндум 24 лістапада 1996 года ........ 135
44. Улада ў Рэспубліцы Беларусь ........ 136
45. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь ........ 138
46. Эканамічныя пераўтварэнні ў Рэспубліцы Беларусь ........ 143
47. Саюз Беларусі і Расіі. Стварэнне Саюзнай дзяржавы ........ 144
48. Міжнародная дзейнасць Рэспублікі Беларусь.
Міжнародныя сувязі на сучасным этапе ........ 147
49. Перабудова гандлёва-эканамічных і навуковых сувязяў
Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе ........ 150
50. Паўсядзённае жыццё беларускага народа ў 1990-х —
пачатку 2000-х гадоў ........ 152
51. Родная мова ........ 154
52—53. Нацыянальна-культурнае развіццё суверэннай Беларусі ... 156
54. Паўтарэнне і абагульненне па тэме «Незалежная Рэспубліка
Беларусь» (параграфы 37—53) ........ 163
**Сталіца і абласныя гарады Беларусі** ........ 165
55. Мінск — сталіца нашай дзяржавы.
Гістарычнае мінулае Мінска ........ 165
56. Мінск — галоўны гаспадарчы, палітычны і культурны цэнтр
краіны ........ 168
57. Брэст. Гістарычнае мінулае ........ 172
58. Сучасны Брэст ........ 175
59. Віцебск у далёкім мінулым ........ 177
60. Сучасны Віцебск ........ 179
61. Гомель у далёкім мінулым ........ 182
62. Сучасны Гомель ........ 185
63. Гродна ў далёкім мінулым ........ 188
64. Сучаснае Гродна ........ 190
65. Магілёў. Гісторыя мінуўшчыны ........ 194
66. Сучасны Магілёў ........ 196
**Паўтарэнне і абагульненне вучэбнага матэрыялу за 10 клас** ........ 199
67. Багацце нашай краіны ........ 199
68. Наш край (гісторыя Беларусі на аснове
краязнаўчага матэрыялу) ........ 201
69. Паўтарэнне і абагульненне за 10 клас ........ 202
**Слоўнік тэрмінаў і паняццяў** ........ 205
**Асноўныя гістарычныя даты** ........ 210



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча навучэнца | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака навучэнцу за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Малчанава, Г. У.**

М20 Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. для 10-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / Г. У. Малчанава, П. М. Гламбоцкі ; пад рэд. В. А. Фядосіка. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2016. — 214 с. : іл.

ISBN 978-985-553-332-1.

**УДК 94(476)(075.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я72**

Вучэбнае выданне

**Малчанава** Галіна Уладзіміраўна
**Гламбоцкі** Пётр Міхайлавіч

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**

Вучэбны дапаможнік для 10 класа першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

Рэдактары *І. В. Летуновіч, Н. Г. Шчарбакова*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка *Н. Я. Бацюковай*
Карэктары *Т. М. Булатава, Н. Б. Кучмель, А. М. Шапялевіч*

Падпісана ў друк 12.04.2016. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 15,79+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 13,60+0,40 форз. Тыраж 718 экз. Заказ 91.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## ПАЛІТЫКА-АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ КАРТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

